Людзьмі звацца! —
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 20 ліпеня 1990 г. № 29 (3543) ● Цана 10 кап.

Помнік Скарыне:

ВАНДРОЎКА З ПРАСПЕКТА Ў ВЕРХНІ ГОРАД

Закончыўся чарговы тур рэспубліканскага конкурсу на помнік Скарыне ў Мінску. У адрозненне ад папярэдніх этапаў тут не ставілася задача выяўлення лепшага пластычнага вырашэння. На думку журы конкурсу прывязка скульптуры да пляцоўкі перад каланадай Акадэміі навук аказалася для мастакоў і архітэктараў вельмі цяжкай, лічы—невырашальнай задачай.

Цяжка — не значыць немагчыма. У гісторыі мастацтва нямала выпадкаў, калі шэдэўры манументальнай пластыкі нараджаліся менавіта ў выніку творчага асэнсавання нестандартных горадабудаўнічых сітуацый. Але замест таго, каб накіраваць творчы імпэт удзельнікаў конкурсу ў гэтым кірунку, журы прапанавала ім, так бы мовіць, «аблегчаны варыянт»—пашукаць у горадзе іншае месца, такое, каб не было праблем з прывязкай. Такім чынам, калі на пачатку конкурсу актыўна праводзілася дырэктыва на пабудову хоць якога-небудзь помніка—абы ў запланаваны тэрмін, дык зараз ідзе гаворка пра помнік які-небудзь і дзе-небудзь. Бо прывязка да пляцоўкі перад акадэміяй пераконвае ў тым, што сёлета помнік зроблены не бу-

(Працяг на стар. 2).

Няма сонца і... білетаў

18 ліпеня ў Віцебску пачаўся
II Усесаюзны фестываль польскай песні

Прэс-цэнтр фестывалю, які сёлета працуе на трох мовах — беларускай, польскай і рускай, — напярэдадні першага канцэрта выдаў з кампʼютэраў пакет інфармацыі. Яна дазваляе сцвярджаць, што ў параўнанні з першым фестывалем адбыліся даволі істотныя змены.

Зменшылася колькасць афіцыйных гасцей. А гэта азначае, што фестываль, напэўна, пройдзе ў больш дзелавой, творчай атмасферы. Менш прыехала і прадстаўнікоў польскай прэсы. Ды гэта зусім не сведчыць, што свята польскай песні ў Беларусі страціла значэнне для прапаганды песеннага мастацтва палякаў. Наадварот: склад польскай дэлегацыі вельмі прадстаўнічы. Сярод выканаўцаў — такія «зоркі», як Аліцыя Маеўска, Іяланта Яшкоўска, Лола Шафран, Станіслаў Сойка, Уладзімеж Корч, групы «Комбі», «ТСА», «Уок эвэй». Савецкая эстрада прадстаўлена Ігарам Тальковым, Сяргеем Крыловым, Жэнем Белавусавым, групамі «Міраж», «Сталкер», «На-на», «Любэ» і іншымі; Беларусь — «Песнярамі», «Сябрамі», дуэтам Я. Паплаўская — Я. Ціхановіч, маладымі салістамі. Сярод гасцей — славутая спявачка Гінтарэ Яўтакайтэ (ЗША).

Канкурсанты — а менавіта ім аддадзена сёлета найбольш увагі — прыехалі ў Віцебск з многіх гарадоў краіны. Значную групу складаюць беларускія спевакі і калектывы. Гэта Вольга Замошчанка і Яўгенія Рыжаўская з Магілёва, Алена Лукашэнка з Пінска, Вікторыя Наскова з Віцебска, Аляксандр Перцаў з Мінска, групы «Ісціна» (Гродна) і «Джазко» (Мінск). Усяго ў конкурсе ўдзельнічаюць 24 салісты і 14 груп. Сярод іх — Галіна Герман з Малдавіі. Можа, прозвішча славутай польскай спявачкі дапаможа ёй перамагчы?

Праграма фестывалю прадугледжвае дзесяць канцэртаў, у тым ліку дабрачынны ў фонд «Дзеці Чарнобыля». Пройдуць канцэрты маладых выканаўцаў, членаў журы, на чале якога Ігар Лучанок, «зорак» польскай і беларускай эстрады. У рамках фестывалю адбываюцца выстаўкі польскіх мастакоў, кнігі, у тым ліку і самвыдата, фестываль польскага фільма, а таксама навуковая канферэнцыя «Руска-беларуска-польскае параўнальнае мовазнаўства і літаратуразнаўства».

Як сказаў мастацкі кіраўнік фестывалю Міхаіл Фінберг, сёлетні склад канкурсантаў роўны і больш высокі ў параўнанні з першым фестывалем. Менавіта таму загадзя цяжка вызначыць фаварытаў. Хто пераможа — пра гэта вы даведаецеся з фестывальных рэпартажаў і тэлетрансляцый.

А цяпер, у гэтыя дні найбольш папулярная ў Віцебску песня — «Пусть всегда будет солнце». Сёння сонца так і не здолела прабіцца праз нізкія хмары, што нясуць дождж. Між тым білетаў на адкрыццё і закрыццё фестывалю ў продажы даўно няма...

Дзмітрый ПАДБЯРЭЗСКІ.
Віцебск, па тэлефоне.

УНУМАРЫ:

НОВЫЯ «КАНЦЭПЦЫІ», СТАРАЯ ПАЛІТЫКА
Чарнобыль: зямля і людзі
2—3

«РАЗАРВАЦЬ ЗАГАННАЕ КОЛА»
Госць дэпутацкага клуба «ЛіМа» — Я. НОВІКАЎ
4

САЮЗ САЮЗАЎ?
Гутарка кінематаграфіста і філосафа
5

НЯБЕСНЫЯ БЕГІ
Апавяданне М. ВАЙЦЯШОНАК
8—9

КАЛІ ВЕЦЕР СЦЯГ РАЗГОРНЕ...
Думка чытача
13, 15

«МНОЖЕСТВО НАРОДУ... ПОГУБИ...»
Позірк у мінулае
14—15

Чарнобыль: зямля і людзі

НОВЫЯ «КАНЦЭПЦЫІ», СТАРАЯ ПАЛІТЫКА

Сумна вядомая канцэпцыя «35 бэр» акадэміка Л. Ільіна ўжо даўно адвергнута большасцю беларускіх і украінскіх вучоных. На сесіі Кіеўскага гарадскога Савета Л. Ільін быў нават аб'яўлены... «персонай нонграта». А ў Маскве, падобна на тое, спрабуюць праводзіць старую лінію: прыборы насельніцтву не даваць, бо хто ведае — што можа атрымацца, калі людзі будуць ведаць сапраўдную інфармацыю!

Нядаўні прыезд на Беларусь Генеральнага дырэктара МАГАТЭ Ханса Блікса і яго выступленне на сесіі Вярхоўнага Савета БССР толькі прыбавілі сумненняў. Няўжо ў Маскве хутка з'явіцца новая «канцэпцыя»! Калі ж скончацца «дэбаты» вакол Чарнобыля? Чаму людзі не могуць набыць дакладныя, дасканалыя дазіметры?

На пытанні няштатнага карэспандэнта «ЛіМа» адказваюць член-карэспандэнт АН БССР, дырэктар навукова-тэхнічнага цэнтра «Радыяметр» Васіль Барысавіч НЕСЦЯРЭНКА і кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры ядзернай фізікі і электронікі БДУ імя У. І. Леніна Аляксандр Міхайлавіч ЛЮЦКО.

В. НЕСЦЯРЭНКА: — Я лічу, што палітыка цэнтра паранейшаму застаецца такой: як мага менш інфармацыі даць насельніцтву. У гэтым і сутнасць новай «канцэпцыі» маскоўскіх вучоных. У прыватнасці, дырэктар Навукова-даследчага інстытута біяфізікі Міністэрства аховы здароўя СССР Ільін даводзіць, што трэба выпускаць толькі гамадазіметры. Яны ж прасцейшыя ў тэхнічным плане. А калі будзе больш складаны, хоць і больш карысны прыбор, дык насельніцтва, як мяркуюць у інстытуце біяфізікі, не зможа ім карыстацца. Маўляў, «цёмны» ў нас народ.

Скажам, у дазіметры «Сасна», які не раз згадваўся ў друку, 4 дэтэктары. А дырэктар беларускага філіяла фірмы «Изотоп» Мінатамэнергапрома СССР В. Асталчук прапануе зменшыць іх колькасць удвая — дзеля эканоміі! Ды гэта абсурд. Калі так разважаць, дык дзеля эканоміі трэба наогул адмовіцца ад дэтэктараў. Але ж такім, з дазволу сказаць, «дазіметрам» проста нельга будзе карыстацца.

— Аляксандр Міхайлавіч, наколькі мне вядома, часова дапушчальныя ўзроўні забруджанасці прадуктаў радыенуклідамі (ЧДУ-88) у Маскве збіраюцца захаваць да 1993 года. Цікава, якімі крытэрыямі кіруюцца людзі ў маскоўскіх кабінетах, калі прымаюць падобныя рашэнні?

А. ЛЮЦКО: — Крытэрыяў, здаецца, няма ніякіх. ЧДУ, нормы радыяцыйнай бяспекі, 35-бэрная канцэпцыя — усё гэта вызначалася Нацыянальнай камісіяй па радыяцыйнай ахове насельніцтва СССР. У яе ўваходзяць прадстаўнікі 3-га галоўнага ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя СССР — інстытут біяфізікі, клініка прафесара Кучковай, інстытут радыяцыйнай гігіены марскога транспарту ў Ленінградзе і г. д. Усе гэтыя ўстановы — «пристяжные» Мінатамэнергапрома. Яны працуюць разам з 1945 года, пачынаючы з атамных выпрабаванняў у Казахстане і на Новай Зямлі. Уся інфармацыя збіралася ў іх. Кожны выбух «рабіўся» чыёйсьці дысертацыяй. Лічыцца, што толькі ў гэтым ведамстве ёсць вартыя спецыялісты па радыяцыйнай тэматыцы. Старшыня Нацыянальнай камісіі — акадэмік Ільін, яго намеснік — акадэмік Булдакоў.

Такім чынам, мы маем манаполію ведамства. І яны зараз не ўступаюць ні ў якія дыскусіі. Прытаіліся і маўчаць. Але ж ніхто не адмяніў ні ЧДУ-88, ні ўсе астатнія нарматывы! А старшыня Дзяржаграпрома Беларусі лічыў, што ў нас у рэспубліцы з прадуктамі харчавання ўсё ў парадку, бо ўзровень іх забруджання адпавядае ЧДУ. Таму мы і ставім пытанне аб стварэнні незалежнай Нацыянальнай камісіі па радыяцыйнай ахове насельніцтва БССР. Сёння сітуацыя парадаксальная: нават карты радыяцыйнага стану рэспублікі мы возім у Маскву. Там іх зацвярджае старшыня Дзяржгідрамета Ю. Ізраэль, і толькі потым карты вяртаюцца ў рэспубліку, дзе іх можна публікаваць.

— Значыць, нас збіраюцца карміць бруднымі прадуктамі да 1995 года ўключна? А як да такой перспектывы ставіцца наш Вярхоўны Савет?

А. ЛЮЦКО: — Я думаю, сітуацыя ў рэспубліцы ўжо мяняецца. І на плошчы Леніна гэтае пытанне «рашаць» сёння няма неабходнасці. Вярхоўны Савет БССР у цяперашнім складзе ў гэтым пытанні салідарны з народам.

В. НЕСЦЯРЭНКА: — Дзве праблемы трэба вырашаць у першую чаргу. Стварыць Нацыянальную камісію па радыяцыйнай ахове і адкрыць пазаведамасны цэнтр радыяцыйнай бяспекі. Бо зараз Дзяржаграпром і Міністэрства аховы здароўя ніхто, па сутнасці, не кантралюе. З якіх гэта часоў, скажам, медыкі вызначаюць правільнасць норм разліку? Гэта справа фізікаў. Напрыклад, у бета-часцінкі стронцыю прабег вельмі малы. Трэба выбраць для яе індыкацыі адпаведны тып дэтэктара, ведаць, дзе яго размясціць і г. д. А такой методыкі ў нас дагэтуль няма. На вялікі жаль!

— Васіль Барысавіч, у інтэрв'ю газеце «Социалистическая индустрия» за 28 лістапада 1989 г. вядомы вам Д. К. Папоў — навуковы супрацоўнік НДІ радыяцыйнай гігіены, заявіў: «У Маскве і Ленінградзе знешняга абпраменьвання няма наогул, і калі жыхары гэтых гарадоў будуць піць малако і харчавацца мясам з утрыманнем цэзію, якое ўдвая перавышае норму, дык гадавая доза абпраменьвання масквіча будзе ў межах, якія ніяк не змогуць паўплываць на яго самаадчуванне і здароўе». Вось як! Аказваецца, атручваць людзей можна не толькі на Беларусі, але і ў Маскве і Ленінградзе?

В. НЕСЦЯРЭНКА: — Паважаны апанент Папоў нядаўна прыслаў мне пісьмо, у якім спрабуе абвергнуць неабвержныя ісціны. Ён лічыць, што пры разліках дозы ад крыніцы абпраменьвання, актыўнасць якой змяншаецца ў часе, дзейнічае закон не лінейнага, а экспаненцыяльнага назапашвання дозы. Паводле формулы, якую прапануе мой апанент, чалавек за жыццё набірае 1,3—0,3 бэра. Але ж толькі з прадуктамі жыхар Беларусі можа набіраць штогод 0,7—0,8 бэра. І за 70 год пры такім узроўні забруджання ўнутранае абпраменьванне арганізма складзе ў дзесяткі разоў большую лічбу.

А. ЛЮЦКО: — Вядома, што не менш як палова дозы, калі не больш, складаецца за кошт прадуктаў харчавання. Па звестках НДІ радыяцыйнай медыцыны утрыманне радыеактыўнага цэзію ў арганізме жыхароў рэспублікі вельмі высокае. Мала таго, яно прыкладна аднолькавае ў тых, хто жыве на забруджаных тэрыторыях, і ў жыхароў «чыстых» зон — у Віцебскай, Гродзенскай абласцях, у Мінску.

В. НЕСЦЯРЭНКА: — Я думаю, ЧДУ ў рэспубліцы неўзабаве будуць зніжаны як мінімум у 2—5 разоў. Але гэта толькі пачатак. Далей на першы план выйдзе праблема стронцыю. У Нараўлянскім, Брагінскім раёнах галоўную небяспеку людзям нясе ён. (У раёне вёскі Стрэлічава забруджванне стронцыем складае да 3,5 кюры на кіламетр). Неабходна апаратура для кантроля прадуктаў. Скажам, па малаку патрэбна дакладнасць на ўзроўні 10^{-10} кюры на літр.

— Па звестках Інстытута радыяцыйнай медыцыны фактычна ўсё насельніцтва нашай рэспублікі зраўнялася па цэзію. Пра гэта першым напісаў М. Матукоўскі ў «Известиях».

Цяпер некаторыя журналісты папікаюць Матукоўскага за гэтыя, нібыта неправераныя звесткі. Кажуць, што ён, маўляў, не меў права абнародаваць іх у саюзнай газеце...

А. ЛЮЦКО: — Гэтую інфармацыю паведаміў дырэктар інстытута акадэмік Мацюхін на адным з пасяджэнняў. Дарэчы будзе сказаць, ён — член Нацыянальнай камісіі па радыяцыйнай ахове насельніцтва СССР, блізкі сябра акадэміка Ільіна, адзін з сааўтараў вядомага пісьма 92 медыкаў у Маскву. Я думаю, яго паведамленне — аб'ектыўнае ў гэтым выпадку.

В. НЕСЦЯРЭНКА: — Ёсць падставы лічыць, што ўтрыманне цэзію ў арганізме жыхароў Беларусі ледзь не ў 10—20 разоў вышэй, чым да аварыі на ЧАЭС.

— Аляксандр Міхайлавіч, вы асабіста ведаеце вельмі многіх ліквідатараў катастрофы. У іх медыцынскіх картках запісана доза 3—5 бэр. Але ж чаму тады гэтыя людзі паміраюць?

А. ЛЮЦКО: — Так, фактаў, калі маладыя, з выгляду здаровыя хлопцы знянацку паміраюць, шмат. Але ж «знянацку» такога не бывае. Справа ў тым, як лічылі індывідуальную дозу. Вось нядаўна пракурор Брагінскага раёна ўзбудзіў крымінальную справу супраць асоб, якія кіруюць нашай медыцынай. Гэта першы вядомы мне выпадак. Падстава для крымінальнай справы вось якая: у адпаведнасці з загадам Міністэрства аховы здароўя СССР двойчы ў год павінна праводзіцца абследаванне ўсяго насельніцтва. На

«Праўда аб Чарнобылі» — спецыяльны чатырохпалосны ўкладыш пад такім загалоўкам змешчаны ў адным з нумароў уплывовай лонданскай газеты «Сандэй таймс» (тыраж 1 млн. 150 тыс. экз.). У багата ілюстраваным рэпартажы англійскіх журналістаў падрабязна расказваецца аб наступствах чарнобыльскай бяды, аб тых умовах, у якіх існуюць жыхары забруджаных раёнаў Беларусі. У тэксце ёсць спасылкі на выказванні святара Аляксандра Надсана, урача Тамары Белавокай, вучонага Алега Шадыры.

Каштоўнасць падобных публікацый, якія даносяць да замежнага чытача праўду аб маштабах катастрофы, цяжка перабольшыць. Асабліва сёння, калі Беларусь спадзяецца на дапамогу міжнароднай супольнасці.

Помнік Скарыне:

ВАНДРОЎКА З ПРАСПЕКТА Ў ВЕРХНІ ГОРАД

(Пачатак на стар. 1).

дзе. Між тым не сакрэт, што адкрыццё Скарынавага мемарыяла планавалася як галоўная падзея года першадрукара. Той, хто гэта планаваў, лічыў, што ў мастацтве, як у вытворчасці, патрэбных паказчыкаў можна дамагчыся «штурмаўшчынай». І вось мастакам і архітэктарам для выратавання плана прапаноўваецца шлях найменшага супраціўлення.

Якія ж кропкі горада прывабілі ўдзельнікаў конкурсу? Найперш адзначу, што многія не змянілі сваёй думкі, што лепшае месца для помніка—на Ленінскім праспекце, побач з акадэміяй. Аднак, як відаць, з новых праектных прапаноў, размова ўжо ідзе не аб «прывязцы» помніка да існуючага архітэктурнага асяроддзя, але аб ператварэнні пляцоўкі перад каланадай акадэміі ў новы гарадскі пляц — плошчу Францыска Скарыны. У гэтым выпадку помнік разглядаецца як галоўны, але не адзіны элемент эстэтызацыі асяроддзя. На пляцу павінна з'явіцца архітэктура малых форм, дэкаратыўная пластыка. Магчыма, з часам дойдуць рукі і да фасадаў будынкаў на другім баку праспекта. Павінен нарадзіцца мастацка-культурны ансамбль не менш важны ў структуры горада, чым плошча Коласа ці Купалўскі сквер. Гэта вялікая праца для мастакоў, архітэктараў, будаўнікоў. Праца не на адзін год. Але гэты пляц будзе помнікам, вартым памяці вялікага сына Беларусі.

Іншыя ўдзельнікі конкурсу лічаць, што помнік павінен стаяць у Верхнім горадзе. Галоўны аргумент «за»—гістарычнае асяроддзе. У пэўным сэнсе гэта так. Тут, бадай, адзінае месца ў нашай сталіцы, дзе адчуваецца старажытнасць — гісторыя, якая пачынаецца не з Кастрычніка 1917 года; гісторыя, якая была заўжды. Аднак сёння Верхні горад—гэта ў асноўным падмуркі, на якіх яшчэ толькі будуць (зноў жа — калі?) адноўлены гістарычныя будынкі. А паколькі будынкаў, да якіх збіраюцца прысуседзіць помнік першадрукару, якія разглядаюцца ў праектах як фон для помніка, яшчэ няма,—дык вельмі лёгка памыліцца ў маштабе. Ці не здарыцца так, што калі паўстануць адноўленыя царква Святога Духа і Менская ратуша, помнік (ён паўстане раней, можа, у канцы гэтага года) будзе лобач з імі чужародным?

І яшчэ адна акалічнасць, пра якую, здаецца, забылі і ўдзельнікі конкурсу і журы. Ужо ёсць рашэнне аб будаўніцтве на пляцы Волі ў Верхнім горадзе помніка тым, хто ўсталёўваў на Беларусі Савецкую ўладу. Значыць, Скарына будзе стаяць побач з Мясніковым, Дзяржынскім... Ці не замнога помнікаў для маленькай плошчы?

Аднак паспрабуем на хвіліну забыцца пра Мяснікова і Дзяржынскага (хоць гэта вельмі цяжка) і ўявім адноўлены Верхні горад без іх. Цэльны архітэктурны ансамбль Верхняга горада будзе вымагаць ад аўтараў помніка стылізацыі «пад старыну», свядомага адмаўлення ад сучаснай трактоўкі формы, што можа моцна збядніць вобраз Скарыны. І галоўнае — само асяроддзе прымусіць рабіць помнік камерным. У выніку можа атрымацца помнік для сквера, а трэба—помнік для горада; помнік, які б адпавядаў вызначэнню «нацыянальны мемарыял». Таму мы зноў вяртаемся да ідэі мемарыяла побач з Акадэміяй навук.

Дарэчы, на грамадскім абмеркаванні праектаў, што адбылося 10 ліпеня ў Палацы мастацтваў напярэдадні пасяджэння журы, прагучала прапанова ўключыць у праграму года Скарыны перайменаванне ў гонар першадрукара галоўнай вуліцы Мінска, якая зараз называецца Ленінскім праспектам. Прадстаўнік Міністэрства культуры У. Уродніч успрыняў гэту прапанову без энтузіязму. Яно і зразумела, для Беларусі такія грамадскія акцыі—справа новая. Як мне вядома, у нашай рэспубліцы нічога, што носіць імя Леніна, яшчэ не пераймяноўвалі... Не ведаю нават, ці была гэтая прапанова пісьмова зафіксавана, але тое, што яна паўплывала на рашэнне журы па трэцяму туру — відавочна. Нібыта баючыся, што ўслед за з'яўленнем плошчы Францыска Скарыны па Ленінскім праспекце неўзабаве і сам праспект стане Скарынінскім, некаторыя члены журы (на тым пасяджэнні 12 ліпеня яны аказаліся ў большасці) галасавалі за тое, каб на Ленінскім праспекце помніка Скарыне не было.

У складзе журы дваццаць два члены. На пасяджэнні прысутнічалі пятнаццаць. Шэсць галасавалі за помнік ля Акадэміі навук, адзін устрымаўся, восем — за помнік у Верхнім горадзе. Восем чалавек вырашылі лёс помніка першадрукару ў паўтараміль ённым горадзе. Няўжо канчаткова?

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

справе ж яно не праводзілася ніколі. Медыкі на месцах проста запаўнялі карткі — і ўсё. А гэта ж яўная халатнасць у выкананні службовых абавязкаў.

В. НЕСЦЯРЭНКА: — Хачу дадаць, што ў чэрвені—жніўні 1986 года дырэктар Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР і яго супрацоўнікі актыўна дапамагалі наладзіць абследаванне насельніцтва медыкам з Масквы ў Калінкавічах, Хойніках, Брагіне. Атрыманую інфармацыю адвезлі ў Маскву, а ў Міністэрства аховы здароўя рэспублікі накіравалі кароткую справаздачу з разліковымі дозамі. Такім чынам, першасная інфармацыя, абсалютна неабходная для правільных разлікаў і высноў, знікла.

А. ЛЮЦКО: — А як «працавалі» з ліквідатарамі? Ім часта давалі на дзесяць чалавек адзін дазіметр. Іншым давалі «накопители». Пасля работы падыходзіў старшы афіцэр і казаў: «Ты, Іваноў, няблага выглядаеш, запішам табе 3 бэры, а ты, Сідараў, горш — табе 5 бэр».

— Значыць, доза вызначалася на вока?

А. ЛЮЦКО: — Хутчэй, проста адвольна называлася, дакладней — прызначалася. Ва ўсесаюзным рэгістры, які захоўваецца ў Обнінску больш як 200 тысяч прозвішчаў — у асноўным, ліквідатараў. І ва ўсіх запісаны «прызначаныя» дозы. Увесь рэгістр, можна сказаць, фальсіфікаваны. Гэта не толькі трагедыя людзей. Гэта каласальная страта для навукі. Для таго, каб прагназіраваць захворванні, трэба абследаваць вялікую колькасць людзей, ведаць дакладна дозы, імі атрыманыя і весці назіранні на працягу доўгага часу.

В. НЕСЦЯРЭНКА: — Заўважце, закона аб крымінальнай адказнасці за вытворчасць і продаж забруджаных радыяцыяй прадуктаў харчавання няма. Што ж атрымліваецца? Вось той жа Папоў піша мне: не можа быць, каб у бульбе быў узровень забруджанасці 2×10^{-8} кюры на кілаграм. Але ж ёсць афіцыйныя дадзеныя па калію-40. Яго выпраменьванне ў бульбе складае ад 350 да 500 бекерэляў на кілаграм. А гэта ж тая самая велічыня, толькі ў іншых адзінках вымярэння!

Адкуль з'явілася рэкамендацыя ўносіць калій на палеткі? З Дзяржаграпрома СССР. Там, відаць, вырашылі, што калій складзе канкурэнцыю цэзію і параілі калійных угнаенняў уносіць у некалькі разоў больш, чым прадугледжана аграхімічнымі нарматывамі.

А. ЛЮЦКО: — Гэта ўсё тая ж заганная практыка «разбаўлення». Разбаўлялі бруднае мяса чыстым, разбаўлялі малако. Цяпер пачынаюць «размазваць» радыеактыўнае забруджванне па ўсёй рэспубліцы і за яе межамі. У нас на кафедры на рагачоўскай згушчонцы рабіліся спецлабараторныя работы. Гэта згушчонка выкарыстоўвалася як эталон радыеактыўнасці. У 1986 годзе яна складала 10^{-6} кюры на літр. А пасля таго, як тую згушчонку перасталі купляць у рэспубліцы, я неяк убачыў яе на Каўказе, у альпінісцкім лагеры.

Трэба маркіраваць прадукцыю. Хай на ёй стаіць узровень радыеактыўнасці. Тады нехта будзе несці адказнасць. Бо калі мы зможам праверыць адпаведнасць маркіроўкі сапраўднаму стану, тады і закон аб крымінальнай адказнасці за распаўсюджванне забруджанай прадукцыі спатрэбіцца. А інакш ён проста не будзе працаваць.

І па іншых рэчывах, у прыватнасці, нітратах, трэба рабіць маркіроўку. Але пачынаць усё ж трэба з радыенуклідаў.

— Кіраўніцтва рэспублікі да нядаўняга часу абвінавачвала вучоных у тым, што яны сеюць паніку. З-за іх, маўляў, забастоўкі ў Нароўлі, Гомелі... Няўжо гэта вы «дэстабілізавалі» сітуацыю ў рэспубліцы?

А. ЛЮЦКО: — Памятаю, мы з Васілём Барысавічам збіраліся ехаць у Чэрыкаўскі раён. А тут у сталіцы — дэлегацыя з Нароўлі. Дык нас тады папрасілі, каб мы тэрмінова выехалі туды, удакладнілі радыяцыйную сітуацыю. Я ездзіў па Нараўлянскім раёне, бачыў усе гэтыя будоўлі, кінутыя пасёлкі, гаварыў з людзьмі. У размовах часта ўспаміналі цяперашняга сакратара ЦК КПБ А. Камая. Ён сапраўды многа працаваў у тым раёне пасля аварыі, літаральна дняваў і начаваў там. Але які вынік ягонай працы?..

Работа Дзяржаграпрома рэспублікі, калі лічыць па выніках, сапраўды, відаць, кімсьці «дэстабілізавана». А нам так патрэбны зараз гародніна, садавіна, сокі, ягады ў свежым выглядзе. Гэта ж лекі для беларускіх дзяцей у сённяшняй сітуацыі! Гэта прыродныя радыепратэктары.

В. НЕСЦЯРЭНКА: — «Наверсе» не ўсвядомілі да канца маштабу бяды. Нават пры абмеркаванні чарнобыльскіх праблем у Вярхоўным Савеце краіны яго Старшыня сказаў, што нехта тут у нас нібыта «цягне коўдру на сябе». Хіба простыя людзі самі гэту бяду сатварылі? Народу трэба дапамагчы.

Гутарку вёў
Леанід СВІРЫДАЎ.

Гасціннасць нямецкіх сем'яў

320 дзяцей Чарнобыля правялі чатыры тыдні адпачынку ва Усходняй Германіі. Арганізавалі гэтую акцыю дзве грамадскія арганізацыі — нямецкая «Новы форум» і камітэт БНФ «Дзеці Чарнобыля».

Для якаснага адпачынку хлопчыкаў і дзяўчынак з забруджаных раёнаў Гомельскай, Магілёўскай і Брэсцкай абласцей было сабрана 143 тысячы марак. Ахвяраванні паступалі ад розных грамадскіх арганізацый (ад ХДС да ПДС), царквы, прамысловых прадпрыемстваў, прыватных асобаў.

З 8 да 16 гадзін дзеці мелі цікавую праграму, а астатні час праводзілі ў нямецкіх сем'ях, дзіцячых дамах і пансіянатах. Напрыклад, 200 хлопчыкаў і дзяўчынак з Кармы, Хойнік, Пінска, Століна, Магілёва адпачывалі ў Веймарскім раёне. Доктар медыцыны Роза-Марыя Ленсер і яе калегі падрыхтавалі для сваіх гасцей падарожжы па старажытных гарадах Цюрынгіі, экскурсіі ў музеі Гётэ, Шылера, Ліста. Цікавым было наведанне Цюрынгенскага Лесу і Гётэўскага саду, Эрфуртскага заапарка і Йенскага планетарыя, музея лялек і залы для гульняў вядомай фірмы «Атары-камп'ютэр».

У адзін з вечароў нямецкі нацыянальны тэатра у Веймары спецыяльна для беларускіх школьнікаў паказаў балет «Рамэа і Джульета». І ўсё гэта бясплатна. Эрфуртская і адна з заходненямецкіх фірмаў падарыла нашым дзецям цудоўны абутак, мясцовыя жыхары збіралі для іх адзенне і цацкі. Адзін раз на тыдзень або кожны дзень хлопчыкі і дзяўчынкі мелі магчымасць плаваць у басейне альбо катацца ў лодках па возеры. І, бадай, самае галоўнае, што нашы дзеці атрымлівалі тут вялікую колькасць самай рознай садавіны і гародніны, высакаякасных сокаў, чыстае мяса і малако, вітаміны...

Дзеці, якія прыехалі з бацькамі, маглі прайсці медыцынскае абследаванне ў Берлінскім радыяцыйным цэнтры.

Спецыяльна для гасцей з Беларусі гаспадары правялі два вясёлыя святы ў парку Бельведэрэ з разнастайнымі атракцыёнамі, тэатрам лялек, пантамімай, з музыкай і песнямі, з бясплатнымі сасіскамі, булачкамі, «Кока-колай» і «Фантай»... У якасці выключэння, дзеці Чарнобыля мелі магчымасць абмяняць савецкія рублі, і гэта ў дадатак да штотыднёвых кішэнных марак, якія выдавалі арганізатары акцыі адпачынку.

Гасціннасць і сардэчнасць нямецкіх сем'яў запомніцца на ўсё жыццё. Бо іх клопат пра нашых дзяцей быў сапраўды бацькоўскім.

А. ДАШЧЫНСКІ.

Грунвальд—580

СЦЯГІ з «Пагоняй» на чырвоным, блакітным, жоўта-чорным, пяціпалосным бела-чырвона-белым полі, харугвы лёгкай беларускай конніцы, татарскіх конных палкоў луналі ў мінулую нядзелю над Купалаўскім скверам Мінска. Упершыню ў сталіцы Беларусі святкавалі ўгодкі Грунвальдскай бітвы, ушаноўвалі памяць продкаў, што 15 ліпеня 1410 года ў жорсткай сечы з крыжакамі на пагорках Грунвальда адстаялі незалежнасць радзімы, абераглі родную веру, мову, культуру. З 90 палкоў Полыпчы і Вялікага княства Літоўскага, што біліся супроць войска Тэўтонскага ордэна, — 22 былі беларускімі.

Доўгія дзесяцігоддзі свята Грунвальда абыходзілі ў нас увагай, яго старанна замоўчвалі, яно нібыта знікала ў тых чорных дзірках гістарычнага бяспамяцтва. І вось сёлета новы склад Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў зламаў ганебную традыцыю. Камісія па культуры гарсавета, БНФ, Саюз мастакоў Беларусі наладзілі святочны Грунвальдскі мітынг. На плошчы перад помнікам Янку Купалу сабраліся мінчукі, якіх вітаў намеснік старшыні Мінгарсавета Анатоль Герасімовіч. Ён адзначыў непераходнае значэнне Грунвальда, з якога пачалося станаўленне самасвядомасці беларускага народа і развіццё нацыянальнай ідэі на Беларусі.

Розныя аспекты Грунвальдскай бітвы, сувязь Грунвальда з сённяшнім днём асвятлялі ў сваіх выступленнях мастакі Фелікс Янушкевіч і Мікола Купава, пісьменнікі Кастусь Тарасаў і Адам Мальдзіс, гісторыкі Ігар Чарняўскі і Анатоль Цітоў, старшыня татарскага культурнага Таварыства пры Беларускім фондзе культуры Ібрагім Канапацкі, народны дэпутат БССР Жуген Цумараў азнаёміў удзельнікаў свята з праектам «грунвальдскай» праграмы Вярхоўнага Савета БССР, у якой з мэтай абуджэння гістарычнай свядомасці народа мяркуецца штогод праводзіць урачыстасці, Грунвальдскія чытанні. Праграмай прадугледжваецца таксама прысваенне назваў «Грунвальдскіх» школам і прадпрыемствам, заснаванне беларускага ордэна Грунвальда, стварэння музейных экспазіцый. Ксёндз Ян Матусевіч прачытаў малітву аб героях Грунвальда. Прагучала і мусульманская малітва аб палеглых у бітве.

Старшыня Беларускага народнага фронту, народны дэпутат БССР Зянон Пазняк звярнуўся да моладзі з заклікам шырока ўдзельнічаць у руху «Грунвальд», маючы за пуцяводную зорку ідэалы незалежнай і свабоднай ад духу таталітарызму Беларусі.

Пад ухвалу прысутных Мікола Купава зачытаў зварот да гарадскіх уладаў з прапановай неадкладнага ўшанавання памяці Грунвальда, вялікага князя Вітаўта, князя Сямёна Мсціслаўскага, Пятра Гаштольда, што вялі 40 палкоў Вялікага княства Літоўскага ў бой, назвамі вуліц і памятнымі дошкамі. А да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы прапануецца ўзвесці велічны помнік на лепшай плошчы беларускай сталіцы. Зварот прыняў намеснік старшыні гарадскога савета народных дэпутатаў А. Герасімовіч.

Хочацца спадзявацца, што наша памяць пра выдатны подзвіг продкаў, нарэшце, матэрыялізуецца, і нам будзе не так сорамна перад суседзямі — палякамі і літоўцамі, для якіх Грунвальд даўно набыў моц сімвала, што кансалідуе народ.

Трэба растлумачыць, чаму узвядзенне помніка аднесена на пачатак наступнага тысячагоддзя. Справа не толькі ў «круглым» юбілеі. Павінна вырасці новае пакаленне скульптараў—незалежных па мысленню, нацыянальна свядомых і гістарычна адукаваных, каб зноўку не атрымаць які-небудзь стометровы штых ці самотнага ваяра са шлемам у руцэ...

Святочным ранкам біскуп Тадэвуш Кандрусевіч адслужыў па-беларуску прысвечаную Грунвальдскай перамозе святую імшу ў Кальварыйскім касцёле. Дзённую імшу служыў у Чырвоным касцёле ксёндз Ян Матусевіч.

Традыцыя святкаваць дзень Грунвальдскай бітвы зарадзілася. І гэта — яшчэ адно сведчанне нашага духоўнага прасвятлення, аднаўлення гістарычнай справядлівасці.

К. ЯДВІГА.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Многія, напэўна, памятаюць выступленне, якое прагучала на самым пачатку цяперашняй сесіі Вярхоўнага Савета БССР. Падцягнуты, трошкі суровага выгляду чалавек яўна хваляваўся ў той момант. Але па ўсім адчувалася — ён не мог не сказаць таго, што сказаў. «...Прашу афіцыйнага, публічнага прабачэння ў тых дэпутатаў не камуністаў, якія мною асабіста былі запрошаны на нараду партыйнай групы Вярхоўнага Савета Беларускай ССР... і якіх не дапусцілі ў залу ў выніку галасавання і рашэння большасці камуністаў, што прысутнічалі на гэтай нарадзе. І аб'яўляю як камуніст аб сваёй нязгодзе з гэтым рашэннем, лічу яго няправільным».

Гэта быў Яўген Новікаў — народны дэпутат ад Лермантаўскай выбарчай акругі г. Мінска, урач-кардыёлаг 4-й клінічнай бальніцы. Новікаў не раз выступаў у ходзе сесіі са сваёй адметнай пазіцыяй, выступаў узважана, кампетэнтна. Ён завечна скончыў юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Тэма дыпломнай работы —«Прынцыпы сацыялістычнай прававой дзяржавы».

Думаецца, чытачам «ЛіМа» будзе цікава пазнаёміцца з некаторымі развагамі дэпутата аб прычынах палітычнага і эканамічнага крызісу ў нашай краіне, а таксама крызісу Камуністычнай партыі, які выразна праявіўся і на яе XXVIII з'ездзе.

Дэпутацкі клуб «ЛіМа»

Яўген НОВІКАЎ:

«Разарваць заганнае кола»

— Сёння мы гаворым аб перадачы ўлады Саветам, фабрык і заводаў рабочым, зямлі — сялянам. Але спачатку трэба было б адказаць на пытанне: каму ўсё гэта належала? І ў каго трэба адабраць заводы, зямлю, уладу? Калі рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя не з'яўляліся ўласнікамі сродкаў вытворчасці на працягу 70 год, г. зн. не былі пануючымі класамі, дык у чыёй уласнасці знаходзіліся ўсе даброты, хто быў пануючым класам? Сёння мы не зможам назваць ніводнага закона, прынятага пасля 17-га года, паводле якога хоць адзін гектар зямлі, ці хоць бы адна фабрыка была перададзена непасрэдным вытворцам. Наадварот, савецкае заканадаўства было накіравана на тое, каб усе сродкі вытворчасці перадаць дзяржаве. Нават калгасна-кааператыўная ўласнасць была ў рэшце рэшт перададзена пад непасрэдны кантроль дзяржавы ў асобе выканкомаў. Пад выглядам калектывізацыі дзяржава проста забрала ў сялян зямлю прымусовым шляхам.

Яшчэ Маркс казаў, што дзяржава — гэта абстракцыя, якая канкрэтызуецца праз дзяржаўных чыноўнікаў. Таму заўсёды, калі мы гаворым аб дзяржаўнай уласнасці, неабходна мець на ўвазе ўласнасць дзяржаўных чыноўнікаў. Ва ўмовах манаполіі дзяржаўнай уласнасці ва ўсіх галінах эканомікі, думаю, правамерна гаварыць аб дзяржаўных чыноўніках як аб класе. Калі ўлічыць, што гэты клас мае ўсе магчымасці адчужаць непасрэднага вытворцу ад сродкаў вытворчасці, а значыць — ад вынікаў ягонай працы, дык можна гаварыць аб наяўнасці ў нашым грамадстве эксплуатацыі чалавека дзяржавай праз дзяржаўных чыноўнікаў. Гэта, на мой погляд, адпавядае вызначэнню У. І. Леніным сацыялізму як дзяржаўнага капіталізму. Клас дзяржаўных чыноўнікаў ва ўмовах манаполіі дзяржаўнай уласнасці ёсць клас дзяржаўнай буржуазіі. Узнікае пытанне,—а чаму ж гэты клас у сваіх жа інтарэсах не змог забяспечыць сацыяльны прагрэс нашага грамадства на працягу дзесяцігоддзяў? Адказ зноў жа ёсць у эканамічнай тэорыі Маркса, у прыватнасці, у той яе частцы, дзе ён раскрывае сутнасць нормы прыбавачнай вартасці і нормы прыбытку. Дзяржаўная ўласнасць, якая складае эканамічны грунт нашага грамадства, па сутнасці, з'яўляецца агульнай уласнасцю. А гэта азначае, што пры яе манаполіі норма прыбытку бясконца малая. Таму наш дзяржаўны чыноўнік зусім не зацікаўлены ў тым, каб якасна выконваць работу. Сваю зарплату ён атрымлівае ў любым выпадку — гэта і ёсць ягоны прыбытак. Калі ўлічыць адсутнасць інтарэсу і ў вытворцы, дык крызіс падобнай эканамічнай сістэмы выглядае непазбежным.

Думаю, што гэта крызіс не толькі манапольнай дзяржаўнай уласнасці, але і манаполіі КПСС, якая на працягу 70 год прэтэндавала на ролю кіруючай сілы грамадства разам з дзяржаўным апаратам. Прычына крызісу мне бачыцца ў тым, што пад сцягам КПСС спрабавалі аб'яднацца прадстаўнікі розных класаў з рознымі класавымі інтарэсамі. Дзяржаўны апарат у асобе дзяржаўных чыноўнікаў, які зліўся з партапаратам, паступова ўзмацняў манаполію дзяржаўнай уласнасці. У той жа час непасрэдны вытворца — радавы камуніст у асобе рабочага, селяніна, інжынера, урача, настаўніка застаўся наёмнай рабочай сілай, якую эксплуатуе дзяржава. Спроба аб'яднання прадстаўнікоў розных класаў у адной партыі, на адной эканамічнай і палітычнай платформе раней ці пазней павінна была прывесці да расколу. Раскол КПСС адбываецца, я перакананы, не па нацыянальных, а па класавых прыкметах.

Выхад той ці іншай рэспублікі са складу СССР — гэта не нацыянальная, а класавая праблема. Нацыяналізм, я лічу, здольны кансалідаваць грамадства толькі на пэўным этапе. Галоўным жа кансалідуючым пачаткам у нашай краіне, у прыватнасці, у нашай рэспубліцы можа стаць толькі эканамічная ідэя, бо эканоміка вызначае палітыку, а не наадварот.

Сёння перад рабочым класам, сялянствам і інтэлігенцыяй стаіць задача не ўпусціць свае карэнныя матэрыяльныя інтарэсы, вярнуць сабе сродкі вытворчасці на падставе ўласнасці. А інакш гэтыя сродкі вытворчасці застануцца ў руках буржуазіі. Цэнтральнай, ці нацыянальнай — у канчатковым выніку ўсё роўна.

Запісала З. ЦЮНІС.



Малюнак А. ГУРСКАГА.

Ліст у рэдакцыю

ХТО СЁННЯ КАЦІЛІНА?

«О доколе же ты, Катилина, будешь испытывать терпение наше?!» — усклікнуў калісьці з абурэннем старажытны рымскі аратар. І было чаго абурацца, бо той Каціліна ўсім надакучыў сваімі змовамі, скіраванымі на незаконны захоп улады.

«Не эксплуатаваць цярпенне народа», —перайначыў выказванне рымляніна народны дэпутат СССР, першы сакратар Брэсцкага абкома КПБ, дэлегат XXVIII з'езда КПСС Анатоль Зеляноўскі ў інтэрв'ю газеце «Звязда» 17 чэрвеня г. г.

Хто ж той сучасны Каціліна супраць якога скіраваны высакародны гнеў А. А. Зеляноўскага? Чытаем інтэрв'ю, і вось ён, адказ: «На людным мітынгу выступае вучоны і ганьбіць адміністрацыйна-камандную сістэму, партыйных бюракратаў. Сам ён усё жыццё чытаў у інстытуце курс развітога сацыялізму, абараніў дысертацыю, мае добрую зарплату і г. д. Але зараз — іншыя часы, ён, гэты «вучоны», і спявае іншыя песні. Мне ж здаецца, што ён хлусіў і тады, і зараз хлусіць не менш. Можа, ён не разумеў, што ніякага развітога сацыялізму няма? Не, разумеў, але было выгадна, добра плацілі...».

Але ж хто ён, гэты вучоны? Яго імя чамусьці не названа, хоць у тэксце інтэрв'ю багата празрыстых намёкаў. Па-першае, гэты «вучоны» выступаў «на людным мітынгу»; па-другое, ён «усё жыццё чытаў у інстытуце курс развітога сацыялізму»; па-трэцяе, «абараніў дысертацыю».

Узброеныя гэтымі «ўлікамі», мы пачалі пошук загадкавага Каціліны сярод грамадазнаўцаў педагагічнага і політэхнічнага інстытутаў Брэста (інстытут жа таксама не названы). Пачалі пошук, бо ведаем, што ў сям'і грамадазнаўцаў таксама «не без урода». 73 гады шляху да «светлай будучыні» напладзілі нямала афіцыйных «тэарэтыкаў», для якіх змена правадыроў азначала і змену ідэй. Але, на жаль, усе нашы намаганні не прывялі да поспеху: мы не знайшлі ніводнага вучонага-грамадазнаўцы, якому можна было б прад'явіць усе тры «ўлікі» адначасова.

Застаецца меркаваць, што А. А. Зеляноўскі даў нам абагульнены вобраз сучаснага Каціліны. У гэтым пераконвае і тое, што партапарат ужо даўно глядзіць коса на вучоных-грамадазнаўцаў брэсцкіх інстытутаў: то каго-небудзь падвергне крытыцы ў афіцыйным дакладзе за падтрымку БНФ або «Дэмакратычнай платформы», то кагосьці занясе ў спісы непажаданых лектараў па лініі таварыства «Веды», супраць некага паспрабуе завесці персанальную справу.

Ну што тут зробіш? Не падтрымліваюць грамадазнаўцы ў большасці сваёй кансерватараў розных рангаў і масцей. І змагаецца супраць іх партапарат. Але барацьба павінна быць годнай, па сутнасці справы. Між тым першы сакратар абкома ўсё зводзіць да «спеваў» і добрых заробкаў. У такім разе мы таксама маем што сказаць — «да пытання аб спевах».

«Сёння ўсе мы, камуністы, — гаварыў А. А. Зеляноўскі на XIX абласной партканферэнцыі ў снежні 1980 года, — аднадушна ўхваляем унутраную і знешнюю палітыку партыі, шматгранную дзейнасць яе Цэнтральнага Камітэта, Палітбюро ЦК на чале з тав. Л. І. Брэжневым». Ці вось: «З вялікім натхненнем успрынялі меліяратары Палесся пастанову кастрычніцкага Пленума ЦК КПСС, выступленне на ім Генеральнага сакратара ЦК нашай партыі, Старшыні Вярхоўнага Савета СССР К. У. Чарненкі. Рашэнні Пленума, які абмеркаваў пытанні Доўгатэрміновай праграмы меліярацыі, павышэння эфектыўнасці выкарыстання меліяраваных зямель у мэтах устойлівага нарошчвання харчовага фонду краіны — гэта яркае пацвярджэнне мудрай стратэгічнай лініі партыі на забеспячэнне планамернага ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці...» (VI пленум АК КПБ, лістапад 1984 г.).

Што гэта такое, як не «спевы»? А можа, адпаведна з логікай А. А. Зеляноўскага, «было выгадна, добра плацілі»? Дарэчы, заўважым, што ў тагачасным рэпертуары А. А. Зеляноўскага гэтыя «спевы» былі зусім не абавязковыя. З'яўляючыся начальнікам Галоўпалессеводбуда і ведаючы, «што ніякага развітога сацыялізму няма», ён мог выдатна абысціся без іх. Але не абышоўся. Затое цяпер, як бачым, выступае ў ролі Цыцэрона-выкрывальніка.

І апошняе. На пытанне: «Якіх якасцей вам, як партыйнаму работніку, вы лічыце, не хапае?», А. А. Зеляноўскі сціпла адказаў: «Іншы раз адчуваю, што надта гуманны...».

В. БРАТУХІН, народны дэпутат абласнога Савета, кандыдат эканамічных навук; А. ГАРБАЦКІ, кандыдат гістарычных навук; В. КАКЛЮХІН, кандыдат філасофскіх навук; І. КАТЛЯР, кандыдат філасофскіх навук; В. КРУКАЎ, кандыдат філасофскіх навук, загадчык кафедры філасофіі Брэсцкага ДПІ імя А. С. Пушкіна; А. ЛЯУКОВІЧ, кандыдат філасофскіх навук; С. ШАШ, кандыдат філасофскіх навук; В. МЕЛІШКЕВІЧ, кандыдат гістарычных навук, прарэктар па навуковай рабоце Брэсцкага ДПІ імя А. С. Пушкіна; Л. ЕРМАКОВІЧ, кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры палітычнай гісторыі Брэсцкага ДПІ імя А. С. Пушкіна; Л. ЛЯОНАЎ, кандыдат эканамічных навук, загадчык кафедры палітэканоміі Брэсцкага ДПІ імя А. С. Пушкіна.

САЮЗ САЮЗАЎ?

Культура патрабуе аб'яднання...
Пра гэта разважаюць кінематаграфіст і філосаф.

ПЕРШЫМІ з творчых саюзаў у нашай краіне прачнуліся для абнаўлення кінематаграфісты. Менавіта яны найбольш актыўна ўспрынялі свежыя ідэі, ва ўсякім разе, спрабуюць неяк змяніць сваё жыццё, а не цягнуцца ў хвасце ў падзей. Мо няшмат каму вядома, што ідэя кансалідацыі творчых і навуковых сіл, укараненне навуковых метадаў у арганізацыю жыцця творчага саюза і галіны таксама належыць кінематаграфістам. У СК СССР плённа працуе Група развіцця, якая займаецца навуковым мадэліраваннем і прагназіраваннем, калі хочаце, культурнага працэсу ў галіне кіно.

Першымі на вышукі гэтай групы азваліся кінематаграфісты Беларусі. А азвацца іх, як той казаў, прымусіла жыццё. Жыццё, што ператварылася ў ланцуг суцэльных праблем: прэсінг з боку адміністрацыйна - чыноўніцкага апарату ў ідэалогіі і культуры, які з апошніх намаганняў стараецца ўтрымаць лейцы ўлады: злосная нядобразычлівасць з боку гарадскіх улад за тое, што Дом кіно прыняў пад свой дах лідэраў БНФ у перыяд перадвыбарчай кампаніі; супраціўленне кансерватыўных сіл самога кінематаграфічнага асяродку, якія не жадаюць расставацца з гарантаванай (хай сабе і жабрацкай) зарплатай на кінастудыі, што манапалізавала вытворчасць фільмаў. Дадайце сюды непаразуменні з веруючымі-католікамі, якія патрабуюць вярнуць ім Чырвоны касцёл, у якім і месціцца саюз і Дом кіно — адзінае месца, дзе творчыя людзі могуць сустракацца і весці культурнае грамадскае жыццё, а не сядзець па кутах на кінастудыі, якая цяпер хутчэй нагадвае пейзаж пасля бітвы... бюракратычнага апарату з таленавітымі людзьмі. Кінастудыю «Беларусьфільм» пакідаюць яе лепшыя сілы. Пайшлі ў незалежныя студыі рэжысёры В. Рыбараў, М. Пташук, А. Карпаў-малодшы, аператар з міжнародным імем Т. Логінава, аніматары...

Але хочацца пазнаёміць грамадскасць з другім бокам жыцця творчага саюза. Я б назвала яго — грамадска-культурным, звернутым не толькі на ўласныя праблемы, але на агульнанацыянальны культурны працэс. Таму што (і гэта ўсвядомілі беларускія кінематаграфісты) няма БЕЛАРУСКАГА кіно, пакуль не вызначыць яно сябе ў багацці сувязей усяго жыцця свайго народа і грамадства. Знайсці ў ім сваё месца, не губляючы самабытнасці, зразумець, у які бок рушыць, дапамагла «дзелавая гульня», праведзеная ў канцы 1989 года групай СК СССР пад кіраўніцтвам філосафа П. Шчадравіцкага па праблеме «Фундаментальныя каштоўнасці нацыянальнай культуры Беларусі». Ідэя запрашэння і правядзення такой гульні зыходзіла ад беларускіх кінематаграфістаў.

Што ж атрымалі яны самі? Перадусім — адчувальны інтэлектуальны штуршок. Але цяпер столькі арганізацыйных праблем! Так пакутліва складваюцца адносіны з кінарынкам (ён толькі-толькі фарміруецца), дзе пакуль ў наяўнасці толькі рабаўнічыя, прыгонныя ўмовы работы з заходнімі партнёрамі! Хутка ў Мінску адбудзецца яшчэ адна дзелавая гульня, нацэленая ўжо на распрацоўку арганізацыйных структур і метадаў дзейнасці ў кінавытворчасці. Гэта — наперадзе. А пакуль кінематаграфісты, атрымаўшы ў сябры некалькі светлых філасофскіх галоў, зрабілі іх сваімі саюзнікамі. Калі б хоць хто-небудзь з суседніх творчых саюзаў патрымаў у руках... вынікі такога супрацоўніцтва — вынікі экспертызы праектаў развіцця кінематографа Беларусі ў 1990 і наступныя гады, не сумняваюся, ён бы пазайздросціў кінатворцам. Магчыма, і адбываюцца многія цяперашнія катаклізмы ў асяроддзі мастакоў, літаратараў, архітэктараў, музыкантаў з-за таго, што іх жыццё... малакультурнае (пад гэтым трэба разумець іх агульнае існаванне — ад адзінай плыні навуковай і творчай думкі). Бо, так бы мовіць, «спецыялізацыя» творчых суполак прынесла нацыянальнай культуры страшную шкоду; сталінскі разлік аказаўся правільным: раз'яднаўшы і размеркаваўшы матэрыяльныя падачкі, ён тым самым зрабіў творчых людзей рабамі, збэсціў і абяскровіў мастацтва, таму што сапраўдная творчасць сілкуецца з усіх крыніц, і не павінна быць перагародак у жыцці мастака і кампазітара, архітэктара і пісьменніка...

Я запрашаю вас папрысутнічаць на сустрэчы двух людзей, якія яшчэ зусім нядаўна і не падазравалі аб існаванні адзін аднаго, і не думалі, што ў іх можа быць агульная тэма для гаворкі. Гэта кінарэжысёр Вячаслаў НІКІФАРАЎ і філосаф Алег КУКРАК. Першы—старшыня прэзідыума праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР, другі — выкладчык БПІ, лідэр клуба інтэлектуалаў, які афармліўся пасля гульні ў Стайках. Яны гутараць пра ідэю аб'яднання творчых саюзаў, якая сфармулявана даўно, але ніяк не можа ажыццявіцца.

В. НІКІФАРАЎ. Добрыя ідэі, вядома, з'яўляюцца, але, каб іх спазнаць, патрэбен пэўны штуршок. Для нас такім штуршком стаў той эксперыментальны семінар у Стайках, які паказаў, што грамадскасць вельмі зацікаўлена культурнымі праблемамі, кінематаграфічнымі ў прыватнасці. Высветлілася: велізарны спектр праблем нацыянальнай культуры і яе адраджэння аказаўся «выключаным» з сусветнага культурнага працэсу, і вяртанне ў гэты працэс магчыма пры наяўнасці добра распрацаванай культурнай праграмы і — галоўнае! — калі яе ажыццяўленнем будуць займацца самі **носьбіты гэтай культуры,** а не кіроўцы ад культуры. Але гэта магчыма толькі тады, калі народзіцца **еднасць усіх творчых сіл,** выказнікамі якіх павінны, па ідэі, быць творчыя суполкі, таварыствы, саюзы, іншыя формы аб'яднанняў. Ёсць яшчэ адна прычына, па якой такое аб'яднанне неабходна. Яна тоіцца ва ўнутраных праблемах саміх творчых саюзаў, якія пакуль перажываюць не самыя лепшыя свае часы, па сутнасці, зжываюць сябе, бо трымаліся не адзінствам інтарэсаў, а безвыходнасцю і скразным кантролем дзяржавы. Карацей кажучы, **культура непадзельная.** Любы від творчасці не можа развівацца па-за агульным культурным кантэкстам. Варта сабрацца, назваць гэта ўсё нейкім агульным словам... І ўсё будзе ў парадку? Хацелася б. На самай справе перадусім кожны саюз мусіць усвядоміць гэтую «цэнтрабежную» тэндэнцыю. Але як наблізіцца да яе разумення?

А. КУКРАК. Гэта пункт гледжання кінематаграфістаў. Напраўду, культура з'яўляецца універсальным працэсам, усе яе галіны ўзаемапераплятаюцца, узаемадзейнічаюць адна з адной і адна адну стымулююць. Раней такое яднанне таксама існавала, але яно дасягалася наступным чынам: існаваў нейкі адзіны ідэалагічны цэнтр, які праз творчыя саюзы «спускаў» свае ісціны ў розныя творчыя галіны. Цэнтр валодаў манаполіяй на ісціну ў культуры. А творчыя арганізацыі вымушаны былі гэтыя ісціны толькі інтэрпрэтаваць. Мне здаецца, што мы адчулі: гэта сістэма ненатуральная. Нам няма чаго чакаць «промня», які ідзе аднекуль, мы самі павінны ствараць свячэнне, кожны на сваім месцы. І калі мы гэта зразумеем, дык усвядомім неабходнасць аб'яднання. Я не схільны заклікаць да разбурэння структуры ранейшых творчых саюзаў: у кожнага з іх ёсць нешта вартае, і цяпер яго адмаўляць нельга. Трэба шукаць дадатковыя формы сувязей, аб'яднанняў, арганізацый, якія б гэтую сістэму рабілі больш гнуткай, жывой, якая б садзейнічала творчай дзейнасці. Увесь культурна-гістарычны вопыт сведчыць, што гэта магчыма толькі пры ўзаемадзеянні розных відаў мастацтва. Калі ўзяць сусветны кінематограф, дык ці мог бы Бюнюэль стаць Бюнюэлем без Сальвадора Далі, без пошукаў у паэзіі іспанскіх і французскіх авангардыстаў, у літаратуры, эстэтыцы, у музыцы і г. д.? Вопыт развіцця кожнага мастацтва сведчыць пра тое ж.

Узлёты ў мастацтве, у культуры адбываліся тады, калі аб'ядноўваліся ў творчым пошуку прадстаўнікі самых розных сфер. Яны пракладалі новыя творчыя шляхі, шматстайнасць творчых пазіцый ўзбагачала культурнае жыццё грамадства. Мне блізкая думка багаслова ранняга хрысціянства Амбросія Мідзіяўінскага, які на пытанне, што такое Рай? — адказаў: Рай — гэта багацце шмат якімі думкамі. А гэта ж якраз тое, што мы шукаем сёння, гаворачы аб плюралізме, дэмакратыі, агульным культурным развіцці. Ідэя стварэння саюза творчых саюзаў не абмяжоўваецца тым, што гэта будзе аб'яднанне толькі існуючых саюзаў, паколькі ў аснове гэтай ідэі ляжыць задача прывабіць да яе як мага больш людзей з самых розных сфер нашага жыцця. І ўжо назапашаны пазітыўны вопыт, калі спробы раз'яднаць рамкі асобнага прафесійнага саюза даюць вынікі. Ва ўсіх перад вачамі прыклад Саюза кінематаграфістаў СССР. І відаць, як жыццё самога кінематографа робіцца багацейшым, абуджаецца фантазія... Не за гарамі і сур'ёзныя творчыя ўклады, якія немагчымы без глебы для выспявання ідэй. І рыхтаваць такую глебу неабходна ўжо зараз.

В. Н. Вось і мне бачыцца гэты будучы Саюз саюзаў; яго роля ва ўвасабленні ўласнай агульнакультурнай місіі. Як, нарэшце, нам зрабіць паварот да ўсведамлення каштоўнасці творчасці? Ва ўсім свеце даражэй за ўсё цэніцца тэхналогія, спосаб, ідэі, а не канчатковы прадукт — у нас усё наадварот! На манер тэхналогій у галіне культуры дзейнічаюць праграмы; культурныя ідэі рухаюць прагрэс. Возьмем нашу галіну — кінематограф. Мы, беларускія кінематаграфісты, сталі перад праблемай абароны прыярытэтаў беларускага кінематографа і культуры ў цэлым ад камерцыяналізацыі, ад капрызаў рынку і вытворчасці, перад неабходнасцю стварэння нейкага фонду, які павінен базіравацца на добра прадуманай перспектыўнай культурнай праграме: гэта магчыма толькі ў кантэксце ўсіх культурных клопатаў. І адным з першых крокаў Асацыяцыі саюзаў можа стаць выпрацоўка, стварэнне і ўкараненне такой культурнай праграмы. Чаму так важна аб'яднанне саюзаў, відаць нават на такім прыкладзе: культурная праграма «Родная мова», на жаль, не зрабілася часткай культурных праграм іншых відаў мастацтва, кінематографа ў прыватнасці. У такім масавым мастацтве, як кіно, гэта праграма сябе не знаходзіць — дзіўна, ці не праўда?

А. К. Як можа быць звязаны кінематограф з праграмай «Родная мова»? Няўжо толькі яе папулярызаваць? Мова счэплена з пэўным і спецыфічным быццём; кожны слоўны сэнс апелюе да пэўнай рэчаіснасці, і вось паказаць гэтую рэчаіснасць, пакідаючы слоўныя напластаванні, можа кінематограф. Творцам кіно не трэба быць ілюстратарам чужых думак і тэкстаў. Іх задача — выяўляць непаўторнае жыццё Беларусі, якая патрабуе свайго моўнага ўвасаблення. І ствараючы грашовы фонд развіцця беларускага кіно, мы і на яго павінны паглядзець інакш. Гэта не проста грошы, якія выдаткуюцца на пастаноўку фільмаў і іншыя патрэбы кінематографа. Трэба падкрэсліць менавіта ўкладанне іх у ягонае развіццё, у якійсьці творчы пошук. У гэтым могуць быць зацікаўлены і іншыя саюзы, ды і шмат нашых арганізацый. Тады праграма «Родная мова» не будзе высаджвацца на непадрыхтаваную глебу, а арганічна ўвойдзе ў працэс культурнага развіцця, станаўлення і, калі хочаце, культурнага самавызначэння беларускай нацыі. Фонд можа стаць асновай, на якой будзе фарміравацца Саюз саюзаў або Асацыяцыя. Кінематаграфія сёння можа стацца падмуркам аб'яднання, таму што кінематаграфія не толькі сінтэз мастацтваў, гэта і тэхніка, і навука, і эканоміка.

В. Н. Сінтэтычнасць кінематографа не такое ўжо простае паняцце. Яно часцяком уяўляецца як арыфметычнае складанне, якое прывяло, дарэчы, да таго, што кінематограф разумеецца часта як простая сума мастацкіх прыкмет. Бо і раней былі спробы аб'яднання саюзаў. Помню, гадоў 10—15 назад праводзіліся творчыя семінары, на прыродзе збіраліся пісьменнікі, рэжысёры, кампазітары, мастакі, і ўсё гэта павінна было садзейнічаць яднанню творчых сіл, але ў лепшым выпадку гэта абарочвалася двума-трыма творчымі садружнасцямі паміж асобнымі людзьмі. А ў сапраўдным сэнсе кінематограф і літаратура не браталіся, не здолелі прарасці адно ў другое. Можа, таму, што гэты працэс мы бяздумна аддалі ў рукі чыноўнікаў ад культуры? Варта было з'явіцца праграме «Родная мова», як хуценька рэанімавалі сістэму дубліравання фільмаў на кінастудыі. З ужо расфарміраванага Дзяржкіно пайшло на гэта распараджэнне, і ніхто не задумаўся, чаму беларускамоўныя копіі гадамі пыліліся на паліцах, у лепшым выпадку Беларускае тэлебачанне паказвала іх? Тая самая метода чыноўніцтва: ёсць указанне — будзем рабіць, а як, на падставе і з дапамогай якіх ідэй можна зрабіць беларускамоўны кінематограф высокамастацкім, цікавым,—няхай каму іншаму галава баліць. Ці не лепей было б цяпер пусціць «дубліравальныя» грошы на стварэнне відэакліпаў, відэаролікаў для самых малых, дзе абыгрываліся б агульныя карані моў, у захапляльнай форме прывіваўся б густ да роднай мовы...

А. К. Густ да мовы нараджаецца тады, калі адраджаюцца ўсе пласты культурнага жыцця народа, рэгіёна. Гэта патрабуе і новай якасці сувязей, якія павінны насіць творчы характар. Тут могуць завязвацца аб'яднанні і на нейкай асабістай падставе. Мастак шукае тых, з кім можа непасрэдна сутыкацца, уступаць у дыялог і выпрацоўваць агульную платформу. Магчыма, такім чынам запачаткуецца новая культурная з'ява; менавіта тут гэтая культурная з'ява першасна будзе беларускай, тутэйшай. Але гэта магчыма толькі ў дыялогу розных пластоў, розных форм культур. Сустрэча еўрапейскай і ўсходняй культур, сустрэча культуры і тэхнікі, а якія перспектывы тоіць сустрэча культуры з навукай! Беларусь знаходзіцца ў становішчы зваяванай рэспублікі — Чарнобылем і іншымі, у тым ліку экалагічнымі праблемамі. Выйсце з гэтага стану патрабуе каласальнага ўзлёту таго, што мы называем інтэлектуальным і духоўным патэнцыялам нацыі. Беларусі шмат разоў і страшна не шанцавала. Страты, гібель людзей, велізарны адток інтэлектуальнага патэнцыялу, а без яго ўсіх праблем сёння не вырашыць. Патрэбна каласальная канцэнтрацыя шматлікіх намаганняў. Арганізацыя, пра якую мы гаворым, можа садзейнічаць такой канцэнтрацыі. Гаворка ж ідзе не аб тым, што будуць створаны цудоўныя фільмы, гэтага мы не гарантуем. Гарантаваць можна іншае — рост агульнага культурнага патэнцыялу, саміх творчых работнікаў, усёй нацыі.

В. Н. Давайце пафантазіруем. Нацыянальная праграма развіцця беларускага кінематографа мусіць з'яднана з іншымі культурнымі праграмамі, з мноствам праграм. Ад самых простых (напрыклад, сумеснае журы кінафестываляў) да нейкага культурнага цэнтра, у якім ажыццяўляліся б сумесныя культурныя акцыі міжнароднага, усесаюзнага ці мясцовага, гарадскога маштабу. Гэта і сучасны інфармацыйны цэнтр, абсталяваны па апошнім слове тэхнікі, звязаны з банкамі інфармацыі ўсяго свету...

А. К. Мы прыйшлі да таго, з чаго пачалі. Беларуская культура сёння павінна ўвайсці ў сусветны культурны працэс. Цікава і неабходна стварыць нацыянальны культурны цэнтр, свайго роду свабодную Акадэмію культуры. І ў сваіх асноўных рысах супадае з той праграмай, якую цяпер распрацоўвае ЮНЕСКА. Пры ўсёй своеасаблівасці многія праблемы ў нас агульныя.

Падрыхтавала Т. ЦЮРЫНА.

Кніганіс

Я. БРЫЛЬ. Птушкі і гнёзды. Кніга адной маладосці. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1989.

Вядомы раман Янкі Брыля перавыдаецца ў серыі «Школьная бібліятэка». Зразумець вучням значнасць пісьменніцкай задумы, плённасць яе ажыццяўлення дапамагае ў артыкуле «За ўсё даражэй нам Радзіма» Г. Шупенька.

П. ПРУДНІКАЎ. Познія ягады. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1990.

Лірычны герой Паўла Прудніка — чалавек, які прайшоў нялёгкімі дарогамі, зведаў жахі сталінскіх засценкаў і лагераў. Ён вяртаецца ў перажытае, асэнсоўвае дзень сённяшні, задумваецца, як зберагчы ў наш трывожны час духоўнасць, людскасць.

М. РАКІТНЫ. У буйным квеце лотаці. Апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1989.

Апавяданні, якія ўвайшлі ў чарговы зборнік Міколы Ракітнага, — хвалюючы расказ пра людзей, чые дарогі ў розны час перакрыжаваліся са шляхамі самога аўтара. М. Ракітны не вышуквае нейкіх нечаканых сюжэтных калізій, а, здавалася б, наўмысна засяроджвае ўвагу на самых, што ні ёсць, звычайных выпадках. Галоўнае для яго — спасцігнуць багацце душы нашых сучаснікаў, зазірнуць, як мы раней любілі гаварыць, ва ўнутраны свет простага савецкага чалавека.

Г. КАРЖАНЕЎСКАЯ. Сінічка на балконе. Вершы. Для дашкольнага ўзросту. Мінск, «Юнацтва», 1989.

Чарговая кніжка паэтэсы, адрасаваная маленькім, — дасціпная гаворка аб тым, чым жывуць сённяшнія хлопчыкі і дзяўчынкі, як вучацца яны дабру, спазнаюць навакольны свет.

ЗАГАНЫ ШМАТТОМНАГА ВЫДАННЯ

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. Віцебская вобласць. Гомельская вобласць. Гродзенская вобласць. Магілёўская вобласць. Мінская вобласць. Мінск, «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя П. Броўкі, 1984—1988.

«ЗБОР помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» ўяўляе сабою навукова-даведачнае выданне, якое складзена паводле адзінай методыкі і куды ўключаны: і сістэматызаваны звесткі пра помнікі археалогіі, архітэктуры, гісторыі і манументальнага мастацтва Беларусі. Кожнай вобласці рэспублікі і сталіцы прысвечаны асобны том, а кожнаму помніку — асобны артыкул. Такая праца ў нашай рэспубліцы выдадзена ўпершыню, і ў гэтым заключаецца галоўнае яе значэнне. Сістэматызацыя помнікаў у кожным томе праведзена паводле тэрытарыяльнага прынцыпу. Кожны том пачынаецца прадмовай і ўводзінамі, у якіх каротка гаворыцца аб мэце працы, даецца агульная характарыстыка рэгіёна. Потым размяшчаюцца матэрыялы пра помнікі абласнога цэнтра, а затым — раёнаў у алфавітным парадку іх назваў.

1977) дазваляе зрабіць вывад, што шматлікія біяграфіі герояў Савецкага Саюза паўтараюць (капіруюць) і па форме, і па матэрыялу, і па выразах, і па фармуліроўках адпаведныя біяграфіі названай кнігі.

Шматлікія прыклады кампіляцыі, або проста спісвання з іншых кніг, нельга нават падлічыць. Так, амаль не адрозніваюцца біяграфічныя звесткі пра Героя Савецкага Саюза ў «Зборы помнікаў» (Віцебская вобл.) і ў «Навечно в сердце народном»: Ф. С. Вазнясенскага, С. А. Забагонскага, П. Д. Рэшатава, У. С. Рублеўскага, З. М. Тусналобавай-Марчанкі, І. А. Філацьева, М. П. Фаміна, С. М. Чарапнёва, А. Якубава; па Брэсцкай вобл.— П. Б. Лакцыёнава, М. Р. Макарава, А. А. Малена; па Магілёўскай вобл.— Д. Я. Аскаленкі, С. Ф. Шутава; па Мінску — С. Ш. Гурэвіча і інш. У многім паўтараецца змест «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі» ў артыкулах пра гісторыка Л. Абэцэдарскага, партыйнага і дзяржаўнага дзеяча І. Былінскага, урача К. Грум-Гржымайлы, пісьменніка І. Гурскага, спевака М. Дзянісава, драматурга І. Дорскага.

Не на належным узроўні напісаны гістарычныя часткі пра такія помнікі, як Літаратурны музей Я. Купалы, Дзяржаўны мастацкі музей БССР, Мінскі педінстытут імя Горкага, Інстытут фізічнай культуры, Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, Музей першага з'езда РСДРП, Акадэмія навук БССР, Беларускі політэхнічны інстытут, кінастудыя «Беларусьфільм», Літаратурны музей Я. Коласа. У артыкуле пра Дом урада БССР, Тэатр музычнай камедыі, манумент Перамогі чамусьці зусім няма гістарычных частак. Слаба напісаны артыкулы пра жыццё і творчасць Я. Коласа, К. Чорнага, І. Жыновіча. Рыхтавалі іх малодшыя навуковыя супрацоўнікі аддзела Збору помнікаў гісторыі і культуры — людзі, далёкія ад літаратуры і мастацтва.

Пры падрыхтоўцы выдання аўтарскі калектыў правёў вялікую работу па выяўленні і даследаванні помнікаў, выкарыстаў шматлікія архіўныя, літаратурныя крыніцы, а таксама матэрыялы, сабраныя ў час экспедыцый. Вартасць даследавання заключаецца і ў тым, што ў ім змешчана вялікая колькасць ілюстратыўнага матэрыялу — каляровых і чорнабелых фотаздымкаў, а таксама чарцяжоў помнікаў архітэктуры, археалогіі, гісторыі і мастацтва. Увогуле можна сказаць, што гэта праца — новы крок у вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Аднак, на вялікі жаль, глыбокай, фундаментальнай энцыклапедыі аб помніках гісторыі і культуры рэспублікі не атрымалася. У гэтай працы шмат упушчэнняў і сур'ёзных хібаў, разгляду якіх і прысвечана большая частка гэтай рэцэнзіі. І вельмі здзіўляе вылучэнне гэтага недастаткова апрацаванага выдання на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР. Дарэчы, аб разглядаемай працы ўжо апублікаваны некалькі водгукаў, а адзін з іх — у бюлетэні «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі» (1985, № 2), рэдактарам якога з'яўляўся С. В. Марцалеў, пад чыёй рэдакцыяй выдадзены сямітомнік. Такія ж неаб'ектыўныя і тэндэнцыйныя рэцэнзіі прадстаўляюцца і ў Камітэт па дзяржаўных прэміях БССР.

Але спынюся на некаторых недахопах «Збору...». Многія пытанні тут разглядаюцца даволі павярхоўна. Больш таго, прыкладна адна трэць «Збору...» кампілюе, паўтарае змест шматлікіх артыкулаў 12-томнай «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі», 5-томнага выдання «Беларуская ССР. Кароткая энцыклапедыя», або такіх даведачных кніг, як «Навечно в сердце народном», «Акадэмія навук Беларускай ССР», «Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны», «Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны», «Пісьменнікі Савецкай Беларусі» і інш. Гэта датычыць перш за ўсё біяграфій Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы, рэвалюцыйных, партыйных, дзяржаўных дзеячаў, а таксама дзеячаў культуры і навукі, гісторыі гарадоў, абласцей, арганізацый РСДРП, гісторыі партызанскіх фарміраванняў, падпольных партыйных і камсамольскіх органаў Вялікай Айчыннай вайны. Напрыклад, уважлівае параўнанне зместу артыкулаў «Збору...» са зместам адпаведных артыкулаў у кнізе «Навечно в сердце народном» (Мн.,

Апрача прамой кампіляцыі аўтары многіх артыкулаў паспрабавалі выдаць пераказ чужых думак за свае ўласныя тэксты, што прывяло да сумных вынікаў. У такіх «уласных тэкстах» аказалася вельмі многа фактаграфічных памылак і недакладнасцей. Каб не стамляць чытачоў, прывяду толькі некалькі прыкладаў, якія датычаць адной з найбольш гераічных і разам з тым трагічных старонак гісторыі Беларусі — ўсенароднай барацьбы у тыле гітлераўскіх акупантаў.

Перш за ўсё стваральнікі шматтомнага «Збору помнікаў» паказалі даволі дзіўнае разуменне партыйнага кіраўніцтва ўсенароднай барацьбой у тыле ворага. Яны звязваюць гэта кіраўніцтва толькі з дзейнасцю падпольных партыйных органаў. Але ж у першы перыяд вайны (чэрвень 1941 г.— лістапад 1942 г.) з дзесяці даваенных абкомаў КП(б)Б пачалі дзейнічаць толькі чатыры, толькі ў пятай частцы раёнаў існавалі падпольныя райкомы партыі. У такіх умовах на палове тэрыторыі рэспублікі барацьба супраць акупантаў вялася пад прамым, непасрэдным арганізацыйна-практычным і ідэйна-палітычным кіраўніцтвам ЦК ВКП(б).

Не разумеючы ўсёй складанасці сітуацыі, аўтары тома, прысвечанага Віцебскай вобласці, безапеляцыйна заявілі, што тут барацьбой у тыле ворага кіравалі Віцебскі абком і падпольныя райкомы КП(б)Б (с. 31). Але ж Віцебскі абком стаў кіраваць барацьбой на акупіраванай тэрыторыі толькі з вясны 1942 г. (ён быў створаны ў сакавіку). А з 20 даваенных райкомаў партыі ў ліпені — снежні 1941 г. дзейнічалі ад 3-х да 6-ці, у студзені — красавіку іх колькасць зменшылася да 2-х. Аднак яшчэ да

стварэння Віцебскага падпольнага абкома амаль пры адсутнасці райкомаў на тэрыторыі вобласці толькі па ініцыятыве ваеннаслужачых ужо сталі змагацца супраць акупантаў больш за дзесяць партызанскіх атрадаў.

Не менш дзіўна, калі чытачам прапануюць перакручаныя факты ў сувязі з такой важнай для Беларусі з'явай, як роля П. М. Машэрава ў падпольнай і партызанскай барацьбе. Аўтары таго ж, прысвечанага Віцебшчыне, тома сцвярджаюць, быццам у Расонскім раёне камуністычнае падполле дзейнічала з ліпеня 1941 г. да верасня 1942 г. пад кіраўніцтвам райкома КП(б)Б (першы сакратар В. Я. Лапенка) і штаба цэнтральнай групы Расонскай арганізацыі на чале з П. М. Машэравым. Далей у кнізе пералічваюцца шэсць падпольных груп (у розных сельсаветах), якія нібыта ўвесь час дзейнічалі пад кіраўніцтвам райцэнтра. Але ж гэта, мякка кажучы, не адпавядае сапраўднасці.

Што датычыць П. М. Машэрава, то падпольная арганізацыя ў саміх Расонах была створана пры яго ўдзеле ў жніўні 1941 г., а ў красавіку 1942 г. П. М. Машэраў стаў камандзірам партызанскага атрада, што дзейнічаў па-за Расонамі. Гэта значыць, што П. М. Машэраў не мог кіраваць падполлем у Расонскім раёне з ліпеня 1941 г. да верасня 1942 г. Аднак справа не толькі ў гэтым. У іншых населеных пунктах раёна існавалі зусім самастойныя падпольныя партарганізацыі са значнай колькасцю камуністаў, якія не мелі патрэбы ў кіраўніцтве імі з боку камсамольца П. М. Машэрава.

Падобныя «перлы» сустракаюцца і ў тамах, прысвечаных іншым абласцям. На могілках гарадскога пасёлка Заслаўе стаіць гранітны абеліск з прозвішчамі пахаваных тут савецкіх разведчыкаў. Як жа дапамаглі аўтары 2-й кнігі тома аб Мінскай вобласці разабрацца ў гістарычнай падзеі, што звязана з тым абеліскам? На стар. 48-й аўтары паведамілі пра гэта ўсяго трыма сказамі, якія не толькі не дапамаглі чытачам, але яшчэ іх заблыталі. У кнізе паведамляецца, быццам тут пахаваны 8 воінаў-разведчыкаў (дэсант у тыл ворага), што загінулі 1—3.1.1943 г. Але ж на самай справе там дэсантнікаў было чатыры, астатнія чацвёра — гэта мінчане, якія ім дапамагалі. А як жа яны загінулі? Іх расстралялі ў партызанскай брыгадзе «Штурмавая» па загаду яе камандзіра Б. М. Луніна, які беспадстаўна западозрыў разведчыкаў у супрацоўніцтве з гітлераўскімі акупантамі.

Не лепей выглядаюць у «Зборы...» і некаторыя сюжэты, звязаныя з дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў. Аб гэтым паведамлялася на старонках «ЛіМа» яшчэ ў 1987 годзе.

У прадмовах да тамоў сцвярджаецца, што кожнаму помніку прысвечаны артыкул з характарыстыкай яго гістарычных і мастацкіх каштоўнасцей. Аднак у шматлікіх артыкулах падобныя характарыстыкі наогул адсутнічаюць. У вельмі многіх артыкулах, прысвечаных помнікам архітэктуры, адсутнічае сур'ёзны мастацтвазнаўчы аналіз, не раскрываецца іх каштоўнасць, мастацкая выразнасць, не паказваецца мясцовая ці нацыянальная спецыфіка. Замест гэтага даецца спрошчанае апісанне таго або іншага будынка ці іх комплексу (аб'ёму, частак памяшканняў, дзвярных ці аконных праёмаў, даху і т. п.), а ў канцы артыкулаў звычайна прыводзяцца прыкладна такія фразы: «Будынак — помнік эклектычнай архітэктуры», «Касцёл — помнік архітэктуры неаготыкі», «Сядзіба — помнік архітэктуры неакласіцызму» і г. д. Але чаму той або іншы будынак адносіцца да пэўнага стылю, чытачу незразумела.

Асобныя старонкі выкананы настолькі прымітыўна, па-казённаму, што напамінаюць спіс раённага таварыства аховы помнікаў, у якім змешчаны вельмі павярхоўныя, няпоўныя і скупыя звесткі пра помнікі (глядзіце, напрыклад, «Збор помнікаў... Гомельская вобласць»).

І нарэшце, праца амаль не адлюстроўвае такі важны аспект праблемы, як сучасны стан захаванасці помнікаў. З тэкстаў, а таксама прыгожых карцінак-фотаілюстрацый можа скласціся ўражанне, што ў данай справе ўсё добра. Але мы ведаем, што гэта не так — многія помнікі маюць дрэнную захаванасць, непрыглядны выгляд.

Ёсць нямала іншых хібаў у рэцэнзуемай працы. Вось, напрыклад, у канцы тома, прысвечанага Брэсцкай вобласці, дзе пералічваюцца назвы раёнаў, няма Пінскага раёна. А ў кнізе па Магілёўскай вобласці мы не знайшлі артыкулаў пра пісьменнікаў Б. Мікуліча, Ю. Рудзько, радзімай якіх з'яўляецца Бабруйск. Чым жа яны горшыя за іншых пісьменнікаў, дзеячаў культуры, якім прысвечаны асобныя артыкулы пад назвай «Радзіма», хоць ім таксама не ўстаноўлены помнікі ці мемарыяльныя знакі на радзіме?

А ўвогуле, што датычыць памятных месцаў (радзімы, вядомых людзей, мясцін дзейнасці арганізацый РСДРП і да т. п.), не адзначаных помнікамі ці мемарыяльнымі знакамі, то, мабыць, ім прысвячаць у гэтым выданні артыкулы наўрад ці патрэбна было. У адваротным выпадку працу трэба было назваць не «Збор помнікаў...», а «Збор помнікаў і памятных месцаў». Незразумела таксама, чаму сюды ўключаны артыкулы пра ўсе гарады, абласныя і раённыя цэнтры.

Часам памеры артыкула пра менш значныя помнікі і памятныя месцы перабольшаны. Далёка не заўсёды вытрыманы адзіныя метадычныя патрабаванні, аб якіх гаворыцца ў прадмовах да тамоў. Не грунтоўна, шаблонна выкананы ўводныя артыкулы да тамоў, іх матэрыялы слаба адлюстроўваюць спецыфіку сацыяльна-гістарычнага развіцця кожнага з рэгіёнаў, асаблівасці іх мастацтва і культуры. Думаецца, што асноўны акцэнт уводзін павінен быць скіраваны не проста на характарыстыку таго або іншага рэгіёна, а на агульныя рысы і асаблівасці вывучаемай праблемы ў даным рэгіёне. Не прадумана даецца ва ўводзінах літаратура, асабліва па Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай абласцях. Так, ва «Уводзінах» тома па Мінскай вобласці (аб'ём іх тэксту разам з ілюстрацыямі складае ўсяго 35 старонак) у спіс літаратуры уключана больш за 300 назваў прац, многія з якіх тут наогул не патрэбны. Складваецца ўражанне, што назвы прац проста перапісаны з бібліяграфічных паказальнікаў літаратуры па прынцыпе абы больш.

У тэкстах дапускаюцца паўторы. Так, у томе па Пінскай вобласці адныя і тыя ж факты пра гісторыю гарадоў Барысаў, Вілейка, Жодзіна, Маладзечна, Салігорск, Слуцк прыводзяцца і ва ўводзінах, і ў асобных артыкулах.

Сустракаецца ў працы шэраг іншых недарэчнасцей. Так, у паказальніках бібліятэк, што змешчаны ў канцы тамоў, па адных бібліятэках даецца фонд кніг, па другіх такіх звестак няма.

У «Палажэнні аб Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне навукі і тэхнікі» сказана, што не дапускаецца ўключэнне ў калектыў на атрыманне прэміі асоб, якія маюць толькі адміністрацыйнае, кансультатыўнае і арганізацыйнае дачыненне да працы. Аднак у адносінах да загадчыцы аддзела выдавецтва «Беларуская Савецкая энцыклапедыя» С. П. Самуэль гэты прынцып парушаны: у напісанні «Збору...» яна непасрэднага ўдзелу не прымала, тут няма ніводнага артыкула з яе прозвішчам. Прозвішча С. Самуэль адсутнічае нават у імянных паказальніках усіх сямі тамоў «Збору...» Значыць, С. Самуэль уключана ў лік спаборнікаў на прэмію неабгрунтавана. У той жа час у спіс на прэмію не ўключаны некаторыя аўтары шматлікіх артыкулаў.

А. ЗАЛЕСКІ,
доктар гістарычных навук,
прафесар.

Галасы з небыцця

Кніга гэтая — спрасаваны людскі боль. Адначасова яна — і прамень надзеі, які прабіваецца скрозь напластаванні часу, яшчэ адна спроба сказаць праўду і пра вайну, і пра тых, каго ліхія абставіны ламалі ды не маглі зламаць, хто адышоў у вечнасць годна, нічым не запляміўшы сваё сумленне.

Палыхае, трапеча ў пальцах агеньчык свечкі. Полымя яго прабіваецца праз цемру... Такая вокладка. Крыху ніжэй назва — «Любі мяне пры ўсякай долі». Злева — прозвішчы аўтараў, украінскага і беларускага.

Адзін з іх, Багдан Чалы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, з баямі прайшоў ледзь не ўсю Беларусь, змаганне з фашызмам закончыў у паверженым Берліне. Другі, Уладзімір Ліпскі, гітлераўскую навалу перажыў дзіцем, а мог жа аказацца сярод герояў гэтай кнігі, бо яна пра тых, хто ў маленстве быў вывезены ў Германію, стаў нямецкім нявольнікам. Такі лёс, наколькі вядома, напаткаў тысячы беларусаў, украінскіх і рускіх дзяцей і падлеткаў. Таму і напісалі кнігу прадстаўнікі двух братніх літаратур — украінскай і беларускай. Таму і выйшла яна адначасова на Украіне і Беларусі (у нас кніга выпушчана выдавецтвам «Беларусь»).

Акрамя Б. Чалага і У. Ліпскага, у зборніка ёсць, так бы мовіць, і трэці аўтар — Розмары Канопка, «немка па нацыянальнасці, педагог па адукацыі», як гаворыць яна пра сябе. Дваццаць пяць гадоў працуе Р. Канопка на хімічным заводзе ў горадзе Косвінгу, што ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

Гарадок Косвінг тут згадваецца невыпадкова. Р. Канопка расказвае: «Старадаўні і велічны будынак у цэнтры горада — замак прынцаў Ангальцкіх. Помнік яшчэ трынаццатага стагоддзя... А ў трыццаць трэцім фашысты пераўтварылі яго ў жудасную турму. Спачатку катавалі тут толькі немцаў. Іх было трыста. К канцу вайны ўціснулі сюды яшчэ шэсцьсот вязняў дваццаці трох нацыянальнасцяў. Кожны трэці з іх загінуў ад катаванняў у гэтым каменным мяшку».

Яшчэ ж Косвінг — гэта і ганебна вядомае ВАСАТ, Вестфальска-Ангальцкае акцыянерскае таварыства па вытворчасці ўзрыўчаткі. Спачатку тут працавалі нямецкія жанчыны. Пазней, калі рабочых рук не хапала, у рабоў былі ператвораны дзеці, падлеткі, прывезеныя з СССР. Р. Канопцы ўдалося сабраць картачкі на асобных з іх. Нямнога-нямала, а ажно шэсцьсот чалавек. Тых, чые лёсы перайначыў фашызм. Многія загінулі, а астатнія?

За пошукі іх і ўзяліся Б. Чалы з У. Ліпскім. «Ахвяры Косвінга, адклікніцеся!»—прыкладна так пачыналіся іх звароты ў газетах «Правда Украіны», «Советская Белоруссия», смаленскім «Рабочим пути», у абласным друку, па радыё і тэлебачанні. Прайшоў некаторы час, і з'явіліся першыя водгукі. Не заўсёды пісалі, званілі самі пакутнікі — часта адгукаліся іх родзічы ці блізкія, бо мінула нямала гадоў, некаторыя з тых, хто выжыў у пекле, памерлі ад набытых у дзяцінстве хвароб.

Б. Чалы і У. Ліпскі выязджалі ці не па кожным адрасе, які атрымлівалі. Не маглі не ехаць. Паступова з асобных нарысаў, апублікаваных у перыёдыцы, нараджалася гэтая кніга-дакумент, кніга-рэквіем. Кніга-памяць аб тым, што нельга забыць нават цяпер, калі ў свеце значна пацяплела. Нельга забываць аб тым, які лёс рыхтаваў чалавецтву фашызм. Са старонак зборніка гэта добра відаць. Мінулае тут паўстае праз лёсы ахвяр — жывых і мёртвых. Балючая і неабходная праўда. Праўда пра дзяцей вайны. Ва ўзнаўленні яе дапамог і так званы нямецкі педантызм, славутая нямецкая акуратнасць. Падумаем толькі: дакладна занатоўвалася смерць кожнага малалетняга нявольніка. Надзея Маргелава з вёскі Прусінская Буда Касцюковіцкага раёна — адна з дзесяткаў загінуўшых. Пра яе лёс — нарыс «Зоркі над Прусінай Будай». Прыбыла ў Косвінг 2 чэрвеня 1942 года, мела лагерны нумар 5630, памерла 31 студзеня 1943 года. Пра лёс Надзеі родзічы нічога дагэтуль не ведалі.

Толькі з Прусінай Буды фашысты павезлі яшчэ сем дзяўчынак, якія таксама сталі паланянкамі. Пра гэта расказвае сама... Надзя Маргелава. Гэты літаратурны прыём апраўдвае сябе, і аўтары карыстаюцца ім неаднойчы, калі хочуць асаблівага даверу, спавядальнасці. Маналог Надзі «Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка?» — яшчэ адна вестка адтуль, з вайны, з небыцця.

У кнізе шмат здымкаў. Часам побач змешчаны два здымкі: ваеннага часу і цяперашні, на якім — пастарэлыя «косвінгцы». Малалетнія нявольнікі, гаворыцца ў кнізе, «прабіраліся праз дрот, рызыкуючы быць затрыманымі, аштрафаванымі і пасаджанымі ў канцлагер», прасілі фатографа-немца, плацілі яму са свайго мізэрнага заробку, каб толькі нешта засталося на памяць. Здымкі дарылі адзін аднаму, здымкі слалі блізкім, пакідаючы на адваротным баку няхітрыя надпісы. Сярод іх і той, што даў назву кнізе: «Любі мяне пры ўсякай долі»... Каму напісаў гэтыя радкі хлапчук у белай кашульцы і піянерскім гальштуку? Да каго звяртаўся ён, старанна выводзячы прыгожым почыркам літары? Найперш, вядома, маці, воблік якой з ім пастаянна жыў у няволі. Але гэта мальба і да нас, не заўсёды гатовых адгукнуцца на чужы боль, і да Радзімы...

Добрую кнігу напісалі Багдан Чалы і Уладзімір Ліпскі. Патрэбную. Як і тыя, што папярэднічалі ёй, як вядома, — «Я з вогненнай вёскі» А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка, «Блакадная кніга» А. Адамовіча і Д. Граніна, «Браніслава» С. Панізніка. А самай першай быў зборнік успамінаў малалетніх ахвяр вайны «Ніколі не забудзем», ля вытокаў якога стаяў Янка Маўр.

НАШ АГЛЯДАЛЬНІК.

ЯШЧЭ АДНА НЕДАПЕТАЯ ПЕСНЯ

ПЕРАБІРАЮЧЫ перадваенныя лісты сяброў, пажоўклыя ад часу і цудам ацалелыя ў гады ліхалецця, я наткнуўся на паштоўку, на якой быў сфатаграфаваны гарадок Стрый на Заходняй Украіне. На пярэднім плане шырокая вуліца, рэдкія дрэўцы абапал, маленькія домікі з аднаго боку вуліцы. Далей, к небасхілу, дзве не вельмі высокія вежы. Нейкай ласкавай утульнасцю і цішынёй павеяла на мяне ад гэтага гарадка.

На адвароце паштоўкі напісана: «Дарагая Паша! Віншую цябе са святам 13 гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі! Жадаю табе ўсяго найлепшага ў тваім асабістым жыцці. Цалую цябе. Ваня». Пад тэкстам пісьма зваротны адрас: г. Стрый, Драгабычская вобласць, п/с 915/з — В. Небасеву Івану Пятровічу.

Адрасаваны ліст роднай сястры, самаму дарагому чалавеку ва ўсім свеце.

Яны, Іван і Паша Небасевы, рана страцілі бацькоў і выхоўваліся ў дзіцячым доме ў Віцебскай вобласці. Потым прыехалі ў Мінск. Іван паступіў вучыцца на фізмат БДУ імя Леніна, а Паша стала студэнткай Мінскага педагагічнага інстытута імя Горкага.

Іван быў крыху старэйшы за сястру. вельмі клапаціўся пра яе. Час быў трывожны. Ён думаў аб тым, што хутка давядзецца ісці служыць у армію, і Паша застанецца адна, без падтрымкі, без роднай душы паблізу.

Я добра ведаў Івана Небасева, часта сустракаўся з ім, мы сябравалі. Іван лісаў апавяданні, а я спрабаваў свае сілы ў паэзіі. Разам мы хадзілі на заняткі літаратурнага гуртка, абмяркоўвалі прачытаныя кнігі любімых пісьменнікаў. Чыталі і разбіралі апавяданні і вершы сяброў-пачаткоўцаў. Многія потым сталі вядомымі пісьменнікамі і паэтамі, гордасцю беларускай літаратуры. А многія загінулі ў баях з фашыстамі, не дапеўшы сваёй песні.

Іван таксама марыў стаць пісьменнікам. Будучы студэнтам фізмата, руплива працаваў над апавяданнямі. Але гаварыць пра гэта не любіў, творчымі планамі не дзяліўся. Не расказваў, што і калі аддаваў у друк. З яго творамі я знаёміўся толькі тады, калі яны з'яўляліся ў друку. Адно яго апавяданне пад назвай «Зялёны дубок» я сустрэў у газеце «Літаратура і мастацтва» (1935, № 18). Потым у часопісе «Полымя рэвалюцыі» прачытаў яшчэ два апавяданні: «Блакітная Роза» (1936, № 1) і «Максім Парабула» (1936, № 7).

Прайшло больш пяцідзесяці гадоў, як я чытаў іх. У мяне няма пад рукой гэтых твораў. Многае сцерлася з памяці. Засталіся некаторыя дэталі. Асабліва з апавядання «Максім Парабула», у якім Іван Небасеў шчыра і цёпла напісаў аб студэнцкім жыцці. У гэтым творы выявілася тонкая назіральнасць маладога празаіка, уменне праўдзіва маляваць вобразы, матываваць учынкі герояў. У апавяданні ёсць цёплы гумар, лірызм, запаветныя думы юнацтва. Апавяданні былі сур'ёзнай заяўкай пачынаючага аўтара.

Пасля заканчэння універсітэта Іван Небасеў працаваў настаўнікам у Лагойску. І раптам у 1936 годзе яго арыштавалі. Абвінавацілі ў тым, што ён наведваў літаратурны гурток, якім кіраваў «вораг народа» М. Аляхновіч. Арыштавана было чатырнаццаць студэнтаў. Трынаццаць — з ледінстытута, а Небасеў — з універсітэта. Я сам быў разы два на занятках гэтага гуртка. Вядома, дзякуючы сябру.

Івана кінулі за турэмныя краты ў мінскую турму. Пашу выключылі з камсамола, бо яна не адраклася ад адзінага брата, насіла ў турму перадачы. Яе называлі сястрой «ворага народа», адабралі мізэрную стыпендыю. Аднак дзяўчына не верыла, што яе брат — «вораг народа». Яна была ўпэўнена: ён сумленны чалавек. Ды як гэта даказаць? Невыносна цяжка жыць, калі ад цябе са страхам адварочваюцца таварышы, баяцца за сябе і сваіх блізкіх.

Інквізітары-следчыя дабівалися ад маладога настаўніка прызнання віны. Вазілі на допыты ў высачэзны шэры дом НКУС, што стаяў на былой Савецкай вуліцы (цяпер праспект Леніна). Іван цвёрда адмаўляў бяздоказнае паклёпніцтва. Яго білі, з яго штодня здзекваліся. Аднойчы ён хацеў выкінуцца праз акно з чацвёртага паверха. Следчыя «пашкадавалі» сваю ахвяру, не дапусцілі да самагубства.

У турме Іван Небасеў прасядзеў два гады. Чатыры разы яго прыводзілі на суд. Немагчыма было далей цярпець такі здзек. Неяк ён пачаў моцна грукаць у дзверы камеры і клікаць ахоўніка. Той, мусіць, быў неблагім чалавекам, бо сказаў: «Супакойся, Небасеў. У Мінск прыехала надзвычайная тройка. Яна пераглядзела справы арыштаваных. Не бунтуй, пасядзі ціха. Можа, застанешся жывы». Ён выканаў параду наглядчыка. Неўзабаве яго апраўдалі, выпусцілі з турмы.

Пасля вяртання з пекла Іван працаваў настаўнікам у Дукорскай школе. Адтуль у 1939 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію. Служыў у горадзе Стрый. Вучыўся ў танкавай школе. Разам з ім служылі Аляксандр Гаспадараў і Сныцараў. Усе яны ўдзельнічалі ў вызваленні Заходняй Беларусі і Бесарабіі. Гаспадараў нават служыў у адным падрадзяленні з Іванам Небасевым.

Пачалася вайна. Ніякіх звестак ад брата Паша не атрымлівала. Адгрымеў пераможны май 45-га, а яна так нічога і не ведала пра яго лёс. І толькі ў 1946 годзе прынеслі горкую навіну, што Іван загінуў у танкавым баі.

Здарылася так, што вучань Івана Небасева пасля вайны выпадкова сустрэўся з таварышам свайго настаўніка Аляксандрам Гаспадаравым. Разгаварыўшыся, успомнілі агульнага знаёмага. Гаспадараў папрасіў напісаць з яго слоў пісьмо Іванавым родным, бо ён на свае вочы бачыў апошні ягоны бой.

Вось радкі з таго пісьма (яго захавала Паша Небасева, мая жонка): «24 чэрвеня 1941 года Іван Небасеў у складзе танкавага батальёна пайшоў на танку ў атаку ў раёне вёскі Броды (на захад ад Львова). Танк падбілі фашысты. Экіпаж пакінуў машыну. Іван сабраў дваццаць танкістаў, якіх напаткаў такі ж лёс, як яго экіпаж, і павёў іх на прарыў з акружэння... У час прарыву Іван Небасеў праявіў выключную храбрасць. У час гэтага бою Іван Небасеў быў забіты. Загінулі і многія іншыя танкісты. З усёй групы да сваіх прарваліся толькі сем чалавек...»

Песня, якая толькі-толькі пачыналася, засталася недапетай. Але памяць пра Івана Небасева павінна жыць. Імя яго трэба занесці ў спіс тых пісьменнікаў і паэтаў, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны за шчасце свайго народа, за незалежнасць нашай Радзімы. Ён мае на гэта права.

Мікола ЖУК.

Слуцкі раён.

ЛЯ КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

ЗАВЯЗЬ ЯГО СЛОВА

Знаёміцца з творчасцю Францыска Скарыны — не толькі здзіўляцца шырыні яго кругагляду, здольнасці на стагоддзі абганяць свой час, і адчуваць вабнасць слова, пялёсткавая завязь якога, дзякуючы майстэрству сына «славного града Полоцка», узбуйнілася ўсім сваім водарам. Маецца на ўвазе, так сказаць, уласна літаратурная дзейнасць першадрукара. Тут яго спадчына таксама надзіва багатая і разнастайная. Ф. Скарына перадаў у карыстанне нам, нашчадкам, 22 уласна напісаныя прадмовы, 25 сказанняў да выпушчаных ім кніг Бібліі. Ён — аўтар трох вершаў, двух гімнаў, пасхаліі з «Малой падарожнай кніжкі» 1522 года і больш за 60 пасляслоўяў.

З гэтых твораў яскрава паўстаюць погляды Ф. Скарыны, раскрываецца яго талент як публіцыста і мастака слова, бачны эстэтычныя густы. Нарэшце, гэта надзвычай важны адзін з пачатковых этапаў у духоўным жыцці беларусаў, які садзейнічаў у далейшым плённаму станаўленню нацыянальнай літаратуры. Невыпадкова, што творы Ф. Скарыны рэгулярна перавыдаюцца. У найбольш поўным выглядзе яны пабачылі свет у 1969 годзе, калі выйшла кніга «Ф. Скарына. Прадмовы і пасляслоўі». Выданне гэтае даўно стала бібліяграфічнай рэдкасцю.

Тым больш ёсць падставы вітаць новае выданне скарынаўскай спадчыны — кнігу Ф. Скарыны «Творы» (уступны артыкул, падрыхтоўка тэкстаў, каментарыі, слоўнік А. Коршунава, паказальнікі А. Коршунава і В. Чамярыцкага), толькі што выпушчаную выдавецтвам «Навука і тэхніка». У параўнанні з папярэднім зборнік значна дапоўнены. Па-першае, можна пазнаёміцца з поўным тэкстам пасхаліі, які захаваўся ў адзіным экземпляры «Малой падарожнай кніжкі», што зберагаецца ў Капенгагене. У пашыраным варыянце друкуецца пасляслоўе да Апостала— тут складальнік выкарыстаў экземпляр гэтай Скарынавай кнігі з Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве. Прадстаўлены і два акафісты з акравершамі Ф. Скарыны.

Ранейшыя тэксты таксама вывераны на першакрыніцах. У аснову публікацыі пакладзены найбольш поўны скарынаўскі збор, што знаходзіцца ў Ленінградскай публічнай бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына зроблена выверка і па асобных экземплярах іншых кнігасховішчаў як у нашай краіне, так і за мяжой. Немалаважна і тое, што ў гэтым выданні каменціруюцца біблейскія імёны і геаграфічныя назвы, што сустракаюцца ў творах Ф. Скарыны.

Нагадаем у дадатак, што «Творы» Ф. Скарыны выйшлі ў серыйным афармленні (мастак В. Саўчанка), з выкарыстаннем ілюстрацый і заставак са Скарынаўскіх кніг. Выпушчана кніга пад эгідай Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР.

КАЛІ ЛАСКА— ДАВЕДНІК

Кніга «Францыск Скарына. Жыццё і дзейнасць» у тым жа выдавецтве «Навука і тэхніка» і таксама ў серыйным афармленні выйшла ўжо пад эгідай не толькі акадэмічнага інстытута літаратуры, а і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа АН БССР, Кніжнай палаты СССР. І гэта невыпадкова. Хоць асноўная нагрузка прыпала на складальнікаў (Я. Неміроўскі і А. Осіпчык), спатрэбілася падтрымка навукоўцаў з іншых устаноў. Кніга ж даведачнага характару — паказальнік літаратуры пра Ф. Скарыну.

Жыццё ж і дзейнасць вялікага сына нашага народа здаўна знаходзіцца ў полі зроку даследчыкаў — гісторыкаў, філолагаў, кніга- і мастацтвазнаўцаў. Першадрукару прысвечаны манаграфічныя выданні і юбілейныя зборнікі, асобныя артыкулы і рэцэнзіі на творы, у якіх асэнсоўваецца яго шлях ці творчасць. Колькасць публікацый наблізілася ўжо да 2900 назваў. Часава яны ахопліваюць прамежак з 1539 да 1989 года (зразумела, з'явіліся і новыя публікацыі пасля таго як рукапіс кнігі быў здадзены ў друк, асобныя з іх складальнікі паспелі яшчэ назваць у дадатку).

Работа зроблена вельмі вялікая, хоць, будзем справядлівымі, не на голым месцы. Дарэчы, у прадмове падрабязна расказваецца, як у розны час даследчыкі спрабавалі сістэматызаваць матэрыялы пра Ф. Скарыну. У гэтым жа выданні ўзяты асобныя бібліяграфічныя матэрыялы з Я. Неміроўскага і В. Дышыневіч, з бібліяграфічнай картатэкі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР.

Імянны паказальнік дапамагае лёгка знайсці пэўную скарынаўскую публікацыю асобных аўтараў. Дарэчы, нямала называецца і матэрыялаў, якія ўпершыню ўбачылі свет на старонках «ЛіМа».

А. ВІШНЕЎСКІ.

Марыя ВАЙЦЯШОНАК

НЯБЕСНЫЯ БЕГІ

АПАВЯДАННЕ

ГАРАЧАЯ ВЯСНА. Дамы ў новым мікрараёне зляпіліся, склеіліся, быццам цукеркі-падушачкі ў цёплай дзіцячай кішэньцы, — дзе тут які пад'езд, каторы, з якога боку падысці? Там-сям тычкай стаіць маладое дрэўца са спечанымі пупышкамі. А вось старое вішанне адцвітае на вачах, пэўна, тут недзе быў чыйсьці ўласны дом. Век гэтае вішанне ў канцы агародаў, за хатай, каля самага плота. — белымі карункамі вакол сялібы — падзорнікам. Азірнешся на яго, як на неспадзявана кінутую гаспадаром у спешцы тут, сярод вуліцы, далікатную дамашнюю рэч. Адно тое добра, што хоць будзеш ведаць, выйшаўшы з чужога дома, у які бок ісці да тралейбуса — не зблудзіш, убачыўшы кінутую сялібу.

— Адчыніце, калі ласка, мы тут па аб'яве ў «Вячэрнім Мінску», хацелася б паглядзець секцыю і паліцу для кніг.

На парозе жанчына. Ад скроні па твары нешта прабегла, выгнуўшы брыво, як быцам нехаця адкінуўся тугі зашчап, бліснулі цёмныя вочы. Не, тут яшчэ пакупнікоў не чакалі (рэклама выходзіць па суботах, а мне ўдалося атрымаць адрасы раней).

— Вы цішэй званіце... дзіця ўжо спіць...

Папярэджвае, гаворыць незадаволена, як са старымі знаёмымі, якія ёй даўно надакучылі сваімі доўгімі недалікатнымі званкамі ў дзверы, тупатам, моцнай гаворкай, лямантам, наогул, сваім блізкім суседствам. Быццам мы прыйдзем сюды яшчэ і яшчэ раз. Быццам хоча праз нас папярэдзіць усіх астатніх пакупнікоў, хто прачытае аб'яву ў газеце. Ці, можа, усе, хто тут застаецца дома, у Мінску, ёй ужо на адзін твар? Яна яшчэ не ўяўляе сабе, што будуць званіць і званіць, хадзіць і хадзіць чужыя людзі, будуць стукаць-грукаць, — тэлефон і адрас знойдуць вунь у любым кіёску — як на слупе ўсё роўна вісіць аб'ява: прадаецца імпартная мэбля.

У прыхожую выходзяць дзеці гаспадыні, сын і дачка, амаль дарослыя. Выйшлі нячутна, лёгка, пэўна, блукаючы па пакоях, спыніліся, стаяць, ледзь павярнуўшы ў наш бок галовы, стаяць цесна, хістка абгінаючы адзін аднаго, як маладзенькія дрэўцы. Твары крыху разгубленыя, і самі не ведаюць, навошта яны тутака, на чужыя галасы? Як на вуліцы ўсё роўна, паварочваюцца і ідуць ад нас, — не, здагадваюцца, гэта не госці. Маці ледзь павяла вачыма ў іх бок, і было відаць, што і яна б зараз блукала з імі па пакоях вялікай кватэры, — па-птушынаму збітыя, цесна адзін каля аднаго, як перад вялікім далёкім пералётам. Вядома, у Амерыку.

Не, паліца кніжная вельмі даўгая, не стане ў маёй цеснай кватэры.

Жанчына холадна праводзіць нас да дзвярэй, так і не дараваўшы нам, што так доўга званілі ў дзверы і маглі пабудзіць дзіця. Цокнуў зашчап. Марудзім. «У Амерыку? Назаўсёды?» — падумалася гэтак ці толькі яшчэ сэрца варухнулася з месца, адчуўшы побач каламутнае цячэнне чужой крыві, немірушчай, адчайнай, балючай, бяздомнай у свеце, — як усё роўна па асфальце ідзе. А парог чужога дома падняўся пад самыя грудзі — не пераступіць: так развітвацца назаўсёды няможна. Выпростваецца цела, голас, неяк сумна і ўрачыста: я шчыра жадаю ёй неспадзявана для самой сябе шчаслівай дарогі. Жанчына набожна слухае, падымае цёмныя вочы да столі, пасылаючы, падымаючы маю няўцямную малітву з зямлі да бога. Я міжволі здзівілася такой перамене—гаспадыня надта гатоўна адазвалася на мае словы, быццам, нарэшце, знайшла суду сведку, тую, патрэбную, якая была на яе баку.

Мы выйшлі з дома ўжо смеючыся, праўда, крыху засмучоныя толькі тым, што не выпала-такі купіць, не ўдалося. Толькі з гэтай прычыны было нявесела. Едуць, хай сабе едуць, век ім не сядзіцца.

— Вам тумбу пад тэлевізар? Усё астатняе ўжо прадалі! — крычыць хлопчык ужо з другой кватэры, з другога канца горада, шчэміцца наперад бабулі, — яму, пэўна, спадабалася гандляваць.

Бабуля прымае нас, не выпускаючы з рук работу, невідушча спывае вялікай іголкай, надточвае гумку да ружовага карсетнага пояса, не хаваецца, па-свойску так, яна ўжо звыклася з пакупнікамі, — купяць — не купяць, а некалі час бавіць. Ходзіць, паказвае тое, што засталося прадаць, ходзіць і шые. Сточвае канцы з канцамі, а шво атрымліваецца тоўстае, мулкае. Сточвае канцы свету сваімі непаслухмянымі старымі рукамі — а ўсё сэрцу няміла, пакручвае белай галавой, сама сабе дзівіцца, маўляў, што гэта робіцца на свеце, што нарабілася ў сваім доме? І ніткі не падабраць у магазіне пад ружовае.

Стаяць у другім пакоі скрынкі, свежыя, вялікія, да самай столі, стаяць адзін перад адным, піхаюцца каля іх, чакаюць сваёй чаргі патэльні, чайнікі, місачкі. У адной з іх, эмаліраванай, ляжала нітка жэмчугу. У звычайнай місцы, кухоннай — як фасоля. Быццам толькі што гэты жэмчуг з ракі ці з мора, быццам гаспадыня яго тутака мыла на кухні, перамывала пад кранам.

— Кажу маме: ніхто табе не дазволіць дом у Амерыку перавезці, не збірай усё чыста — не слухае! Адно тое: як жа кінуць? Гэта ж, маўляў, усё нажытае...

Смяецца дачка. Апранута ў сукенку з цёмнага танкога шоўку, наскрозь свіціцца, як праз начное шкло, амаль тэатральны ўбор. Вядома, дзеля так званых «гасцей», пакупнікоў (хоць ужо амаль усё к вечару і раскуплена, але ж людзі яшчэ ідуць і ідуць, тыя, што дамовіліся прыехаць раніцай). А можа, яна прыбралася адумысла на развітанне з домам... Падышла да тумбы пад тэлевізар, абаперлася, рука белая, кожны пазногцік свіціцца, лягла зручна, быццам надоўга, — як на старым здымку, на памяць. За ёй казённым прасцірадлам распіналіся голыя сцены.

— Уяўляеце, мама нават соду бярэ з сабой, пакуецца! Ну, калі ўжо ў Амерыцы не хопіць грошы на соду, тады навошта туды ехаць?

Дачка яшчэ маладая, яна лёгка спадзяецца на лепшае. Ходзіць па пакоях вялікімі крокамі, быццам праз нешта пераступаючы, ужо, пэўна, ад гэтых пярэбараў у вачах выдаецца: вандзэлкі, клункі, вузлы на падлозе.

— Учора, — расказвае, такое было! Заходзіць мужчына, секцыя яму была патрэбна. Мама кажа, што ўжо дамовіліся з людзьмі, на днях забяруць. «Жарт, дамовіліся! А задатак яны вам пакінулі? — пытаецца. — Не? Значыцца, я купляю! Я болей дам! І машына з прычэпам у мяне вунь каля дома стаіць, пагрузімся ўмомант!» Ледзьве яго выправадзілі... Як у чарзе чалавек усё роўна, маўляў, ну і што што займалі, але ж вы тутака не стаялі, не пільнаваліся... Усяго нагледзеліся, наслухаліся. Цікава... Сёння такая бабуля прыходзіла, як у гразі скачаная. Усё нешта выглядала па кутках. Я пасля яе час у ванне нешта ўсё мыла, мыла... Цяпер шкадую: не здагадалася даць бабулі што-небудзь так, без грошай, — яна ж не купляць прыходзіла...

У пакоі насупраць, відаць праз адчыненыя дзверы, сядзяць малыя дзеці. Глядзяць збоку на ўсё, слухаюць ці не. Яны на тахце, як на беразе, яны яшчэ не скрануліся з месца, яны яшчэ нічога не разумеюць, пераезд ім, як гульня.

Трэба ісці, трэба паспець з'ездзіць яшчэ па адным адрасе з рэкламы. І надта ж адкрытыя, надта ж крэўныя людзі, я ўжо ведаю іх імёны: Роза, Ірына Навумаўна, бачыла іх дом, распраданы, пусты, разрушаны, — як у бяду ўступіла іхнюю. Бавімся ля парога, гаворым, гаворым, Ірына Навумаўна кідаецца да вандзэлкаў, лапае пушачку, адчыняе:

— А! Хацела вас пачаставаць! Тут былі журавіны, пакачаныя ў сахары...

Глядзіць разгублена, спачувае, як дзецям, маўляў, шкада, не ўдалося паласавацца.

Які ж гэта быў шчодры дом: улажыць кожнаму што-небудзь у руку, пасаладзіць у роце...

Стаім, як на пероне:

— Не памінайце ліхам... — чамусьці прыйшлі на памяць вось гэтыя старамодныя, ніколі раней не ўжываныя словы. Нешта абрадавараз вітальнае, бы ў чыстым полі, на раздарожжы.

— Што вы! Як можна?! — амаль ускрыквае Ірына Навумаўна. — Тутака ж усё жыццё прайшло...

Бароніцца рукамі, быццам пачула нячутае, невідонае.

«Няволле гэтак казаць», — сказаў бы стары чалавек з маёй вёскі.

А вось дом на праспекце, каля «Бульбянай», ужо ніколі пасля не мінеш, ідучы воддаль, — хоць азірнешся, паглядзіш па-вясковаму на вокны, быццам ён пры адным двары, пры адным гаспадары.

З прыхожай высокія шкляныя дверы ў пакоі. На кожнай шклянцы кветкі — белыя, чырвоныя макі, дзіцячай рукой, круглявыя пялёсткі, круглявае лісце, пляскатае, як абкачанае ў далоньках. Галоўкі вялікія, зазіраюць у прыхожую з усіх бакоў. Малюнкі на сценах, усюды кветкі — дом, як вялікі дзіцячы пакой, дзіцячы свет, быццам разгорнуты сямейны альбом... Як яго вывезці з сабой? Кінуць? А ён жа нікому не патрэбен, акрамя іх. Тут усё, кожную дошку, кожную шклянку трэба адрываць, забіраць у дарогу... Мне гэтыя шклянкі, як папяровыя аркушы, што ветралі калісьці ў нашай вясковай хаце, прыклееныя да сцяны свежым хлебным мякішам. Мае дзіцячыя малюнкі: бух-

---

Васіль СУПРУН

Хмары над краем

Над краем згусціліся хмары.
Парывы вятрыскаў даносяць
Дрыготкія грому удары
І рэхам іх пушчы галосяць.

Яшчэ не залечаны раны
Мінулай вайны і няволі,
А край наўшчэнт здратаваны
Зноў праўды і літасці моліць.

Чаму ж так няўпэўнена моліць!
Чаму так глядзіць падазрона!
— За права ж на лепшую долю
Заплочана кроўю мільёнаў.

І зноў хтось валодае правам.
Другія ж вымольваць павінны.
Няўжо зноў чакаюць расправу
І вера, і доля нявінных!

Слонім. 1946 г.

Пагоня

Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...

Максім БАГДАНОВІЧ.

Зноў белыя коні крывіцкай Пагоні
З гусарамі грознымі ў цемры грымяць.
І край змардаваны, што змучана стогне,
Спрабуе падняцца, свой гонар падняць.

Ад звону мячоў і каваных падковаў
Праклятая цемра бляднее, дрыжыць.
І родная мова, бацькоўскае слова
Праз сметнік чужы прарастае, каб жыць.

Свяціся ж ярчэй, воблік роднай Пагоні!
Народу вярні памяць слаўных вякоў.
Аб волі даўно ссумаваліся гоні
Пад грузам апекі чужых сваякоў.

Грымі ж, разрывай путы ночы шалёнай,
Каб край не ахутваў нахабніцкі цень!
Хай вольна ідуць пад сцягамі калоны,
І новы з зары нараджаецца дзень.

Інта. 1951 г.

Неба чужыны

Чаму так задумана ў неба вяснянае
Моўчкі глядзіш вечарамі, калі
Сэрца юначае, жалем скаванае,
Раптам мацней забаліць!

Можа, ў цяпле гэтых зорак мігаючых,
Што загараюцца ў пастцы нямой,
Бачыш спакой,
І ў душы ўспамінаючы,
Мовіш з Радзімай самой!

Там,
сярод зор,
край чужы пакідаючы,
Воляй святою любуешся ты;
Сэрцам знявечаным горка рыдаючы,
Рвеш ланцугі і драты.

Інта. 1951 г.

Над тундрай

Над тундрай вятрыскі скавычуць,
Дзе вечная мрэ мерзлата;
Нібыта чарцей яны клічуць,
Што з зброяй заселі ў дратах;

Што дзённа і ночна вартуюць
Галодны, зняволены люд,
Сумленне і праўду дратуюць
Наборам рэжымных пакут.

Бы мёртвая зона за дротам.
Шахцёры даўно пад замком,
Умыўшыся здзекам і потам,
Жыццё праклінаюць тайком.

А ў тундры вятрыскі скавычуць
І вечная мрэ мерзлата.
Ахвяры нявінныя лічыць
Магільнік людскі — Варкута.

Варкута. 1955 г.

Праз гады

Між пажоўклых ад часу лістоў
І даўно прызабытага болю,
Праз гады,
у шуфлядзе пустой
Я знайшоў свае вершы з няволі.

І як толькі кранула рука
Гэту пылам пакрытую памяць,
Успамінаў балючых рака
Паласнула, бы снежная замець.

Па-сірочы заныла душа,
Падкасіліся стомаю ногі, —
Прад вачыма са стогнам прайшла
Маладосць... казематы... дарогі...

Слонім. 1987 г.

матыя ружы, паненкі ў капелюшах... Мне здавалася, — яны віселі заўсёды, і тады, калі я ўжо жыла ў горадзе. І раптам пісьмо: хату прадалі на лазню, пераехалі стараваць да сына, у другую вёску... Ноччу спалася цяжка, нічога не снілася, — раніцай уся падушка была мокрая, — як з-пад каменя ішлі слёзы. Лёгка, саламяннем, разляцелася бярвенне, — маё парушанае дзіцячае гняздо, сцёрты знак з зямлі, быццам і не нараджаўся. Увесь час пасля, як у дзяцінстве, быццам сяджу разам з чужымі дзядзькамі і цёткамі на высокай лаве і не дастаю нагамі зямлі. І ссадзіць некаму — нікога ўжо з бацькоў жывога. Дзяцінства — мая планета.

Па той дзень нічога не люблю пераменьваць, выкідваць, абнаўляць — няхай даўніцца маё новае гняздо...

— Вось секцыя. Нам яна надта падабалася. Хацелася б прадаць яе якому-небудзь харошаму чалавеку, — кажа гаспадыня.

Адчыняе шуфляды, дзверцы ніш. Яшчэ яны не слабодныя, дзіцячыя рознакаляровыя калготкі, шкарпэткі дурона паўзуць з паліцы далоў, пішчом шчэмяцца ў дзверцы.

— Вось тут, праўда, драпіна, — паказвае памятліва, амаль балюча, быццам тая драпіна на твары.

Стаіць пасярод пакоя крэсла, яго, пэўна ж, не купілі, бо во відаць вялікая сіняя пляміна. Дачка, тлумачыць гаспадыня, любіць размалёўваць юлёвым, што толькі пад рукі трапіцца. Вунь і фіранку сапсаваную зняла, замыла—поўны таз сіняй вады, кожная рыска юлёвага, як ножка захаладанай пралескі, найпершай кветкі. Гулка ў зале, на шпалерах цёмныя плямы — цені праданай мэблі, рэчаў.

Гаспадыня адчыніла дзверы ў другі пакой, прапануе паглядзець яшчэ кніжную паліцу.

За нізкім столікам насупраць адна адной сядзелі бабуля з маладой дзяўчынай, пэўна, унучкай, вядома ж, размаўлялі. Павярнулі галовы, глядзяць на нас, чужых людзей, спакойна — усё ўжо перажытае, — іх ціхія галасы яшчэ недзе каля самых вуснаў. Такая згода паміж імі, такі спакой на тварах, рукі на століку, ногі, каленькі блізка, быццам дрэва пайшло ў два ствалы, разгалінавалася. Тут яшчэ нічога не чапана, пэўна, каб не патрывожыць бабулю, не пашкодзіць ёй з пераездам, усё будзе распрадавацца ў апошні час, — як толькі дзверы за сабой зачыніць. Стары буфет на кручоных ножках, бы на карачках, адваліўся да сцяны, як на бяседзе вясковай — на прызбе. Гадзіннік на сцяне без шкла, — стары, без акуляраў. Гафтаваныя фіранкі на акне, дробны ўзор белага вішання. Шафа... Я люблю разглядаць у камісійных магазінах старыя ўборы, крэпдэшын мяне хвалюе, бляклы, празрысты, бы мой асабісты сумны ўспамін. Люблю старыя рэчы, мэблю, старыя дрэвы, старых людзей, каля іх я яшчэ малая, шчаслівая, як у дзяцінстве, — на сваёй планеце.

Забіў гадзіннік, бабуля павярнулася да яго, як да блізкага прыяцеля, глядзіць твар у твар, пакуль ён звоніць, слухае, патураючы, ківае галавой, развітваючыся з кожнай хвілінай часу. Уся абсыпаная вясёлым маркім рабаціннем, бы толькі што ў хату з малінніку. І званы мне бавяць не пра вечнае — гэта брыгадзір стукае каменем у рэйку, ззывае баб у поле, злуецца. Толькі пасля ляп-ляп дзверы, дыбаюць босыя ногі па вуліцы. Анікога з дарослых у вёсцы, ну цяперака самая пара шкоду зрабіць — абарваць зелянькі ў садзе...

Ужо стоячы ў прыхожай, замнога глынуўшы найсаладзейшага на свеце дамашняга чаду, раптам разумею, што гэта са мной дзеляцца, разлучаюцца. Гэта ад мяне едуць упрочкі. З майго дому. Расчыніліся дзверы, вокны, і ўжо не зачыняюцца, ідуць і ідуць у мой дом чужыя людзі, вачыма ўсё па сценах, па сценах, шукаюць сабе патрэбнае, таргуюцца.

— Чаму едзеце? — пытаюся ў гаспадыні з правам любові да гэтых людзей, да гэтых сцен.

— Пераехаць, што пагарэць... Але ж я тут жыла, як без скуры. Бы ў Хрыста, век камянямі кідаюць, — неспадзявана шчыра жаліцца яна. — А мне ж дык толькі адно жадаецца: каб і тая зямля стала такой дарагой, як гэта... Нічога болей...

Такое ў яе спытаць трэба было вочы пазычыўшы... Тутака сам часцей ходзіш дамоў, як кажуць, агародамі, каб на вуліцы не перанялі, звыкла абмінаеш, на ўсё выбачаючы, — век, як у сямейнай свары. Якое ж дзіва...

Гаварыла яна не помсліва, але і не надта спадзеючыся на лепшае — абы, маўляў, нядобрага суседа, злосніка памяняць. Ейная дарога падалася мне кароткай, лёгкай, уся на момант перад вачыма, бы гэта калясьмі ў кірмашовы дзень, — нябесныя бегі.

Пахаладала рэзка, кажуць, пэўна, недзе птушаня з гнязда звалілася і замерзла. Белым-белым шляком ад лесу займаўся снег. Ужо белыя барозны, ужо і грады зраўняліся з белым полем, поле з небам. Там, бачу, стаіць на ганку чалавек, там стаіць, і там... Выйшаў з хаты самы пільны гаспадар, сыплецца яму на голаў — не зважае. Каб мог, дык і плячом захінуў бы зямлю — ужо ж многае ўзышло, — загіне самае далікатнае. са слабым каранём. Стаіць, каб не адлучыцца ад зямлі ў бядзе, не кінуць яе сам-насам. Моўчкі стаяць, нерухома, як у жалобе, усе на адзін твар — стаіць па вёсках суровая варта.

— Ну як, ці купіла ж сабе мэблю? Цяперака такая пара, што з'язджаюць у Амерыку, як ніколі, лягчэй напытаць... — пытаецца нехта з іх.

Я махаю рукой, маўляў, потым раскажу, — спяшаюся на аўтобус, у горад. Няўцямна разумею, што зноў буду шукаць рэкламу, буду ездзіць па адрасах, можа, толькі дзеля таго, каб паспець развітацца.

З майго ж дому едуць. Са мной разлучаюцца...



Фотаэцюд М. БЯЛЬКОВІЧА.

СТРУНЫ І ДУША

Пра дакументальны фільм «Гудзёлка»

«Гэта фільм-прытча аб існасці чалавечага жыцця, аб сапраўдных каштоўнасцях і дабрачыннасці. Перад намі праходзіць адзін дзень з жыцця старых сялян, з заўсёдным клопатам, з турботамі і цяжкасцямі хутарскога побыту і прыгажосцю нетаропкага быцця», — цытую анатацыю.

Адно мяне, бадай, крыху збянтэжыла — галоўны цітр: «Гудзёлка». Нешта не зусім па-беларуску? І музыказнаўства (энцыклапедычнае) таксама абмінае гэты тэрмін? Толькі слоўнік Даля сведчыць, што на Тульшчыне-Разаншчыне «гудзёлкамі» завуць дуду, гудок ды скрыпку... А за кадрам фільма, лейтматывам, пастаянна, ціха-ціха — нейкае далёкае гудзенне. Пчолкі? Скрыпкі, бубны і цымбалы? Галасы? Стары ўглядаецца ў прастору, хоча «іх» убачыць, хоча дачакацца. Вось «яны» мацнеюць, набліжаюцца, вось-вось, здаецца, з'явяцца сюды: вяселле? хрэсьбіны? хаўтуры? Але — міма, міма. Зноў — ні рою і ні рэю. А стары чакае. Зноў чакае. Пасвячы на ўзлеску козы. Стоячы каленямі на раллі. Наладжваючы перастройку на цымбалах... Быццам чуецца Купалаў верш «На прызбе», у якім той дзед «імклівай думкай ўдаль бяжыць: як жыў, жыве, як будзе жыць»...

Экранны час, экранны гук, экранная прастора — катэгорыі адносныя. За паўгадзіны (усяго за паўгадзіны!) пражываеш цэлую эпоху. Ад вытокаў чалавечага жыцця да скону. Ад вытокаў — тых, якія апяваў Купала, творачы сваю паэму-рэквіем «Яна і я». Да скону — бо ў «Гудзёлцы» на працягу трыццаці мінут паэзія сялянскага жыцця канае, чэзне, гасне. Дажывуць яны — апошнія «яна і я» — і скончыцца Купалаў рэквіем. Трагічны эпілог.

Мо назвай фільма рэжысёр Адольф Канеўскі вызначае жанр? А мо нагадвае пра тое, што літоўцы, нашыя суседзі, звалі нас калісьці — гудамі ці гудасамі?

Фільм — бястэкставы. І толькі пад канец, калі старая ляжа спаць, стары раскажа шэраму кату пра свой салдацкі ордэн Славы, пра палонных немцаў ды пра тое, як забараніў аднавайскоўцу забіваць іх.

— Ты паняў ці не?

Кот шмыгане кудысьці.

— Тожа хітрае жывотнае, — заўважыць дзед і, ладзячы цымбалы-гуды, ён пачне тлумачыць, дзе ў іх «першая душа» і дзе «другая», і дзеля чаго яны («каб струны ім грудзей не асадзілі»). Стоп. Адкуль жа аналогія з Купалавай паэзіяй?

Мы блаславілі неба воблік сіні,
Што нашы думкі ўзносіў да сябе,
І ў думках кланяліся той часіне,
Што нас злучала ў шчасці і ў жальбе.

Жыццё, зямлю і сонца блаславілі,
Старыя грушы, вербы на мяжы,
І праклінаілі толькі скону хвілі
І тыя вечныя па нас крыжы.

Фільм — дакумент. Усё ў ім — самае сапраўднае, без ценю і намёку на інсцэнізацыю. Падгледжана. Угледжана. Разгледжана. Жывое. Перажытае. Аджытае. Усё як мае быць. Як ёсць. З затоеным трымценнем неўсвядомленай здагадкі: не, не так яно павінна быць!

А як?

Паміж «здагадкай» і «загадкай» — боль народны. Адабранасць лёсу. Бо не тое ім было наканавана лёсам — хутару, сялібе. Тым калёсам, у якія ўпрогся ён, угнуўшыся, а баба ззаду, і абодва пнуцца ў знемажэнні, везучы на поле гной. Даўжэзным планам запаволеная панарама кінакамеры самотна назірае ўслед, і адчуваеш нешта жудаснае, невыносна прыкрае ад дышля, асядланага нагамі бабы, быццам ён яе працяў наскрозь, як пожаг — колішнюю перапёлачку.

Так станам песцячысь яе прыгожым,
Ідзём, ідзём з загона на загон,
Дзе перш араць, дзе сеяць перш — варожым...

Раскладаюць гной. Ашчадна. Зграбна. Шчыльна. Дываном.

Багата мы з табою маем гоняў..

Дзе ж яно багата — нейкі лапік, як таму кату, а скрозь, куды ні глянь — былое поле і былыя гоні з можным дзірваном.

Калі стары пілаваў бярозу, калі нёс дамоў калоду, рыхтаваў свае свярдзёлкі, думалася, што ў фінале фільма ён пачне рабіць цымбалы, новыя. І ён іх робіць. Але побач ёсць яшчэ адны — фабрычныя, з палопанымі, дыбам, струнамі, — яму прынеслі іх лячыць. Ён кажа:

— Гасударсцвенныя.

З-за чаго палопаліся? Бо:

— Душы рабіць не ўмеюць. Ім яшчэ многа хлеба трэба з'есці, каб яны наўчыліся.

Дзед кажа — толькі пра цымбалы?

— А цяжкія, брат ты мой... Хай іх халера... Трэба так рабіць, каб струны толька ад грудзей не датыкаліся-ігралі... Тады будзе звук...

Каму ён гэта кажа? «Хітраму жывотнаму» — кату пад хвост? Каму паказвае сагнутым пальцам на знявечаныя «грудзі», на загнаны гук «душы»? Каму тлумачыць, як «гэтыя самыя (фабрычныя цымбалы) можна перадзелаць», і тады — «...дык палавіна звука знойдзецца»?

Адказ — каму? — знайшоўся ў дзень, калі ўзяўся я за гэтыя радкі. Тэлефануе рэжысёр: за тыдзень па Цэнтральным тэлебачанні трансліруюць «Гудзёлку» трэці раз. Каму — народным дэпутатам СССР, якія менавіта ў той тыдзень гэтак болесна шукалі выйсця — што рабіць з уласнасцю (дзяржаўнай) і з зямлёй (дзяржаўнай!)?.. Мо стары падкажа ім? Ды толькі — ці пачуюць? Хай бы гэтую «Гудзёлку» паказалі ім — на сесіі.

Дзед прызнаецца напаслед:

— Яшчэ калі вучыўся, тожа дурны быў. Зрабілі адны гуслі тоўстыя і струны высака, звук цягне... у сярэдзіну, а вось наверх — ні чорта не бывае. А я — дагадаўся. Што ж... В чом дзела...

Тэкст (закадрава-сінхронны) я працытаваў, бадай, увесь. Кантэкст — не паддаецца цытаванню. Бо не працытуеш, як агонь у грубцы дзячыць бабчыным рукам за смачны пачастунак — чысценькія беленькія стружкі. Бо не працытуеш смаку малака, якое п'юць старыя. Водару бярозавага гаю, што ўваходзіць разам з імі ў хату. Сіні неба. Глыбі студні. Самае галоўнае — не паддаецца цытаванню глыб душы старога і старой. Дзесяцігоддзямі ствараўся «новы чалавечы тып» — мы з вамі. Мітуслівa-агрэсіўны палахліва-безразважны, самаўпэўнена - бадзёры і ліслівa-помслівы. Залежны. Як сказаў бы дзед з «Гудзёлкі» — «гасударсцвенны». Яна і ён — не «гасударсцвенныя». Не ліслівыя, не мітуслівыя, не палахлівыя. Неперс-пек-тыў-ныя! Як удалося ім застацца ў межах тыпу «колішняга чалавека»?

Фільм падказвае «здагадку», неаднойчы, як каму. Магчыма, нехта «здагадаецца», убачыўшы, як баба ахінае рушнікам ікону: з імі — Бог. Хай будзе так (па шчырасці, я пакрывіў душой, сказаўшы, што няма ні ценю, ні намёку на інсцэнізацыю, бо эпізод з іконай — інсцэнізаваны, гэта «не падгледжана»). Камусьці западзе ў душу сталярня дзедава, ягоная слясарня, асабліва — кузня. Бог ты мой! Ён, як Гефест ці нават дагефестаў даантычны прашчур з бронзавага веку, у напаўдзікунскай яміне, распальвае, падтрымлівае свой аднаасобніцкі, «паганскі» горан, свой «падпольніцкі» агонь... Увесь у справе. Толькі ў справе. Ні табе «народнага кантролю» ні кіношнікаў, ні падганял, ні алілуйшчыкаў. СТАРЫ І ГОРАН. Аддамо належнае і кінааператару: Рыгор Масальскі, захаваўшы «кінадакумент», без аніякай там «схаванай камеры», стварыў насычаны паэтыкай партрэт «старога тыпу чалавека». Асабліва ўразіў эпізод хады старога на каленях. На каленях! Сімвал? Ці метафара? Вядома. Але ж... Столькі павазіўшы (на сабе!), паваяваўшы, столькі адхадзіўшы, — ногі дзедавы баляць. Праз тое і нашыў ён наканеннікі, ды не абы з чаго, са скуры, каб, калі неўмагату, хадзіць вось гэтак. Гэтак ён і крочыць з яміны-нізіны, на бугор, насустрач даўняму-далёкаму гудзенню-галашэнню, водгуллю пражытых-перажытых колішніх «вялікіх пераломаў». Гэтак і спыніўся...

Адзін з апошніх планаў фільма — дзедавы цымбалы, буйны план, з ініцыяламі і датай: «1988 г. Т. М. П.» Расшыфроўваецца крыптаграма так: Такушэвіч Максім Пятровіч з хутара Сакоўшчына на Маладзечаншчыне. А «Гудзёлка» — гэта дзедава мясцовая мянушка. Так яго клічуць суседзі з навакольных вёсак за ягоны адмысловы талент: носам выробляе гукі ці не ўсіх музычных інструментаў...

Георгій КОЛАС.

Ганарар аўтар просіць пералічыць Беларускаму Таварыству аховы прыроды на рахунак 700507 Мінскага аддзялення Жылсацбанка.

Дзве думкі пра спектакль Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Вар'яцкае жыццё»

НЯЛЮДСКАЕ ЖЫЦЦЁ

Сардэчныя недаўменні свае мы звыкла выдаём жартаўлівасцю, якая нікога не палохае. Але калі зазірнуць за яе, то ўбачым, што за нашы заўчасныя, ці запозненыя, ці незапатрабаваныя таленты чамусьці робіцца гэтак жа хваравіта няёмка, як, напрыклад, за таго чэхаўскага героя, які спачатку назбіраў мільён марак, а потым як зручней на іх лёг і застрэліўся. Я цалкам разумею розныя пачуцці і думкі з гэтай прычыны, носьбіты якіх называюць іх «здаровымі». «Во дурань», — чую я поўны такога самага здаровага аптымізму і бясконцай веры ў Чалавека голас горкаўскага Саціна, — «дурань дурнем! якую калекцыю сапсаваў! Не, каб збоку легчы!» Вось так, людцы, і жывём — з талентамі, што з'явіліся ў гэты свет немаведама на што і дрэнчацца самі, і кпяць з дурнотнага дрэнчання адных і са шкадавання, глупстваў, звягаў другіх.

Пра такіх людзей драматург С. Злотнікаў напісаў п'есу «Дурное жыццё», а рэжысёр А. Андросік паставіў па ёй спектакль «Вар'яцкае жыццё». Бачыў, магчыма, нейкае істотнае адрозненне паміж гэтымі толькі на першы погляд сінанімічнымі вызначэннямі. Што да мяне, то я прынцыповай розніцы паміж абедзвюма назвамі не бачу. Хіба што «Вар'яцкае жыццё» пабеларуску гучыць лепш, смачней — амаль гэтак жа, як «Дурацкая жизнь» па-руску.

Трэба сказаць, што гэты спектакль з'яўляецца адным з тых рэдкіх спектакляў, якія прыносяць задавальненне сваёй рэжысёрскай пабудовай — і грунтоўнасцю апавядання, і надзіва арганічным сплучэннем драматычнага аповяду з музыкай, і мантажом падрабязна і разнастайна распрацаваных сцэн. Вызначае спектакль і высокая тэхнічная культура, і адмаўленне ад традыцыйнага побытавага існавання ў некаторых сцэнах, і пошук новых сродкаў выразнасці, і арэчаўленая метафарычнасць таго, што некалькі дзесяцігоддзяў назад было б заклеймёна як «недапушчальныя фармалістычныя выкрутасы». Спектакль у многім падобны на галоўнага героя п'есы — дзівакаватага прарока, адкрыцці якога яшчэ чакаюць свайго часу.

У п'есе чатыры дзейныя асобы. Злотнікаў расказаў нам пра дзівака, які з глузду з'ехаў... на выратаванні чалавецтва; пра дзіўную жонку дзівака, што паціху вар'яцее ад самоты; пра прадстаўніка Улады — хама і гвалтаўніка, што траха не сканаў ад белай гарачкі; пра пані лёгкіх паводзін, дзіўнасць якой таксама можна растлумачыць прычынамі псіхіятрычнага толку. Як бачыце, — каманда досыць дастойная...

Чаму ж у гэтым спектаклі непрызнаны геній Жолуд не заваяваў прыза глядацкіх сімпатый? Ён жа, дзівак, вынаходнік, наватар, даследчык глыбіняў космасу і іх уплыву на тэктанічную дзейнасць Зямлі, з першага свайго з'яўлення на сцэне больш падобны на запойнага п'яніцу, сляпога, апантанага сабой і сваімі ідэямі чалавека, чым на ўзорнага, абезаблічанага савецкага грамадзяніна. Да таго ж ён не заўважае, дый не жадае заўважаць пакут іншых людзей, і ў першую чаргу — блізкіх. Магчыма, менавіта першая сцэна з жонкай пазбаўляе Жолуда абаяльнасці яго правобразаў — і прарокаў, якія не прызнаюцца сваёй айчынаю, і Дон Кіхота, які здзяйсняе ў імя высокай мэты свае забаўныя подзвігі. Маральная слепата, цвёрдасць, што даходзіць да жорсткасці, зацыкленасць на сваіх праблемах, цяжкая істэрычнасць, якая лёгка пераходзіць у дыктатуру ўласных жаданняў і памкненняў, размова на павышаных танах — усё гэта, на жаль, пераважвае чалавечую абаяльнасць акцёра А. Падабеда і яго персанажа.

Нежаданне лічыцца з інтарэсамі жонкі дасць аб сабе знаць і далей, напрыклад, тады, калі наш прарок, паспрабаваўшы заступіцца за абражаны, зняслаўлены гонар жонкі, раптам знойдзе, зразумее, што яе крыўдзіцель — той Вялікі чалавек, якога ён доўга чакаў, ад якога залежыць не толькі выратаванне вялікага горада ад разбуральнага землятруса, але і ягоны, Жолуда, асабісты лёс, лёс яго нікому не патрэбнага таленту. І гэта будзе даволі, каб забыцца— тут сама! адразу ж! — і на крыўду жонкі, і на ўсе неверагодныя падзеі, што здарыліся гэтай наччу. Адзінае, на што забудзецца наш герой, дык гэта пераапрануцца, каб прадстаць перад Уплывовай Асобай у гарнітуры і гальштуку. Гэтая лёкайская рысачка не толькі пераважвае стаіцызм няўдачлівага героя, але і пераводзіць яго самога з галоўных дзейных асоб у асобу, лёс якой робіцца, на жаль, нецікавым. Можна было б, як мне здаецца, абудзіць спачуванне да яго ў трэцяй карціне, якая цяпер выглядае другім фіналам спектакля, калі б Жолуд раптам зразумеў усю меру сваёй віны перад жонкай. Аднак менавіта тут мы канчаткова расчароўваемся, — магчыма, ад таго, што яму не ўдалося прачнуцца ад сваёй унутранай, маральнай, душэўнай летаргіі, калі ён сустракаецца са сваёй жонкай, якая вярнулася з вар'ятні...

Д'ябальская, неўласцівая тэатру — і мастацтву ў цэлым — абыякавасць адольвае нас, — і з палёгкай, нават з нейкай радасцю сустракаеш знікненне-гібель Жолуда: маўляў, дзякуй Богу, даўно б так! А на сэрцы — нібыта камень застаўся: штосьці не так, штосьці не тое з намі, гледачамі, адбываецца, ці ж можна заставацца ў тэатры абыякавым да лёсу чалавека?! Аказваецца — можна. Шкада, што і на гэтым спектаклі.

Гісторыі, пра якія гаварыў Феліні, відаць, уяўляюць сабой не толькі і не столькі пералік апісаных драматургамі падзей, але, перш за ўсё, наша душэўнае, кранальнае разуменне герояў і іх руху ў спектаклі ці ў фільме. Як гэта ні страшна, але для нас, людцаў, мала сказаць: «Вось так забілі чалавека!», каб знутры нас узнікла хоць бы збянтэжанасць ад уласнай абыякавасці. Мы глядзім: а якога там чалавека забіваюць? І калі не ўзнікае спачування, калі не ўзнікае суперажывання, то з'яўляецца... цікаўнасць: а ці цікава забіваюць? І яшчэ больш жахліва: ці прыгожа? У Козінцава ў «Гамлеце» быў такі жахліва прыгожы план: па прыгожа зарослай водарасцямі рацэ прыгожа плыве нябожчыца-прыгажуня Афелія. Не можа, не павінен труп быць прыгожым! Смерць — можа, труп — не. Іначай пакуты чалавека ператвараюцца ў смешнае дзумканне заціснутай ў кулаку мухі, а мастацтва перастае быць чалавечным, ператвараючыся ў погляд іншапланецянаў з мноствам апошнім часам лятаючых талерак. Жолуд таксама пакідае нас прыгожа: ён адыходзіць да свайго зорнага свету, хаваючыся за святлом электрапрыбора, які асляпляе глядзельную залу. Быў з намі — і пакінуў нас, прыгожа і элегантна. Рэжысёрская метафара ясная і зразумелая, але з яе дзіўным чынам знік чалавечы змест.

Змястоўны зрух у спектаклі істотным чынам адбіўся і на ўспрыманні дзейных асоб, пра што крыху ўжо гаварылася вышэй, і на матывах таго, што адбываецца, і на жанравай цэласнасці спектакля. Дзейныя асобы нібыта прыйшлі ў яго з п'ес розных тэатральных школ, напрамкаў і эпох: адны — з высокай трагедыі, другія — з бытавой камедыі, трэція — з псіхалагічнай драмы. У гэтым, хутчэй за ўсё, была і задума рэжысёра: жыццё шырэйшае за светапоглядныя ўстаноўкі, яно часта нібы выпадкова сутыкае нас, такіх розных, такіх учарашніх і заўтрашніх, у адзінае, непарыўнае цэлае. Аднак пры гэтым, пэўна, трэба было б правесці, устанавіць адзіны для ўсіх акцёраў спосаб існавання ў ролі, у спектаклі. Стылёвая рознагалосіца выглядае дысанансам, асабліва ярка яна праявілася ў работах Н. Качатковай і Т. Пузіноўскай. Качаткова прыкідваецца такой ужо бесшабашнай, капусніцка-вясёлай, мы радуемся яе ўдалым знаходкам і эксцэнтрычным выбрыкам, аднак ні на секунду не забываем, што гэта — акцёрскае прытворства, і адбываецца гэта, можа, таму, што побач з ёю жыве без прытворства гераіня Т. Пузіноўскай. Падабенства гэтага супрацьпастаўлення можна знайсці і ў работах А. Падабеда і В. Давыдзька.



Старшыня гарвыканкома, якога іграе Г. Давыдзька, з'яўляецца на сцэне ўлукаткі: яго вывозяць. Глядач у нас п'яных вельмі любіць, — яны заўсёды такія смешныя, такія забаўныя — як малыя дзеці. І многія акцёры вельмі любяць іграць п'яных: па-першае, гэта ўдзячны матэрыял для прад'яўлення сваіх акцёрскіх здольнасцей, падругое, — стопрацэнтная гарантыя глядацкіх сімпатый. П'янаму многае даруецца. Гэта крымінальны кодэкс да яго суровы, а гледачы — больш пабалаўлівыя. Ну і што, калі п'яны на сцэне некага згвалціў альбо сіліўся гэта зрабіць? Гэта ж не са злосці, без намеру, а так, па п'янцы. Тым больш, што і паненка не вельмі і супраціўлялася. Праўда, потым яна чамусьці заклікае свайго мужа пакараць гвалтаўніка. Але гэта, відаць, ад нерваў, — надта ўжо нервовая паненка трапілася. Я знарок злёгку ўтрыравана пераказаў вельмі істотны вузел спектакля—для таго, каб выявіць некалькі важных звенняў тэатральнай гісторыі. Але галоўнае захаваў дакладна — дух таго, што адбываецца, сэнс таго, што ўспрымаецца. Вядома, калі б такое здарылася з намі ў жыцці — было б не да смеху. А на спектаклі мы дабрадушна смяёмся. Таму што гэта — тэатр, а не жыццё. Таму што многае тут — знарочыстае. Але чамусьці, з нейкай няўмольнай паслядоўнасцю, і ўсё істотнае, сэнсавае, змястоўнае ў гэтым спектаклі таксама ператвараецца ў тэатральную гульню ці, калі хочаце, у тэатралізаваную праўду. Некаму гэта можа не спадабацца, у другой частцы пошук новых тэатральных формаў выклікае ў гледачоў бурны энтузіязм. Мне здаецца самым значным, што гэты пошук, нягледзячы на агульны крызіс тэатра, усё ж ідзе і набывае, магчыма і не самыя дасканалыя формы, але, безумоўна, яны прываблiваюць і заслугоўваюць добрай увагі. Выдаткі на шляху спасціжэння форм тэатра непазбежныя, і яны не павінны нікога расчароўваць. Цяпер, калі ў краіне марудна, з рыпеннем, але ўсё ж ствараюцца перадумовы для дастойнага чалавека жыцця, паступова будуць з'яўляцца ўмовы для рэалізацыі незакліканых у сённяшні свет талентаў, у тым ліку і таленту прарока Жолуда. І можа, наша дурнотнае, вар'яцкае жыццё яшчэ пры нас набудзе яснасць і здаровы сэнс.

Уладзімір НЯЛІДАЎ.

ПАРАДОКСЫ ВЫЖЫВАННЯ

Існуе псіхалагічны феномен: калі ведаеш нешта жудаснае, небяспечнае, дык... нібыта і не ведаеш гэтага. Робіш усё, каб выкінуць з галавы, забыцца, не памятаць. Так зручней, так спакайней, каб не звіхнуцца, каб выжыць... можа, гэта толькі з намі за апошнія дзесяцігоддзі генетычна зрабілася, а можа, — з усім чалавецтвам?... Але не хочам мы бачыць, што гінуць рэкі і моры, што не толькі плады зямлі, але нават сам іх водар стае атрутай, не хочам ведаць пра нітраты, бо што тады есці, не хочам чуць пра радыяцыю, бо як тады жыць... І не любім прарокаў, празарліўцаў, якія адкрываюць нам бездані небяспекі, імкнуцца нас выратаваць.

А менавіта такі празарлівец — галоўны герой спектакля купалаўцаў «Вар'яцкае жыццё» (п'еса С. Злотнікава).

Мушу адразу адзначыць, што па-руску п'еса называецца «Дурацкая жизнь». Паняцце гэтае больш простае, і куртатае. На сцэне ж, створаная рэжысёрам Андрэем Андросікам, пануе фантасмагорыя менавіта «Вар'яцкага жыцця». Яно і смешнае, і кранальнае, у ім шмат да болю знаёмага і яно ж уздымаецца да вяршынь біблейскае прыпавесці.

У п'есе галоўны герой, беспрацоўны фізік са смешным прозвішчам Уладзімір Жолуд, можа здавацца і дзіваком, і крышачку вар'ятам; у спектаклі рэжысёр А. Андросік і мастак С. Антонаў адразу паказваюць нам, што ён — геній, таму што мы бачым, як працуе Жолуд, якімі пакутамі аплачвае свае адкрыцці: хударлявы да празрыстасці, напалову аголены, распінае ён сябе на крыжы сваіх трапецый, парабал, адвесаў, і б'юць у яго ці маланкі, ці токі высокага напружання, і сам ён свеціцца, вібрыруе і курчыцца ў пакутах, пакуль не загарыцца ў яго на далоні, як пунсовая кветка, далёкі сігнал з космасу і не зваліцца ён, знясілены, на карту свету, па якой разлічвае месцы катаклізмаў. Спяшаецца ён папярэдзіць людзей, выратаваць, рассылае «вар'яцкія» тэлеграмы, выпрошваючы на іх у жонкі апошнія грошы...

Ён прадказаў землятрус у Мексіцы, ён прадбачыў катастрофу ў Арменіі, але ніхто не чуе яго, ніхто не дае яму веры!

Тут, у кватэры Жолуда, якая зусім не падобная на чалавечае жытло, а, хутчэй, нагадвае лабараторыю, і адбываецца ўсё дзеянне спектакля. Тут сыходзяцца ўсе чатыры дзейныя асобы, нашы сучаснікі і амаль міфалагічныя постаці: пакутнік і празарлівец Жолуд (А. Падабед), жанчына з талентам кахання, яго жонка Маша (Т. Пузіноўская), вясёлая блудніца (Н. Качаткова) і Увасабленне Улады (А. Гарцуеў).

Тут адбываюцца з імі падзеі адначасова трагічныя і фарсавыя. Тут віртуозна з'яднаны рэжысёрам квартэт правядзе нас праз найскладаную партытуру настрояў — ад смеху і спачування да ўзрушанасці і жаху.

На нашых вачах адбываецца анатаміраванне немагчымасці паразумецца! І сама атмасфера неразумення павісае і робіцца амаль фізічна адчувальнай з той самай хвіліны, калі мэра далёкага горада Новацяперска Роберта Кузьміча Кулебу, п'янага да непрытомнасці, як бярвяно ўкатвае на іклатай магазіннай тачцы ў пакой Жалудоў крыклівая і вульгарная Люся. З гэтага імгнення ўсё тут будзе перавернута дагары нагамі.

Саміх гаспадароў — безабаронных, бязмежна тактоўных, якія ў адказ на самае дзікунскае хамства толькі і могуць прашаптаць: «Гэта не інтэлігентна» — абвінавацяць у здрадзе, рабаўніцтве, крадзяжы.

Былы загадчык гаража Кулеба абсалютна ўпэўнены, што добрай працай з шафярнёй давёў сваё права кіраваць горадам з амаль чвэрцьмільённым насельніцтвам, а гэта вось выратавальнік замінае яму сваімі тэлеграмамі і папярэджаннямі.

Стваральнікі спектакля дэманструюць нам, што ў гэтых людзей сапраўды няма нічога агульнага; што стаяць паміж імі недавер, страх і нянавісць. Усё ў нашым свеце неяк скранулася са сваіх месцаў. Бо настаўніца Маша сарамліва лічыць, колькі танных піражкоў можа з'есці, каб дажыць да зарплаты, а блудніца Люська за вечар з Кулебам бярэ трыста рублёў...

Уладзімір Андрэевіч Жолуд парушэнні маральных і прычынных сувязяў, людскую азлобленасць, усеагульнае хамства разумее як пачатак апакаліпсіса і не разумее, чаму людзі змірыліся з ролямі ахвяр, чаму стаяць у чарзе па рыбу, а не па выратаванне. Каб не бачыць усяго гэтага — глупства, злабы, дзікунства, галечы, каб мець магчымасць працаваць, — ён зачыняе вокны і дзверы ў сваім доме.

А Кулеба — плоць ад плоці таго, што адбываецца за вокнамі. Ён п'е як усе, як усе лаецца. У яго непарушная сістэма жыццёвых арыенціраў. Ён ведае, што высокія словы людзі балбочуць, каб ашукаць адзін аднаго; што ўсё начальства — белая косць — свалата; што дэпутацкі значок даражэйшы за чалавечае жыццё і што там, наверсе, не любяць турбавацца. А тут такі клопат — перасяляць цэлы горад, гэта ж... колькі думаць, колькі працаваць, якія грошы патрэб-

ныя! Не! Трэба, каб вучоныя абверглі глупствы Жолуда і выдалі паперку: яны сваім аўтарытэтам што хочаш могуць прыкрыць — і паварот паўночных рэк, і небяспечнасць атамных рэактараў, і межы радыёактыўных выпраменьванняў. Ім відней. Атрымаўшы такую «даведку», Кулеба можа далей спакойна будаваць у сваім горадзе «светлую будучыню» і пляваць на словы Жолуда, што без веры, без сэнсу, без любові і спачування не будзе ніякай светлай будучыні.

Дарэчы, гэтаму «пляваць» знойдзена яркае пластычнае ўвасабленне. Кулеба носіць у кішэні семкі сланечніка і ахвотна вучыць, як зберагчы асабісты спакой і пляваць — на Еўропу, потым на Амерыку, на ўсіх і ўсё.

Ён нават па-свойму мілы, гэты хам Кулеба. Аляксандр Гарцуеў у гэтай ролі ўзнімаецца да высокага мастацкага абагульнення.

Як кантрастуе з ім адухоўлены, фанатычны, натхнёны твар Жолуда! Лічу, што прызначэнне на гэтую ролю заслужанага артыста БССР А. Падабеда шмат у чым паспрыяла поспеху спектакля. На мой погляд, гэта лепшая работа акцёра апошніх гадоў.

Чаму гаворачы аб поспеху акцёраў, я вяртаюся да рэжысёра? Таму што Андросік умее знайсці ў акцёры зусім неспадзяванае. Успамінаю, як некалі ўразіў мяне лірычнымі глыбінямі, трапяткой пяшчотнасцю ў «Безыменнай зорцы» дагэтуль заўсёды сухаваты і сацыяльны Фама Варанецкі, якой нечаканай была Лілія Давідовіч у «Шрамах». І зараз, аддаючы належнае і стрыманай трагічнасці Т. Пузіноўскай, і вынаходліваму гумару Н. Качатковай, я разумею, колькі тут ад рэжысёра.

Гэта рэжысёр узняў квартэт сваіх аднадумцаў на такую натхнёную і таленавітую працу. Гэта ён зрабіў на рэдкасць дакладныя купюры ў п'есе. Гэта ён з тактам і вялікім густам схаваў ад нас і жаночую бойку, і спробу гвалту за высокай скуранай канапай. Гэта пабыўшы ў ягоных руках, бібліятэчныя драбіны ператварыліся ў трыбуну і клетку, куды заганяе Жолуда Кулеба. Гэта ён віртуозна ўмее карыстацца сцэнічнай метафарай. Яго мастацкія паралелі красамоўныя і зразумелыя. Таксама як у змрочным круглым сусвеце акварыума носяцца нямыя рыбы, таксама кругамі, як зачараваныя б'юцца аб сцены пакоя людзі... І няма выйсця, і не стае моцы галасоў, бо калі цябе не чуюць, ты ўсё адно як нямы...

Гэта рэжысёр з'яднаў сваіх аднадумцаў на грамадскі ўчынак — стварэнне такога спектакля.

Я ўвесь час кажу пра квартэт акцёраў таму, што другі выканаўца ролі Кулебы, Г. Давыдзька, на мой погляд, празмерна захапіўся камедыйнымі магчымасцямі ролі і не ўзняўся да такога ўзроўню мастацкага абагульнення, якога дасягнуў у гэтай ролі А. Гарцуеў.

«Вар'яцкае жыццё» — гэта сапраўднае вялікае і выпакутаванае дасягненне купалаўцаў. І таму не хочацца, каб былі ў гэтым сур'ёзным творы такія танныя «штучкі», як маналог аб будаўніцтве камунізму са зваротамі да плюшавага мішкі...

Недарэчным здаецца, што сваю скаргу на невыносное жыццё Маша адрасуе не Богу, не ўсяму сусвету, не самой сабе, а чалавеку, які яе толькі што ледзь не згвалціў. Але гэтыя дробязі заўважаюцца пасля другога і трэцяга прагляду. Пасля першага, узрушаны, думаеш пра ўласнае жыццё, пра тое, як дайшоў да яго...

А яшчэ ўвесь час стаіць перад маімі вачыма выступленне Андрэя Дзмітрыевіча Сахарава на з'ездзе народных дэпутатаў: як стаяў ён адзін супраць агрэсіўнай большасці залы, як хваляваўся і даводзіў сваё, такое зразумелае... Як тонкі голас яго зрываўся... Не пачулі...

Зараз спектакль «Вар'яцкае жыццё» перанеслі на вялікую сцэну і, значыць, пабольшае людзей у зале. Мо, пабольшае і тых, хто зразумее, хто пачуе?..

Мая ГАРЭЦКАЯ.

З пошты аддзела музыкі

СВЯТА НЕ ЎДАЛОСЯ

На жаль, адразу даводзіцца канстатаваць такі сумны факт, хоць той канцэрт мог зрабіцца сапраўдным святам для музычнай грамадскасці Гродна. Бо ў праграме гучалі творы кампазітараў, чый творчы шлях так ці інакш звязаны з Гродзеншчынай.

Свята планавалася вялікае, з прыездам саміх аўтараў, што ператварала звычайны канцэрт у цікавую творчую сустрэчу, своеасаблівую справаздачу перад землякамі, перад роднай старонкай. Але...

Пачалося з таго, што не надта ўмяшчальная зала педагагічнага вучылішча, дзе адбываўся канцэрт, была запоўнена меней чым напалову. Хоць былі аб'явы ў мясцовых газетах, былі няхай сціплыя, але ўсё ж афішы. Гэтага аказалася недастаткова. Успамінаю нядаўняе выступленне ў Гродне камернага аркестра з ФРГ — тады была поўная зала. І публіку прывабіла не толькі замежнае паходжанне артыстаў, адчувалася яшчэ і добра накіраваная праца ў галіне рэкламы, распаўсюджвання білетаў і да т. п. Значыць, можам арганізаваць, калі захочам! Чаму ж не хочам, ці не можам, калі прыязджаюць свае?

А ў згаданым выпадку былі не проста свае, а зусім ужо «нашы», «тутэйшыя», гродзенскія...

Праўда, калі быць шчырымі, віна за няўдалае свята кладзецца не толькі на нас, гродзенцаў, якія не выказалі належнай цікавасці да творчасці землякоў. Канешне, сумна, што слухачоў не зацікавілі ні афішы, ні анонсы ў друку, ні папулярныя прозвішчы В. Войціка, Л. Захлеўнага, В. Іванова, Э. Казачкова, У. Кандрусевіча, ні жаданне зноў сустрэцца з талентам А. Бандарэнкі ці адкрыць для сябе маладых С. Багданава, В. Жывалеўскага, М. Калешку, ні нават заклік да міласэрнасці — канцэрт жа быў дабрачынны, і надзіва сціплы збор ад яго павінен быў пайсці ў фонд дапамогі дзецям-сіротам Гродзеншчыны.

Аднак дзеля справядлівасці скажу, што тыя нешматлікія патрыёты-меламаны, якія ўсё ж прыйшлі, напэўна, чаканага задавальнення не атрымалі. Адчуванне непрадуманасці, недастатковай падрыхтаванасці ўсяго канцэрта, за рэдкім выключэннем, не пакідала ні на хвіліну. Складвалася ўражанне, што ўсё гэта не планавалася загадзя і старанна (як меркавалася), а ўзнікала часам проста на сцэне, у апошні момант, быццам джазавая імправізацыя.

Літаральна няпярэдадні канцэрта, высветлілася, што не прыедзе вядучая-музыказнаўца Р. Аладава, і праграму давялося «ратаваць» С. Калчанавай. Не выпадала ўдзельнічаць у канцэрце В. Жывалеўскаму, і ягоныя «Варыяцыі ў старадаўнім стылі на тэмы беларускіх народных песень» выканаў У. Захараў (добра, яны ў рэпертуары гітарыста). Перад самым канцэртам аказалася, што з намечаных п'ес Э. Казачкова падрыхтавана толькі адна (прэлюдыя для фартэпіяна, якую сыграў І. Брускін), а песні Л. Захлеўнага ўвогуле не падрыхтаваныя. У выніку скласці якое-небудзь уражанне пра музыку гэтых кампазітараў было даволі цяжка. Прынамсі, Э. Казачкова слухачы маглі хоць пабачыць, а вось Л. Захлеўны не прыехаў зусім. Як і В. Іваноў, два творы якога — «Адажыо» і «Танец» выканалі В. Вашкевіч (цымбалы) і В. Герашчанка (фартэпіяна).

У трохі лепшым становішчы выглядалі перад землякамі В. Войцік, які прадставіў на іх суд «Тры гумарэскі» для цымбалаў і фартэпіяна (В. Вашкевіч — В. Герашчанка) і «Арыету» для віяланчэлі і фартэпіяна (М. Пескіна — Л. Нікіціна) і У. Кандрусевіч, які сыграў некалькі музычных фрагментаў з балета «Крылы памяці», кінафільма «Плач перапёлкі» і спектакля «Вар'яцкае жыццё». Аднак і яны, здаецца, выбралі не самае лепшае са сваіх дасягненняў. Канешне, шмат чаго залежыць ад розных аб'ектыўных цяжкасцей, напрыклад, ад пошуку выканаўцаў і г. д. Але ўсё ж такі...

Няхай мяне абвінавацяць у асабістай зацікаўленасці ці ў нейкім мясцовым патрыятызме, але, па шчырасці, больш сур'ёзна да канцэрта паставіліся кампазітары-гродзенцы. І калі сціслась гучання «Міні-ронда» М. Калешкі для альта і фартэпіяна (А. Целяпнёў — Л. Нікіціна) ускладняе магчымасць зрабіць якія-небудзь высновы ці даць ацэнку — усё, напэўна, яшчэ наперадзе ў маладога аўтара, дык С. Багданаў і А. Бандарэнка былі прадстаўлены даволі ярка. Спявак Ф. Куніцкі выканаў разгорнуты вакальны цыкл А. Бандарэнкі на словы М. Рубцова «Ціхая мая Радзіма» (партыя фартэпіяна Л. Нікіціна), які ўжо гучаў у Гродне на адным з аўтарскіх вечароў кампазітара і, думаецца, палюбіўся прыхільнікам ягонай творчасці. А вось «Поліфанічная саната» С. Багданава (у аўтарскім выкананні) упершыню прагучала ў горадзе. Напісаная ў сучаснай манеры, няпростай музычнай мовай, але ясная па форме і яркая па змесце, яна, ўпэўнены, зрабіла вельмі добрае ўражанне на слухачоў.

Свята ў цэлым не ўдалося, і не толькі з-за адсутнасці публікі. Вядома, ёсць віна і абласной філармоніі, якая ўзялася за арганізацыю гэтага цікавага мерапрыемства, якое, на жаль, не сталася падзеяй у культурным жыцці Гродна (а магло б стацца!). Ніякай цікавасці да канцэрта не выказалі кіраўнікі культуры як горада, так і вобласці: урэшце, няўжо гэта не ўваходзіць у іхнюю кампетэнцыю?

Ну і, канешне, не ў лепшым свеце паказаўся Саюз кампазітараў Беларусі, бо ўся ініцыятыва, ідэя канцэрта зыходзілі ад яго, але да канца на належным узроўні справа даведзена не была. Не хочацца думаць, што ў саюзе марылі толькі пра «птушачку» ў плане работы. Сёння ж шмат і шчыра гаворыцца пра тое, каб актывізаваць жыццё «правінцыі», наблізіць яе да сталіцы. Але, на жаль, далей за размовы справа амаль не ідзе. Шкада...

Аляксей САЛАДУХІН.

г. Гродна.

ЗДЫМКАМ — ПАЎСТАГОДДЗЯ

50 гадоў таму ў Маскве прайшла першая Дэкада беларускага мастацтва. У Цэнтральным дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў БССР захоўваюцца фотаздымкі і кадры кінахронікі, якія распавядаюць пра тыя незабыўныя чэрвеньскія дні 1940 года. Тут і мітынг, што адбыўся на Беларускім вакзале ў сувязі з прыездам артыстаў нашых тэатраў, і выступленне ўдзельнікаў Дэкады на маскоўскіх падмостках і на ВДНГ СССР, і ўзнагароджанне пасланцоў Беларусі...

Сёння мы маем права больш аб'ектыўна меркаваць пра тэматычную скіраванасць Дэкады, аднак пры ўсім тым, узіраючыся ў гістарычныя кадры (асабліва кінахронікі), нельга не адзначыць талент і майстэрства артыстаў.

А. ЖЫВІЦКАЯ,
заг. аддзела
ЦДАКФФД БССР.

Група артыстаў БДТ-І; сустрэча на Беларускім вакзале.

Калгаснікі вёскі Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна Баранавіцкай вобласці (выступленне на ВДНГ СССР).

Пад час музычных кансультацый Дэкады: у цэнтры А. Няжданава, побач справа Н. Галаванаў, першы і другі злева — дзеячы беларускага мастацтва І. Мусін і А. Багатыроў.

Сярод імёнаў выкладчыкаў, якія садзейнічалі станаўленню і росквіту Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, ганаровае месца займае імя лаўрэата Усесаюзнага конкурсу прафесара Міхаіла Гальдштэйна. Сёлета яму споўнілася б 80...

ВЫСОКАЕ СЛУЖЭННЕ

Каля трыццаці гадоў жыцця аддаў ён беларускаму скрыпічнаму мастацтву. Выхаванец славутай школы П. Сталярскага, ён прадаўжаў традыцыі высокага прафесіяналізму як сродку глыбокага спасціжэння і ўвасаблення задумы твора, традыцыі не толькі выхавання навыкаў віртуознай ігры, але і развіцця музычнага кругагляду, фарміравання інтэлекту, чалавечнасці, эмацыянальнай чуласці, артыстызму вучня.

Не было ніводнай хоць крыху адметнай музычнай падзеі, на якую б Міхаіл Маркавіч не адгукнуўся — ці то канцэртамі класа, ці то сваімі сольнымі выступленнямі. І ўсё гэта рабілася з вялікай любоўю, — прыгожа, святочна, — пачынаючы ад афіш і канцэртных праграм і канчаючы афармленнем сцэны (асабліва да юбілейных дат Баха, Бетховена, Паганіні, Крэйслера...). Нават знешні выгляд студэнтаў быў прадметам клопатаў Міхаіла Маркавіча. («Вы — артысты. Помніце, — вас не толькі слухаюць, на вас яшчэ і глядзяць»). Сам ён быў заўсёды падцягнуты, элегантны.

А яшчэ ў яго было цудоўнае пачуццё гумару. Жартаваў заўсёды добразычліва, і на яго ніхто не крыўдзіўся. Трапны жарт на ўроку даваў магчымасць студэнту ўбачыць свой недахоп нібыта збоку, дапамагаў зразумець і выправіць памылку. Дарэчы, працуючы над творам у класе, Міхаіл Маркавіч дамагаўся ад выхаванцаў яснай, усвядомленай ігры. Многа і ахвотна паказваў. Калі быў задаволены кемлівасцю вучня, з радасцю паўтараў: «Ну, вось, ну, вось». На ўроках ніколі не павышаў голасу. Калі ігра студэнта яго не задавальняла, не тое каб злаваў, а хутчэй засмучаўся: як можна не захапіцца гэтай музыкай? Сам жа зараджаў усіх сваёй захопленасцю, апантанасцю. Гэта дапамагала асэнсаваць цяжкую працу музыканта не як сумную будзённшчыну, а як высокае служэнне Мастацтву.

А працаваць М. Гальдштэйн умеў як ніхто. У першыя гады яго працы ў кансерваторыі, напрыклад, лічыліся звычайнымі начныя рэпетыцыі — да экзаменаў, канцэртаў. Дня для заняткаў ужо не хапала. Даводзілася, вядома, нялёгка. Але вось парадокс: цяпер чамусьці з асаблівай цеплынёй успамінаюцца тыя начныя рэпетыцыі, калі мы па апусцелых вуліцах горада разыходзіліся па дамах у 5—6 гадзін раніцы (а здаралася, і начавалі ў кансерваторыі). Гэта тыя самыя «ахвяры», якіх патрабуе Мастацтва і без якіх яно не можа існаваць.

Ніколі і ніхто ў кансерваторыі (на маёй памяці) не іграў так многа і з такой аддачай, як М. Гальдштэйн. Лаўрэат Усесаюзнага конкурсу скрыпачоў, у мінулым саліст «Масканцэрта», удзельнік франтавых брыгад, — ён жыў у атмасферы выканальніцтва, як рыба жыве ў вадзе. Асабліва ўдаваліся яму скрыпічныя мініяцюры (якія гучаць цяпер, на жаль, вельмі рэдка). Ён быў энтузіястам камернай музыкі. Дастаткова ўспомніць арганізаваны ім і з яго ўдзелам цыкл з 4-х канцэртаў «Скрыпічныя творы І.-С. Баха», яго выкананне цыкла «10 санат для скрыпкі і фартэпіяна Бетховена» і г. д., і г. д. Ён улюбляўся ў кожны твор, які даводзілася іграць самому ці праходзіць са студэнтамі ў класе. Ствараласяўражанне, што той ці іншы кампазітар не толькі аб'ект ягонага пакланення, але і лепшы асабісты сябра. Пра музыку Міхаіл Маркавіч гаварыў са слязамі на вачах — такія слёзы дорага каштуюць.

Для мяне асабіста работа ў класе М. Гальдштэйна была сапраўдным універсітэтам. Як канцэртмайстар я прайшла ў яго школу прафесійнага майстэрства. Ён часта дапамагаў мне парадай, выхоўваў клапатліва, ды тактоўна. Лепшыя вучні Міхаіла Маркавіча, а іх многа, — заўсёды былі яго сябрамі і аднадумцамі.

Міхаіл Маркавіч страсна любіў жыццё, магчыма, таму ён так баяўся старасці. Ён баяўся недайграць, недалюбіць, ён спяшаўся атрымаць асалоду ад мастацтва.

Чэхаў пісаў: «Памірае ў чалавеку толькі тое, што паддаецца нашым пяці пачуццям, а тое, што надзвычай высока і знаходзіцца па-за гэтымі пачуццямі, застаецца жыць». Застаецца жыць прыклад самаадданага, «без страху і папроку», служэння Мастацтву...

С. БЯЛЬКЕВІЧ,
дацэнт БДК.

ЗАКАЗ — НЕ ЎКАЗ

З «круглага стала» «ЛіМа» і прэс-службы Міністэрства культуры БССР

Сёння ідзе пошук новай мадэлі клубнай установы. На працягу доўгага часу ў ёй усталявалася заганная структура, запанаваў шаблон у правядзенні мерапрыемстваў, яны дыктаваліся кіраўніцтвам, «гаспадарамі» клубных устаноў, а не былі праяўленнем ініцыятывы саміх клубных работнікаў. Вымагаюць перагляду адносіны да культуры і саміх органаў культуры, а таксама мясцовых Саветаў і грамадскіх арганізацый.

У кантэксце пошуку найбольш эфектыўных форм работы ў новых умовах і праходзіла гутарка за «круглым сталом», якую правялі аддзел народнай творчасці і культасветработы штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» і прэс-служба Міністэрства культуры БССР.

У гутарцы прынялі ўдзел: начальнік эканамічнага ўпраўлення Міністэрства культуры БССР К. ПАТОЦКІ і начальнік упраўлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Т. СТРУЖЭЦКІ, дырэктар Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра культуры А. ЛЯГЕНЧАНКА, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкома З. ЛЫСЕНКА, загадчык кафедры культасветработы і мастацтва Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры кандыдат мастацтвазнаўства У. РОШЧЫН, загадчык аддзела культуры Маладзечанскага райвыканкома І. ПЯТКЕВІЧ, загадчык аддзела культуры Смаргонскага райвыканкома С. ЛАЗАР, дырэктар Магілёўскага абласнога навукова - метадычнага цэнтра А. КУКШЫНСКІ, начальнік эканамічнага аддзела ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкома В. КАНАШ, дырэктар Пастаўскага РДК М. ТРЫКАЗЕНКА, дырэктар Брылёўскага СДК Магілёўскага раёна М. ЯЦКОЎ, дырэктар Вішнёўскага СДК Смаргонскага раёна А. ДЫРО, дырэктар Нова-Дворацкага цэнтральнага СДК Мінскага раёна Т. МАКАВЕЦКАЯ.

Прапануем увазе чытачоў «ЛіМа» фрагменты гутаркі, якая тычылася пераважна пытанняў, звязаных з укараненнем у практыку работы культасветустаноў сацыяльна-творчага заказу.

Т. Стружэцкі: — Сёння ўстановы культуры маюць патрэбу ў большай арганізацыйнай самастойнасці. Прыйшла пара памяняць адносіны да іх, і перш за ўсё з боку мясцовых партыйных і савецкіх органаў, кіраўнікоў гаспадарак. Гэтага вымагае ўкараненне новых эканамічных метадаў гаспадарання. Наша першапачатковая задача — усімі сродкамі фарміраваць новыя мадэлі ўстаноў культуры, у тым ліку і эксперыментальныя, спрыяць таму, каб гэты працэс не затухаў, набываў развіццё і пашырэнне.

На першы план выходзіць сацыяльна - творчы заказ. Але варта зразумець, што сацыяльна-творчы заказ і платныя паслугі — розныя рэчы. Розныя рэчы, без сумнення, сацыяльна-творчы заказ у вёсцы і горадзе, у апошнім магчымасцей для яго ўкаранення значна больш, ёсць тут ужо і пэўны вопыт. Скажам, у канцы мінулага года Віцебскі гарадскі цэнтр культуры і адпачынку па заказу аддзела культуры правёў прадстаўленні на многіх пляцоўках горада.

Сацыяльна - творчыя заказы з'яўляюцца эканамічным метадам ўпраўлення культурна-асветніцкай дзейнасцю. Яны могуць давацца ўстановам культуры выканкомамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў і органамі культуры. Фарміруюцца яны з улікам прыярытэтных мясцовых праграм сацыяльна-культурнага развіцця і заключаюць у сабе розныя мерапрыемствы, арганізацыю работы гурткоў, секцый, клубаў і інш. Пры невыкананні ўстановамі культуры дагаворных абавязкаў выдзеленая плата змяншаецца ці дагавор можа быць ануляваны. Далей — болей: сацыяльна - творчыя заказы могуць фарміравацца і на конкурснай аснове, што будзе вымагаць ад устаноў культуры творчасці і актыўнасці. Усё гэта патрабуе адмаўлення ад стэрэатыпаў у рабоце і саміх кіраўнікоў устаноў культуры, многія з якіх прывыклі працаваць пад штодзённы дыктат аддзела культуры або сакратара райкома партыі.

С. Лазар: — Для мяне сацыяльна-творчы заказ пакуль што рэч толькі тэарэтычная. Зрэшты, мо таму, што ўсё новае мы неяк прымаем насцярожана. Раней нас запэўнівалі: дзе камерцыя, там знікае творчасць. Такі падыход быў, ды і цяпер яшчэ ў многіх застаўся да платных паслуг. А пераканаліся, што менавіта з імі паявілася магчымасць і пашыраць круг мерапрыемстваў, і знаходзіць сродкі для аплаты і даплаты кіраўнікам розных аматарскіх фарміраванняў.

Я чула пра сацыяльна-творчы заказ у інстытуце павышэння кваліфікацыі і на семінары, які праводзіўся ў ВПШ. Шмат аб ім спрачаліся, але па-ранейшаму ўяўленне аб ім даволі цьмянае. Ці дапаможа ён клубам? І наогул, чаму клубы пустуюць? Можа, таму, што такі заказ не паступае ад саміх людзей? Пачалі праводзіць на Гродзеншчыне, да прыкладу, святы рамёстваў. Да іх праяўляецца вялікая цікавасць, яны масавыя, бо самі людзі з'яўляюцца, фактычна, і рэжысёрамі, і іх актыўнымі ўдзельнікамі.

Хто робіць сацыяльна-творчы заказ у раёне? Каму ён адрасаваны і хто яго выконвае? Пакуль што адказу на такія пытанні не маюць ні культработнікі, ні супрацоўнікі райвыканкомаў і гарвыканкомаў.

А. Лягенчанка: — Нельга весці размову пра сацыяльна-творчы заказ адасоблена ад наспеўшых агульных праблем культуры. Такі заказ не можа быць самамэтай, толькі магчымасцю атрымання дадатковых сродкаў, у цэнтры ўвагі павінен быць прыярытэт духоўнага пачатку.

З разуменнем гэтага і трэба пераасэнсоўваць дзейнасць устаноў культуры, іх задач і магчымасцяў. І адна з іх нам бачыцца менавіта ў больш смелым укараненні сацыяльна-творчага заказу. І ў гэтым кантэксце — вызначэнне месца метадычных службаў, якія сёння, акрамя рэспубліканскай і абласной, ствараюцца ва ўсіх гарадах і раёнах. Перабудову дзейнасці ўстаноў культуры і метадычных службаў стымулюе пераход на новыя ўмовы гаспадарання, і тут значэнне сацыяльна-творчага заказу неаспрэчнае.

Т. Стружэцкі: — Вядома, пытанняў вакол сацыяльна - творчага заказу ўзнікае нямала. Пакуль што ні ў рэспубліцы, ні ў раёнах няма для яго спецыяльных фондаў. Само па сабе пытанне няпростае. Што рабіць? Ад чаго танцаваць? Сацыяльна - творчы заказ — прэрагатыва, скажам, выканкома Савета, з ім мы павінны весці перагаворы. А калі ён не захоча даваць заказ? Як яго ўгаварыць? Многае тут будзе залежаць і ад культуры самога кіраўніка выканкома...

У. Рошчын: — Важным уяўляецца новае разуменне сацыяльна-творчага заказу ў культурна - асветніцкай рабоце. Калі раней ён быў дырэктывай партыйнага кіраўніцтва ці задання кіраўнікоў гаспадарак, то цяпер гэта — сацыяльны заказ з адпаведным матэрыяльна-эканамічным стымуляваннем. Авалоданне новымі аспектамі яго эфектыўнасці патрабуе ад работнікаў культуры і новых ведаў, у тым ліку эканамічных, бо, як тут ужо адзначалася, установы культуры ў бліжэйшы час пройдуць на новыя ўмовы гаспадарання. У сувязі з гэтым у нашым інстытуце перагледжваюцца праграмы навучання. Адводзім у іх месца вывучэнню аспектаў сацыяльна-творчага заказу, які разумеецца не як новая форма размеркавання бюджэтных асігнаванняў на культуру, а як магчымасць лепшага матэрыяльнага забеспячэння культуры і заахвочвання культработнікаў за добрую працу.

Новая форма работы — гэта вынік дэмакратызацыі нашай культуры, якая адлюстроўвае змены ва ўсёй сацыяльнай сферы. На жаль, перабудова ў культуры яшчэ не дайшла да ўсіх сельскіх раёнаў. Неяк у складзе журы Мінскага абласнога агляду народных тэатраў мне давялося пабываць у Старадарожскім РДК. П'еса «Жалезная заслона», якую паставіў мясцовы народны тэатр, успрымаецца раённым кіраўніцтвам як падрыў яго аўтарытэту, а вось запушчанасць і жабрацтва самога РДК іх не турбуе. Разам з тым сцэнарый урачыстага сходу, прысвечанага Дню 8 Сакавіка, узгадняўся і карэкціраваўся тут аж 4 разы! Вось вам і абяцаная свабода дзейнасці, вось вам, як лёгка працаваць нашым культасветработнікам на вёсцы.

З. Лысенка: — Колькі я памятаю, мы шукаем выйсця са складанага становішча ў галіне культуры, ды час ідзе, а нічога не мяняецца. Як кажуць, пасядзелі, пагаварылі, разышліся, і ўсё засталося па-старому. Адносіны да культуры на самай справе недзе на ўзроўні, так бы мовіць, 17-га года. «Культура ў гаспадарцы—справа дзесятая!»—спакойна заяўляюць кіраўнікі многіх калгасаў і саўгасаў. І ніхто не можа іх паправіць, быццам так і павінна быць.

Дзеля чаго я ўсё гэта гавару? Для таго, каб паказаць, што сацыяльна - творчы заказ у культуры — справа не простая.

А. Кукшынскі: — Пры нашым цэнтры створаны кааператыў, і мы выконваем у пэўным сэнсе сацыяльна - творчы заказ. Як я разумею гэтую з'яву? Сацыяльны — значыцца камусьці патрэбны, творчы — маецца на ўвазе пошук розных відаў паслуг, і заказ — значыцца дагаворныя абумоўленасці, за якія прадугледжана аплата. Летась мы такім чынам зарабілі 51 тысячу рублёў. Значыцца, наша дапамога патрэбна.

Вядома, грошы трэба ўкладваць у аднаўленне і развіццё нашай культурнай спадчыны, народных промыслаў, нацыянальнай мастацкай творчасці. Тут можа быць і стварэнне на гэтыя тэмы відэафільмаў, што мы і робім, і арганізацыя школ маладых ганчароў, і аўкцыёна для продажу твораў народных умельцаў і інш.

Мы звычайна выходзім на ўпраўленне культуры, выяўляем, якія заданні, задачы на год могуць яны нам даць. А потым вядзём перагаворы з раёнамі. Яны звяртаюцца са сваімі заказамі, у тым ліку і на падрыхтоўку спецыялістаў для традыцыйных свят, арганізацыю правядзення іх і інш.

Ці трэба калгасу плаціць грошы сваёй клубнай установе, іншым фарміраванням культуры і мастацтва? Я сказаў бы так: за добрае — плаціць, за дрэннае — не трэба. Праўда, жыць нам вельмі і вельмі няпроста.

> **У XII пяцігодцы ўдзельная вага расходаў на культуру знізілася ў агульным аб'ёме бюджэту БССР з 0,92 да 0,78 працэнта. Гэта адзін з самых нізкіх паказчыкаў па краіне. Месячны заробак культасветработнікаў складае 107 рублёў пры сярэднемесячным рэспубліканскім заробку 234 рублі.**

М. Трыказенка: — Што замінае рабоце клубных устаноў, у прыватнасці, нашага РДК, мне асабіста? Найперш абмежаванасць дзейнасці, абмежаванасць ініцыятывы, творчасці. Аддзел культуры аддаваць нам фінансы не хоча, спецрахунак не адкрывае, кіраўніцтва раёна загадвае праводзіць тое ці іншае мерапрыемства. Фактычна мы, клубныя работнікі, пасыльныя хлопчыкі. Наш РДК мяркуецца перавесці на новыя ўмовы гаспадарання. Але калі адносіны не зменяцца, упэўнены, грошы за сацыяльна-творчы заказ зноў будуць паступаць у райаддзел культуры, а не нам. Нават за пракат касцюмаў для самадзейнасці ці правядзенне тэатральных прадстаўленняў грошы браць мы не маем права. Выклікаюць і кажуць: «Даць касцюмы!»

А. Лягенчанка: — Дарогу ініцыятыве і творчасці дасць адыход ад звыклых адміністрацыйна-камандных абмежаванняў. Ён жа паспрыяе і правядзенню тых мерапрыемстваў, якія сапраўды патрэбны насельніцтву, на якія яно само ці праз праўленне калгаса, дырэкцыю саўгаса, прадпрыемства дае заказ.

Менавіта пры такой сістэме ствараецца магчымасць канцэнтрацыі намаганняў на некалькіх найбольш важкіх, на нашу думку, накірунках. Важнейшы — адраджэнне, захаванне і распаўсюджанне традыцый мясцовай культуры. Апошнім часам больш мэтанакіравана сталі вырашацца пытанні стварэння матэрыяльнай асновы фальклору. Так, на базе фальклорнага цэнтра прайшлі ўжо рэспубліканскія святы фальктору «Матчына песня», у Доме літаратара завяршыліся «Вечары аўтэнтычнага фальклору», у якіх прымалі ўдзел калектывы ўсіх абласцей, паўсюдна прайшлі вясновыя каляндарныя святы. Пэўныя зрухі наглядаюцца ў адраджэнні народнага мастацтва і мастацкіх промыслаў, аб чым сведчыць сёлетняя выстава «Ганчарны круг» у Палацы мастацтваў.

Вось я і думаю — якім павінен быць творчы заказ на ўсе гэтыя мерапрыемствы? І зноў жа, трэба вызначыць — хто такі заказ будзе даваць і выконваць?

Другі напрамак — развіццё мастацка-творчых здольнасцей людзей, дапамога і падтрымка ўсіх відаў аматарскай дзейнасці. І зноў жа, трэба агульнымі намаганнямі вырашыць, якія формы сацыяльна - творчага заказа могуць набыць працэсы, што адбываюцца ў аматарскім руху.

К. Патоцкі: — Час усім нам зразумець адно: сацыяльна-творчы заказ — параджэнне новага гаспадарчага механізму, які пачынае сваё жыццё ў рэспубліцы. Дзяржаўным бюджэтам устаноўлены мінімальныя дзяржаўныя сродкі на культуру, а заказ дасць дадатковы даход для матэрыяльнага паляпшэння жыцця і дзейнасці ўстаноў культуры, для іх пераходу на большую эканамічную самастойнасць.

Буйныя сацыяльна-творчыя заказы мэтазгодна выдаваць установам, прадпрыемствам і арганізацыям на конкурснай аснове. Кошт работ, якія выконваюцца па такім заказе, устанаўліваецца па дамоўленасці між заказчыкам і выканаўцамі з улікам усіх выдаткаў, якія звязаны з правядзеннем мерапрыемстваў, работ і паслуг.

М. Яцкоў: — Прыходзім у Дом культуры з ідэямі. А зачапіцца няма за што. Ператвараешся ў хлапчука на падхопе —зрабі тое, намалюй гэта. Безумоўна, патрэбны грошы. Выйсцем і для творчай дзейнасці, і для матэрыяльнай базы можа стаць сацыяльна - творчы заказ. Але толькі самафінансаванне можа загубіць, так бы мовіць, сельскую культуру. Лічу ўтопіяй замену такім шляхам дзяржаўнага фінансавання. Сельскія ўстановы культуры не могуць існаваць на ўласныя заробкі.

Чаму выстройваюцца чэргі ў крамы за гарэлкай і няма чаргі ля ўваходу ў сельскі Дом культуры? Сацыяльнае пераабсталяванне вёскі — вось падмурак для нармальнай работы ўстаноў культуры.

> **Сёння ў рэспубліцы 490 клубных устаноў патрабуюць капітальнага рамонту, а 90 з іх знаходзяцца ў аварыйным стане, трэцяя частка размяшчаецца ў прыстасаваных будынках, больш як 60 працэнтаў клубаў не маюць пакояў для гуртковай работы. Не выконваецца праграма па ўводу раённых дамоў культуры і клубаў на вёсцы: з 21 запланаванага РДК пабудавалі толькі 9. Менш чым на адну трэць забяспечваюцца ўстановы культуры музычнымі інструментамі.**

А. Дыро: — Наш калгас «Савецкая Беларусь» — адзін з самых вялікіх у раёне, на яго тэрыторыі пяць клубных устаноў. Як да нас адносяцца? Мне прызначана калгасная даплата 100 рублёў у месяц. Можа, таму, што я і мастак, і выконваю розныя іншыя даручэнні. З другога боку, за намі, клубнымі работнікамі, замацаваны пастаянныя зямельныя ўчасткі, якія мы павінны апрацоўваць — як і ўсе іншыя калгаснікі.

Думаю, што сацыяльна-творчы заказ павінен знайсці пэўнае месца і ў сельскай мясцовасці. Тут многае залежыць ад кіраўніка гаспадаркі, ад сакратара партарганізацыі, ад старшыні сельскага Савета. Важна, наколькі яны любяць культуру, наколькі самі маюць патрэбу ў ёй, як адносяцца да яе. Наш старшыня Мікалай Андрэевіч Шыш разумее, што «без песні людзі не могуць». Гэта азначае, што і нам лягчэй працаваць. Без фінансавай падтрымкі калгаса мы проста не маглі б працаваць.

В. Канаш: — Я эканаміст, і разумею, што сацыяльна-творчы заказ — катэгорыя эканамічная. Мэта заказу — удзячная: дапамагчы ўстановам культуры матэрыяльна. Але ён тады напоўніцца сэнсам, калі будзе існаваць звыш бюджэтных асігнаванняў.

І. Пяткевіч: — Рэальны падыход прымушае нас улічваць існуючую мадэль клуба. Гэта і павінна вызначаць сацыяльна-творчы заказ.

Культура ўсё ж такі ў нас дзяржаўная справа, а не прыватны промысел. Яна павінна фінансавацца дзяржавай. Доўга, на мой погляд, зацягваецца рашэнне прыняцця закона аб культуры.

У свой час стаўка была зроблена на сацыяльна-культурныя комплексы. Многія з іх цяпер у заняпадзе, разваліваюцца. Галоўная праблема застаецца ранейшая — у людзей адсутнічае патрэба ў культуры. Ці дае магчымасць вырашаць гэтую праблему ўкараненне сацыяльна-творчага заказу? У мяне асабіста ўсё гэта пакідае ўражанне камерцыялізацыі нашай работы. А камерцыйны падыход да культуры непрымальны.

Т. Макавецкая: — Як я разумею, у некаторых клубных работнікаў сацыяльна-творчы заказ выклікае яшчэ сумненне. У нас іх няма. Для Мінскага раёна такія формы прымальныя. Можа, на гэта ўздзейнічае блізкасць сталіцы рэспублікі з яе творчымі магчымасцямі, калі і нам прапаноўваюць свае паслугі розныя мастацкія калектывы на дагаворных пачатках.

На жаль, людзям не заўсёды патрэбны гэтыя паслугі. Ні вышэйшаму звяну — кіраўнікам саўгасаў, ні ніжэйшаму, як кажуць, спажыўцу.

Нашу краіну не без падстаў называюць краінай эксперыментаў. За семдзесят апошніх гадоў пастаянныя эксперыменты праводзіліся ў эканоміцы, сельскай гаспадарцы і прамысловасці. І калі ў гэтых галінах народнай гаспадаркі эксперыменты не заўсёды сябе апраўдвалі, і гэта мы праз нейкі час прызнавалі, то на памылках эксперыментаў у культуры мы ўвагі не акцэнтавалі, яны ўспрымаліся спакойна.

Цяпер вось на чарзе новы эксперымент: сацыяльна-творчы заказ. Які будзе яго вынік! Прыжывецца яна, гэтая новая форма работы ўстаноў культуры! Прымуць яе, скажам, кіраўнікі гаспадарак — добра, а не прымуць — культасветработнік заказу не даб'ецца. Ёсць і яшчэ адзін момант. Добра, калі сацыяльна-творчы заказ з работнікамі культуры заключаць людзі цікавыя, арыгінальныя, сапраўды таленавітыя. А калі не! Кажуць, той, хто плаціць грошы, заказвае і музыку, і гэтага права ў яго ніхто не адбярэ.

Усё ж хочацца спадзявацца, што сацыяльна-творчы заказ можа з'явіцца эфектыўным сродкам для карэнных змен дзейнасці ўстаноў культуры, паляпшэння якасці іх работы.

Б. ПЕРНІКАЎ,
В. ЛАПЦІК.

Думка чытача

КАЛІ ВЕЦЕР СЦЯГ РАЗГОРНЕ...

Бел-чырвона-белы сцяг... Калі і адкуль ён узляўся? Яго прыхільнікі сцвярджаюць, што ён існуе з даўнейшых часоў і «ўдзельнічаў» яшчэ ў Грунвальдскай бітве. Тыя ж, хто ставяцца да яго варожа, лічаць, што ў такім выглядзе ён узнік не раней 1917 года. Спрэчка вакол сцяга вядзецца прынцыповая, і справа тут не ў тэрмінах. Сёння ў рэспубліцы за адным і другім пунктам гледжання стаяць розныя палітычныя сілы. Беларускі народны фронт шануе гэты сцяг як нашу гістарычную каштоўнасць, нацыянальную святыню. Партыйнае кіраўніцтва, наадварот, — крытыкуе тых, хто адносіцца да яго з павагай. На той падставе, што сцягам нібыта карысталіся «буржуазныя нацыяналісты ды здраднікі беларускага народа».

Не магу казаць пра ўзрост бел-чырвона-белага сцяга, таму што сам даведаўся аб яго існаванні, як і большасць з беларусаў, нядаўна. (Вучылі мяне на гісторыка тады, калі ў нас не вывучалі гісторыю нашага народа). Таму не маю права й асуджаць запар усіх, хто схіляў галовы перад гэтым сцягам. Мы ведаем пра тых людзей вельмі мала. За што яны змагаліся? Злачынцы яны ці ахвяры? Хто каму здрадзіў і ў імя чаго? Тым больш, мы даведваемся зараз аб такіх справах з боку «сваіх», што... Не, на гэтую тэму трэба весці асобную гаворку. Таму выкажу толькі свае, асабістыя адносіны да «спрэчнай» сімволікі.

У «НОВЫМ - СТАРЫМ» сцягу нічога асаблівага няма: звычайны кавалак белага палатна, які нагадвае абрус ці нават прасціну, а пасярэдзіне чырвоная паласа. Але вялікае — у простым. Не кожны сімвал здольны прыцягнуць да сябе, быццам магнітам, мноства людзей, аб'яднаць іх. А толькі той, у якім ва ўмоўнай форме адбіваецца душа народа, яго лёс. У беларусаў, аказваецца, ёсць свой сцяг, — ды яшчэ які!

Бел-чырвона-белы сцяг найлепшым чынам і надзіва дакладна адлюстроўвае асноўныя рысы беларускага нацыянальнага характару, доўгі і цяжкі шлях нашага народа, — яго мінулае, сённяшні дзень і нават будучыню. Колеры сцяга, іх злучэнне — нашы натуральныя гістарычныя колеры. Галоўны, белы, — у самой назве зямлі нашых продкаў: «Беларусь». Ён уваходзіць і ў імя народа: «беларусы». У гэты колер прырода «фарбуе» галовы нашых хлапчукоў і дзяўчынак. Край белых буслоў і бялюткіх рушнікоў здаўна вядомы тым, што ў ім жывуць неваяўнічыя і добразычлівыя, гасцінныя і даверлівыя людзі. Бел-чырвоныя колеры — асноўныя «фарбы» іх нацыянальнага адзення. Яны цярпліва нясуць свой жыццёвы крыж, умеюць добра працаваць і святкаваць свае старадаўнія святы. Нездарма ж іх сцяг — быццам пасвячоная «паска» ў бялюткай хустцы на Вялікдзень. Ці коласаўскі «сцяг калядны».

Чаму ж белы колер, — знак чысціні намераў, міру і спакою, — перасякае на сцягу суцэльная чырвоная паласа? На светлым фоне яна вызначаецца яшчэ больш выразна. І таму трывожыць сэрца. Яна сведчыць аб тым, што ўся гісторыя Беларусі — гэта бесперапынны трагічны ланцуг пакут, выпрабаванняў і страт. Гэтая паласа нагадвае «густы, чырвоны след крыўдзі». Яна — быццам адкрытая, глыбокая рана на целе краю і народа, якая ніколі не загойваецца. Бясконцыя бойкі на нашай зямлі паміж «вядучымі» дзяржавамі неслі сюды смерць і попел, голад і галечу. Яны дапаўняліся нацыянальным, рэлігійным і сацыяльным прыгнётам. Аб усім гэтым і гаворыць чырвоная паласа на белым полі беларускага сцяга, акропленая крывёю нашых дзядоў. Яна — след ад бізуна, які прабіў кашулю, насычаную белай соллю працоўнага поту.

І сучаснай Беларусі дасталося поўнай мерай. Рэспубліка прайшла праз пекла дзвюх сусветных войнаў. У імя «вялікай мэты» яе ператварылі ў паказальны палігон для ажыццяўлення гвалтоўных эксперыментаў над жывымі людзьмі і асяроддзем. Зруйнавалі гістарычную спадчыну і помнікі, загналі ў закут родную мову і культуру, — каб беларусы першымі сталі «савецкім народам». Узяліся падымаць іх дабрабыт пры дапамозе калектывізацыі, меліярацыі, хімізацыі, а потым і забойцы-радыяцыі. У выніку мы больш за ўсіх у Саюзе аказаліся заражонымі вірусам нацыянальнага бяспамяцтва. А таксама іншымі хваробамі, уласцівымі ладу, які робіць з чалавека робата. Беларусі тэрмінова патрэбна аператыўнае лячэнне. Аб гэтым і крычыць яе «шпітальны» сцяг, паласа якога часамі прымае выгляд чырвонага крыжа на белым полі. Ён — немы крык болю, крык-пратэст параненага народа супроць гвалтавання ягонай радзімы.

Таму не трэба здзекавацца з таго, што сваім спалучэннем колераў наш сцяг так нагадвае расфарбоўку машыны «хуткай дапамогі». У гэтым — страшэнны сэнс-прароцтва. Чарнобыльская катастрофа ператварыла Беларусь у зону экалагічнага бедства. Наш «каранцінны» сцяг, сцяг «грамадзянскай абароны» ёсць знак небяспекі, узнесены над радыяцыйным кардонам. Увага, ідуць выратавальныя работы! Ён — перасцярога ўсім аб выніках гульні з атамным агнём. Ён — ЗНАК БЯДЫ, які заклікае ўвесь свет аказваць рэспубліцы неадкладную, пастаянную дапамогу.

Нам прыйдзецца пакінуць у спадчыну гэты сцяг і сваім нашчадкам.

КАБ СКІНУЦЬ СТОМУ і забыцца, прыціскаючы да твару і вачэй халаднаватае палатно сцяга. У тым халадку — подых вякоў-навальніц, скрозь якія глядзяць на нас продкі: земляробы і асветнікі, майстры і вандроўнікі, ваяры і вучоныя, святары і паўстанцы. І зноў бярэ мяне ў палон натоўп «двухколерных» думак-разважанняў.

Спалучэнні белага колеру з чырвоным з'яўляюцца даўнімі знакамі-метамі ўсіх славян. Беларусы жывуць у цэнтры славянскага свету. Таму не дзіва, што і ў нашу галоўную сімволіку непазбежна вяртаецца роднае бел-чырвонае суквецце. Яно дапаможа кожнаму з нас адчуць сябе самабытнай часткай славянства, еўрапейскай і сусветнай супольнасці. І адначасова задумацца над пытаннем: калі мы пачалі сябе губляць? Што вымусіла нас здрадзіць самім сабе?

Звярніце ўвагу на наш сцяг. Калі ён вісіць ціхай часінаю, — ён нагадвае знак капітуляцыі. Але калі яго разгорне вецер, лепш становіцца відаць чырвоную паласу — знак мужнасці і непакорнасці. Прыйшоў час і нам паказаць свой гонар. Няхай наш сцяг заўсёды надзімае вецер!

Беларусы знаходзяцца на скрыжаванні еўрапейскіх дарог. Пара (з улікам урокаў гісторыі) атрымліваць ад гэтага не адны турботы, а добрую выгоду. З літоўцамі і палякамі ў нас былі ў свой час агульныя пуцявіны, аб чым сведчаць адзіны з Літвою герб «Пагоня» і, падобны польскаму, нацыянальны сцяг. Многае звязвае нас з Украінай, Латвіяй, Вялікай Руссю.

Але адносіны з усімі павінны быць у нас аднолькавыя і на роўных. Досыць Беларусі быць правінцыяй — то паўночнай, то паўднёвай, то ўсходняй, то заходняй — таго ці іншага «цэнтра». Мы самі — у ім. Галоўнае, не патураць нічым дамаганням, каб зноў не апынуцца ў ролі «малодшай сястры» чарговага заступніка. Не патрэбен рэспубліцы й статус штата Вірджынія, — каб даць прытулак аджываючым саюзным структурам улады. Хопіць нашаму сцягу й аднаго «шрама». Хай ён азначае (як дарожны знак «цэгла» навыварат), што «ўезд» да нас не забаронены нікому. Але — у якасці гасцей.

Беларусы ўмеюць не толькі добра працаваць, але й несці вайсковую службу. Спраўнасць і надзейнасць вайскоўцаў-«бульбашоў» агульнавядомы. Нездарма ж многія з іх служаць за межамі краіны, на ахове самой мяжы, ва ўнутраных войсках. Але ж ім больш за ўсіх і выпадае. Шмат нашых хлопцаў у імя «вышэйшых інтарэсаў» паклала свае галовы ў далёкім Афганістане. Працягваюць гінуць яны і сёння — пры ліквідацыі міжнацыянальных канфліктаў, ахове грамадскага парадку. Не след беларусам, выконваючы чыесьці загады, выступаць у няўдзячнай ролі ўціхамірнікаў ці нават карнікаў. Нацыя нясе вялікія чалавечыя і маральныя страты. Так можна й праглядзець, калі ў нас у саміх парадак пачне наводзіць нехта другі. І заадно ставіць новыя межы. Нашым юнакам ёсць што рабіць і дома — пад сваім, МІРНЫМ СЦЯГАМ. Аднаго толькі жылля для перасяленцаў з забруджаных раёнаў колькі трэба збудаваць.

НЯДАЎНА мы даведаліся і пра тое, што наш край літаральна нафаршыраваны не толькі войскамі, але й ракетнымі ўстаноўкамі, нацэленымі на Заходнюю Еўропу. І тут за намі першынство: Беларусь аказалася вялікай ваеннай дзяржавай!... Гэта робіць яе ахвярай маючага быць у адказ смяротнага ўдара. З улікам таго экалагічнага становішча, у якім апынулася рэспубліка, трэба цвёрда ставіць пытанне аб ператварэнні Беларусі ў дэмілітарызаваную бяз'ядзерную зону, зону міру. У гэтым нам дапаможа наш «пацыфісцкі» сцяг. Ён абароніць нас надзейней, чым сістэма проціракетнай абароны, якой, дарэчы, над рэспублікай няма. Пакуль жа — за рызыку — ёй належыць плаціць кампенсацыю. Можа, гэта і не «новае мысленне», затое яно проста нармальнае.

Бел-чырвона-белы сцяг дапаможа аб'яднаць беларусаў, якія жывуць на сваёй гістарычнай радзіме і па краіне, з нашымі суайчыннікамі, раскіданымі па ўсім свеце. Многія з нас да нядаўняй пары мала што чулі аб існаванні беларускай «дыяспары». Сёння з сорамам мусім адзначыць, што там, на чужыне, землякі-беларусы, нягледзячы ні на што, рабілі ці не больш за нас, каб зберагчы родную мову і звычаі. Патрэбен аб'ектыўны погляд на дзейнасць беларускай эміграцыі, каб аддаць ёй належнае. Яна гатова зараз дапамагчы, чым можа, сваёй пакутлівай бацькаўшчыне. Будзем ратаваць яе разам. Попел бацькоў стукае ў нашыя сэрцы.

Лад, які не дае чалавеку разгарнуцца, адбірае ў яго мову, спадчыну, веру, скарб, — павінен саступіць месца іншаму. Але ад гэтага не павінны пацярпець людзі, якія свядома ці несвядома служылі яму. Бел-чырвона-белы сцяг здольны адыграць тут ролю кансалідуючай сілы. Ён выступае як СІМВАЛ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПРЫМІРЭННЯ І ЗГОДЫ, сімвал згуртавання ўсіх сумленных людзей вакол гуманістычнай ідэі адраджэння беларускага грамадства, нашай дзяржаўнасці — на аснове новага эканамічнага і сацыяльнага парадку.

Наш «ПАРЛАМЕНЦЕРСКІ» сцяг не падзяляе людзей на «чырвоных» і «белых», а заве да яднання ўсіх, незалежна ад нацыянальнасці і сацыяльнага становішча. Ён забараняе весці барацьбу пры дапамозе прымусу і гвалту (таму мне больш падабаецца не слова «фронт», а «рух»). Ён дапамагае нам ачысціцца, пазбавіцца ад зданяў. А камусьці — і пакаяцца.

Галоўнае прызначэнне сцяга — спрыяць беларускаму нацыянальнаму, ЧАЛАВЕЧАМУ Адраджэнню. Ён прымушае нас азірнуцца назад, моцна задумацца над сённяшнім днём, дапамагае выбраць правільныя накірункі на будучае. Яго «мова», змест адпавядаюць тым простым і ясным мэтам, якія ставіць перад беларусамі жыццё, шляхам іх дасягнення. Наш «санітарны» сцяг заклікае да санацыі грамадства, дакладней, да яго рэанімацыі. Нам трэба вяртаць з таго свету сваю мілагучную мову, знявечаную, але гераічную гісторыю, аднаўляць маральныя і культурныя каштоўнасці, гаспадарскую кемлівасць. Неабходна вярнуць рэлігіі належнае ёй месца сярод людзей. Ажыве грамадства — «насельніцтва» ўсвядоміць сябе народам і згуртуецца — рэспубліка будзе мець падставу (і захоча) існаваць у якасці незалежнай. Толькі гэта дазволіць ёй умацавацца і выстаяць.

(Працяг на стар. 15).

Фота Я. КОКТЫША.

Упершыню ў «ЛіМе»

Ала ФІЯЛКОЎСКАЯ

Ала Фіялкоўская нарадзілася ў вёсцы Сапуцэвічы Стаўбцоўскага раёна. Працуе ў педінстытуце імя А. М. Горкага.
Сёння штотыднёвік друкуе яе першыя вершы.

●

Светлай памяці Фёдара Міхайлавіча ЯНКОЎСКАГА.

Калі пакіну свой парог,
Каб зведаць радасці дарог,
Увачавідкі каб убачыць
Стваральных рук і плён і значнасць,
Каб гулкай раніцай напіцца
З жыцця пульсуючай крыніцы,
Каб ад зацішнасці пакоя
Дазнаць трывог і неспакою,—
З сабой вазьму не розных рэчаў
Пакунак, часам недарэчны,
І не запасы лішняй стравы,
Не клопат колішні і справы.

Вазьму з дароў — найлепшы дар:
Ён мае смутак і цяжар —
Пра страты, гора, успаміны,
Пра край — агнішчы і руіны,
Пра сэрца мацярок знямелых,
Жанок, дачасна пасівелых.
Вазьму дзяцінства свет утульны,
Пяшчоту любае матулі,
Лугоў стракатае прыволле,
Лясоў шумлівае раздолле,
Рачулкі чыстай булькатанне
І свежасць вечара і рання,
Той дар, што радасцю напоўніць,
Што словам дзіўным загамоніць,
Рассыпле веерам рамонкі,
Засерабрыцца смехам звонкім.

Бо гэты дар любві святой
Быў для мяне — ратунак мой,
Калі падзей непаправімых
І гора хлынула лавіна.
Адна — найпершая з найпершых
У рої думак несуцешных
Сярод панурага маўчання
Знямелых дзён, сярод адчаю

Была хвіліна забыцця:
Струменьчык мудрага жыцця—
Найдаражэйшага у свеце,
Што чалавеку раз даецца.

Глыточкам быў выратавальным
Той дар любві невычарпальнай,
Той подых клопатаў жыццёвых,
Сустрэч і слоў — цікавых, новых,
І іх чароўнага святла,
І іх сардэчнага цяпла.

І зараз гэтых слоў гучанне —
Як мудрасць, як жыцця дазнанне,
Скарбонкі шчодрыя дары,
Невычарпальныя — бяры!
Яны прыгожасцю сваёй
Асветляць пахмурны настрой,
Зазіхацяць, як бліскавіцы,
Як кроплі звонкае крыніцы.

І ім заўсёды так іскрыцца,
Не абмялець і не стаміцца —
Не кане як у забыццё
Тварэц іх — мудрае жыццё.

Мой сябар, іх назваць дазволь,
А назва ім — «Радасць і боль».

●

Тым чацвёртым ці пятым быў мой бацька.

Іх пяцёра было — пасярод
азвярэлых пачвараў
На маленькім кавалачку
роднай збалелай зямлі.
І ратунку няма—толькі зграі
агідныя твары,
І звярыны аскал, і
шчуры-шынялі.

— Рус, здавайся! — крычаць.
І ўсё болей звужаецца кола.
І рашэнне адно—бо другога не
можа і быць!
Паглядзелі ў апошні і мо
развітальна наўкола
І ўсталі ў рост — ім бы жыць
бы ды жыць!

Сеяць хлеб і касіць, маладою,
кіпучаю сілай
Будаваць гарады, утаймоўваць
напружанне рэк,
І кахаць, і дарыць новым дням
мужных хлопцаў-асілкаў,
Паўтарэнне сваё, — для таго і
жыве чалавек.

І рвануліся ўперад — у тое
смяртэльнае пекла...
Да апошніх імгненняў сціскала
рука аўтамат,
І зусім не адчуў таго болю, як
куля падсекла,
Кожны з трох да пяці—чыйсьці
муж, чыйсьці брат.

...Многа вёсен шумела над
мірным, адроджаным краем.
Засталіся рубцы ад крывавых,
пакутлівых ран.
І прыходзіць сюды кожным
велічным, сонечным маем
Той чацвёрты ці пяты — вайны
ветэран.

І стаіць у маўчанні глыбокім,
схіліўшыся нізка
Перад памяццю тым, хто
застаўся на полі вайны...
Пунсавеюць-гараць ля
падножжаў братоў-абеліскаў
Гваздзікі адраджальнай,
шчаслівай вясны.

Раўнадушша

Раўнадушша — страшнейшае
ад бяды,
Калі могуць,
яшчэ маладыя,
гінуць сады,
Калі звонам крыніц
наталяе душу
успамін,
Калі вечнасцю горкай
становяцца колькі хвілін,
У якіх застаецца
на месцы
не зроблены крок,
Запазніўшыся быццам рвануцца
на крык
незнарок,
Можна выйсці насустрач бядзе
ці яе абысці —
Ў раўнадушнай душы
спачування ніяк не знайсці.

Раманс

Мы не сустрэнемся з табой —
Цяпер я гэта разумею:
Гудуць раз'юшана завеі
І над табой, і нада мной.
Мы не сустрэнемся з табой.

І не прызначым мы спаткання,
Дзе перасекліся тады
Надзеі, мары і гады.
На тым далёкім скрыжаванні
Мы не прызначым больш
спаткання.

І толькі ранняю вясной,
Як ажыве ўсё, на ўзлеску
Знайду блакітную пралеску —
З тых, што шукалі мы з табой
Той незабыўнаю вясной.

Каб хоць на міг, на міг адзіны
Зноў патануць у тых вачах,
Што так трывожаць па начах
Гарачым, яркім успамінам...
Хаця б на міг, на міг адзіны.

Мы не расстанемся з табой,
Хоць будзем вечна у расстанні,
І ўсё ярчэй гарэць світанні
Нам будуць мараю адной...
Мы не расстанемся з табой.

Як пісаў вядомы рускі гісторык В. Ключэўскі, гісторыя — не настаўніца, а наглядчыца, настаўляльніца жыцця: яна карае за няведанне ўрокаў. Так, жорстка, бязлітасна і назаўжды — карае. Для беларусаў Пані Гісторыя не будзе рабіць выключэння. А ў нас жа болей як дзе, кажучы словамі Купалы, «прадзедаў слава лазой зарастае...». І зарасла ўжо. Беларуса на ягонай зямлі змалку жывяць усім чужым: яму прапануюць чужых герояў, чужое бачанне мінулага, а ўрэшце — і думкі не свае. Цары, імператары, самазванцы, генералісімусы,— яны наступаюць адусюль: са старонак папулярнай і навуковай літаратуры, з тэле- і кінаэкранаў, з музейных экспазіцый. І вось ужо месца герояў народа займаюць яго далакопы. Здзек! Дык жа пратэсту не чутно. Прызвычаіліся.

Позірк у мінулае

Генадзь САГАНОВІЧ

«МНОЖЕСТВО НАРОДУ... ПОГУБИ...»

САПРАЎДЫ, што рабіць, прыкладам, калі ў Полацку на экскурсіі ізноў пачуеш: «Царь Иван Грозный в 1563 году освободил наш город...»? Абурацца, не згаджацца? Дык падрыхтаваны экскурсавод гэтым разам спашлецца на кніжкі па гісторыі — ад падручнікаў да акадэмічных выданняў, у якіх вучоныя цвердзяць менавіта пра **вызваленне**. Ці згадае нават аўтарытэтныя саюзныя выданні, скажам, «Советскую историческую энциклопедию», дзе чорным па беламу напісана, што 15 лютага 1563 г. адбылося «освобождение Полоцка русскими войсками от литовских феодалов», і давядзе, што не памыляецца. Потым госцю горада Рагвалода пахваляцца Валам Івана Грознага як сведчаннем тых падзей, тае вялікае вайны, што цар «вёў за выхад Русі да мора».

Як па нашых звычках, дык, можа, палачанам і святкаваць угодкі згаданага вызвалення трэба? А яно так, відаць, і будзе, калі нічога не мяняць.

Вось жа да чаго даводзіць бяспамяцтва!

Гляньма ж цяпер сваімі вачыма на тое, як і дзеля чаго хадзіў на Полацк маскоўскі цар Іван IV.

КАЛІ ЛІВОНІЯ адышла пад апеку Вялікага княства Літоўскага, Жыгімонт Аўгуст прапанаваў Івану Грознаму кампраміс: вывесці з Ліфляндыі адначасна і маскоўскія, і беларуска - літоўскія войскі. Цар адмовіўся, што азначала немінучую вайну. Увесь 1562 год прайшоў у перамовах ды дробных сутычках паміж нязначнымі вайсковымі сіламі Маскоўскай дзяржавы і ВКЛ, а ўжо 13 студзеня наступнага года Грозны павёў амаль усе свае войскі на Беларусь. Па звестках М. Стрыйкоўскага, з Вялікіх Лук праз Невель на Полацк рушыла 200 тысяч конніцы і 80 тысяч пяхотнікаў з 200 гарматамі. Сучасныя савецкія гісторыкі лічаць такую колькасць моцна завышанай ды падаюць 60 тысяч, але й гэта па тым часе шматлікая рацъ.

31 студзеня царскія полчышчы шчыльна абступілі буйнейшы горад Беларусі, ключ да сталіцы ВКЛ і да ўсяе Дзвіны. Пацягнуліся над Полацкім краем густыя клубы чорнага дыму, агнём заняліся вёскі, пачаўся нястрымны разбой. Чужынцы ахапілі адразу дзясяткі гарадоў і мястэчак Беларусі, яны спустошвалі Віцебск, Дуброўну, Воршу, Лукамль, Шклоў, а нават рабілі сваю справу далёка на поўдзень і захад ад Глыбокага.

Чым жа мог перашкодзіць гетман Мікалай Радзівіл, калі ўсяго войска ў яго было... 3400 жаўнераў? Заклікі вялікага князя да шляхты, каб тая паўстала на абарону краіны ад цара, не далі чаканага плёну. У прызначаны дзень шляхта не прыехала да гетмана. Валынская зямля не прыслала аніводнага чалавека.

Радзівіл ды Хадкевіч наблізіліся да Полацка, калі той адбіваў ужо не першы штурм. Яны стаялі наводдалі і не маглі затрымаць нават тыя 15 тысяч татараў, што цар паслаў у бок Вільні з мэтаю добра выведаць усе дарогі ад Полацка да сталіцы княства.

Тым часам Полацк бараніўся зусім невялікай сілай. Няроўны міжбой мог працягвацца яшчэ доўгі час (абаронцы нават рабілі вылазку ды спрабавалі адбіць гарматы), калі б не тактычныя памылкі полацкага ваяводы Станіслава Давойны. Ашчаджаючы харчовыя запасы, той загадаў выправіць з горада 2 тысячы сялян, што займаліся раней абарончымі работамі, а царскія ваяўнікі прымусілі іх паказаць ямы з харчам, прызначаным для полацкага гарнізона. Скарыстаў вораг і з таго, што ваявода, канцэнтруючы сілы толькі ў Ніжнім ды Верхнім замках, запаліў пасады: пад прыкрыццём густога дыму стральцы ўварваліся ў горад, затым сюды зацягнулі артылерыю. Цяпер гарматы зусім зблізку прыцэльна білі па абодвух полацкіх замках. Драўляныя ўмацаванні пачалі гарэць. У дадатак пад адну са сцен быў зроблены падкоп і там узарваны порах. Выбух моцна пашкодзіў фартэцыю: «выжгли огнем 300 сажен стены», — адзначыў тое летапісец. Абаронцы задыхаліся ад дыму, выбіваліся з сіл, а спадзяванняў на падмогу не засталося. І пасля шостага штурму ваявода Давойна вырашыў скарыстацца царскім абяцаннем усім даравацъ свабоду: 15 лютага ён капітуляваў. Хоць гэта і вырашыла лёс Полацка, полацкая шляхта і 500 чалавек «кароннага рыцарства» на чале з ротмістрам Вяжхлейскім адчайна адбіваліся яшчэ некалькі дзён.

Авалодаўшы горадам, пераможац не стрымаў царскага слова. На абяцаную волю ён адпусціў толькі 500 палякаў, даючы ім футры ды іншыя дарункі. Гэта быў адмысловы палітычны знак: маўляў, з Польшчаю Масква ваяваць не збіраецца. Астатніх — ваяводу Давойну з жонкай і дзецьмі, епіскапа Арсеня, шляхту, мяшчанства ды сялян, што хаваліся ў горадзе, павязаных і паўапранутых, па лютаўскім марозе, праз снежныя сумёты пагналі ў Маскоўскую дзяржаву. Гісторыкі называюць колькасць гэтых нявольнікаў— 11 160 чалавек, з якіх 7 253 — кабеты, дзяўчаты, дзеці. Па іншых звестках палонных было яшчэ болей. Так, А. Гвагніні паведамляў, што маскоўскі цар вывеў з Полацка 50 тысяч. На працягу пяці галодных дзён іх, па словах М. Стрыйкоўскага, «як іудзеяў да Вавілону», гналі да Масквы, дзе раздалі баярам і ваяводам. Сюды ж з Полацка была перавезена ўся казна, уласнасць шляхты, золата і срэбра, рэчы, што вабілі вока новых гаспадароў.

Мала хто са зняволеных палачанаў вярнуўся. Ваявода Давойна адпакутаваў у ланцугах 4 гады, пакуль у 1567 годзе яго не абмянялі на трох маскоўскіх ваявод. Жонка ж Давойны так і памерла ў палоне. Віленскага ваяводзіча Яна Глябовіча Іван Грозны ўсё спрабаваў скарыстаць у вайне супраць Вялікага княства, за што абяцаў аддаць яму Полацк, Інфлянты, нават... польскі трон. Глябовіч вярнуўся з няволі толькі ў 1569 годзе. Цяжкі лёс выпаў таксама на долю іншай беларускай шляхты — Корсакаў, Неміровічаў, Ешманаў і г. д. Што ж да паспалітага люду з «полацкага палону», дык аб тых і звестак не дашукацца.

Але яшчэ больш трагічным гэтае «вызваленне» было для тых, хто заставаўся ў Полацку. Як піша Пскоўскі летапіс, «которыя были в городе жили люди жидове, и князь великий велел их с семьями в воду в речную вметати, и утопили их». Усіх бернардынцаў, якія знаходзіліся ў Полацку, было загадана перарэзаць, а храм іх спаліць. Тое самае зрабілі з дамініканцамі ды іншымі «погаными».

З акупацыйным войскам у горад занеслася зараза. Мор касіў людзей Полаччыны ў 1563, 1565, 1566 і 1567 гадах. Край абязлюдзеў настолькі, што не хапала папоў, каб хаваць памерлых, і з Маскоўскай дзяржавы пачалі прысылаць сваіх бацюшак.

За больш чым 16 гадоў гаспадарання царскія ваяўнікі дазвання спустошылі паўночную Беларусь. Ужо на другі дзень пасля захопу Полацка дваранская конніца зайшла далёка на паўднёвы захад ваяводства. А перадавыя аддзелы наогул былі за 12 міль ад муроў непадрыхтаванай да адпору Вільні. Па начах берагі Дзвіны ажно да Дзісны фарбаваліся ў чырвань вогненных заранак. Полымя высвечвала спічастыя шапкі стральцоў ды халодны бляск іх доўгіх бердышоў. Гэтак нішчыліся ўсе воласці Падзвіння. Жыхароў калі не забіралі ў няволю, дык прыводзілі да прысягі на вернасць цару. А дыярыуш сучасніка тых падзей сведчыць, што Іван Грозны яшчэ і заганяў іх у войска ці скарыстоўваў для аблогі замкаў.

Нездарма А. Валовіч гэтак аплакваў Полаччыну, пісаў пра яе як пра «няшчасны полацкі край», дзе ад бяды нават «стары Рубон абудзіўся са сну ды ўвесь страпянуўся»...

Калі ў 1567 годзе акупацыйныя ўлады заўважылі ажыўленне патрыятызму мясцовага жыхарства, карныя фарміраванні пачалі ладзіць спецыяльныя экспедыцыі. Гэтыя не шкадавалі ні жанчын, ні дзяцей. Пасля іх заставаліся толькі чорныя папялішчы ды мерцвякі ў лужынах крыві.

А ў 1579 годзе пры набліжэнні войск Сцяпана Батуры да Полацка акупанты пайшлі на новыя злачынствы: у горадзе наладзілі забойствы жыхароў адно дзеля таго, каб знявечаныя трупы палачан прывязваць да бярвенняў ды спускаць па Дзвіве. Гэтак думалася застрашыць тых, што наступалі...

Да поўнага выгнання палкоў Івана Грознага з Беларусі Полацкі край абязлюдзеў і здзічэў. Каб выжыць, адсюль уцякалі апошнія сяляне. І калі прыйшлося адбудоўваць пабураныя замкі, людзей бралі ажно з Магілёўшчыны.

Вось яна, гісторыя полацкага «вызвалення».

МІНУЛАЕ застаецца аб'ектыўнай рэальнасцю, хоць і ў рэтраспектыве. А значыць, яна не залежыць ад палітычнай кан'юнктуры. Люстэрку часу нельга быць крывым.

Аднак у нас — нібы ў Царстве Крывых Люстэрак: тут адбываецца самае неверагоднае. Гэтак у 1987 годзе беларускія выдавецтвы «Ураджай» і «Мастацкая літаратура» перавыдалі раман-трылогію рускага пісьменніка В. І. Костылева «Иван Грозный» (у трох кніжках) накладам у 300 тысяч асобнікаў. Бестселер 1940-х стаў бестселерам канца 1980-х перабудовачных гадоў: яго імгненна раскупілі. Калі ў 1948 раман атрымаў Сталінскую прэмію за апалогію царскага дэспатызму, дык пасля грандыёзнага поспеху ў Беларусі на 1988 год яго ўключылі ў план да выпуску па абанементах на макулатуру накладам да 2—3 мільёнаў.

Рамай, што й казаць, цікавы. Ужо ў анатацыі чытаем: «Грозный изображается царем, все дела которого подчинены интересам народа». І пачынаецца салодкая рамантычная казка пра добрага чалавека і вялікага рускага патрыёта Івана Васільевіча. Вось ён «пожалел, простил и отменил казнь» растоўскаму князю, якога злыя баяры ўжо засудзілі на смерць. А вось першы маскоўскі цар абвяшчае, што «Ливонские земли — извечно русские...», ды пачынае Лівонскую вайну са словамі: «Не хочу терпеть обиду, учиненную мне и моему народу». У Прыбалтыцы, ваюючы з немцамі, царскія ваякі моцна сябравалі з тамтэйшым людам. «Любо было московским ратникам в деревнях слушать песни латышских девушек под нежную музыку струн куокле, напоминающих русские гусли». Добрыя і сардэчныя «московские ратники, словно к родне, толпами ходили к латышам в гости».

У другой кніжцы рамана ёсць і пра вайну з Вялікім княствам Літоўскім. Па Костылеву, гэты Жыгімонт Аўгуст «бесчестно липнет, как смола, к московским границам». Вось таму цар і пайшоў вайною. Толькі ў мэтах самаабароны, бяспекі Маскоўскага княства, гэтаксама як раней падбіваў Казанскае ды Астраханскае ханствы, башкіраў ды каго іншага: «чтобы не зорили наших городов, не уводили в полон наших людей...».

Прыгадваюцца падзеі ў Полацку. Фларэнцыец Джыявані Тэдальдзі, пераконваючы рымскага папу, што «московский царь вовсе не такой, каким его изображают польский король и паны», даводзіць: Грозны не тапіў у Полацку манахаў закону святога Францыска, «одинаково лгут и про то, будто он утопил евреев».

Часам нехта з герояў рамана кажа: «Люблю батюшку государя, как бы отца родного... Мудрый он». А сканчальная сцэна наогул кранае. На палубе фрагманскага карабля расійскага ваеннага флоту стаіць узнёслы Пётр І ды задуменна прамаўляе: «Достохвальныя памяти царь Иван Васильевич мудрый был государь...».

Вось, выходзіць, якім быў Іван Грозны. Не такім, як у нас на Беларусі. Ці, можа, у абліччы тырана ён увайшоў у гісторыю толькі суседніх народаў, а для Маскоўскай дзяржавы гэта быў «мудры государь», «отец родной»? Можа, сапраўды ўсё залежыць ад таго, з чыйго боку глядзець? Бо кожная падзея і з'ява бачылася ў Маскве гэтак, а ў Вільні —інакш. Напрыклад, для Полацка лютыя забойствы 1563 года былі страшным горам, а маскоўскі летапісец напісаў пра гэта як пра радасную падзею: «Божиим же неизреченным великим милосердием и государьскою теплою верою к Богу и его государьским умыслом в Полотцску в городе и в остроге ротмистров и королевских дворян и всяких воинских людей и черных из наряду много бесчисленно побили...».

КАЛІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ Іван Грозны — забойца і захопнік, паколькі хадзіў ён на Беларусь толькі дзеля гэтага, дык кім бачыў маскоўскага дзяржаўцу падначалены яму народ? Кім стаў для Расіі яе першы цар?

Хто пералічыць усе ягоныя злачынствы, хто апіша вакханалію садызму, хто вызначыць колькасць зарэзаных, задушаных, утопленых, закатаваных... Толькі ў Ноўгарадзе Вялікім узімку 1570 года царскія апрычнікі больш месяца забівалі людзей, па 500—1000 штодзённа! Бясконца доўжыліся кары невінаватых у сталіцы ды па іншых гарадах. Царскі гнеў быў непрадказальны. Прыкладам, баярын Рэпнін стаўся зарэзаным па загаду Грознага ў царкве, пад час малітвы толькі за тое, што колькі дзён таму адмовіўся ад удзелу ў непрыстойнай п'янай гульні з самадзержцам. А ліпеньскаю раніцай 1570 года на плошчу перад Крамлём «по указу великого государя» было выведзена адразу 300 чалавек. Тут ужо мелася «300 плах», а в них 300 топоров, и 300 палачей стояху у плах онех». Сам манарх з'явіўся «в черном платье и на черном кони с сотники и стрельцы и повеле палачем имати по человеку... по росписи именитых людей казнити»...

І мала хто з сучаснікаў адважваўся папракнуць цара ў гэтакім крывавым тэроры супраць уласнага народа, як у адчаі кінуў яму пскоўскі старац Мікола: «Харчуешся чалавечай плоццю ды крывёю, забываючы не толькі пра пост, але й пра Бога!» Праз якое пакаленне вырак свой прысуд і летапісец: «Множество народу от мала до велика при царстве своём погуби, и многие городы своя поплени...». Аднак гісторыя пісалася па сцэнарыі, падрыхтаваным у царскіх пакоях. Нястрымная апалогія дэфармавала і народную памяць: у рускім фальклоры Іван Грозны выступае то як «цар-Сабака», то як «справядлівы суддзя».

Вось жа дзяржава непадзельнага дэспатычнага адзінаўладдзя ды яе ідэалагічнае апраўданне і ёсць ці не найбольшай бядой, пакінутай яго цараваннем. Менавіта тады была закладзена сістэма задушвання кожнай апазіцыі, любой альтэрнатывы, усялякай праявы іншасці і самой чалавечай годнасці. Цар прымусіў князёў ды баяраў падпісвацца словам «халоп», — і слова гэтае зрабілася ці не самым ганаровым тытулам у Маскоўскай дзяржаве, а дваранства стала халопствам. Цар пачаў скрозь рассылаць сваіх адданых слугаў «слушать... всяких людей всяких речей и писати тайно», — і казаць вучыліся не тое, што думалі. Вось новая партыя бязвінных ахвяр тэрору стаіць на маскоўскай плошчы. Іван Грозны звяртаецца да натоўпу: «Народ! Увидишь муки и гибель. Но караю изменников. Ответствуй, прав ли суд мой?» І народ у адказ: «Да живет многие лета государь великий! Да погибнут изменники!» (М. Карамзін). Народ шануе свайго справядлівага цара, верыць яму, як «отцу родному». І ўжо ў аналы на вякі-вечныя заносіцца: «У нас государь царь благочестивый. Ереси никоторое не любит. И во всей его государьской земле ереси нет. У печати седят книги правят избранные люди и безпрестанно над тем делом следят. А над теми людьми надзирают по государеву указу...» (каб чытач не зблытаў часы, дадам, што гэта напісана ў XVII, а не ў XX ст.).

Для Еўропы маскоўскі цар быў дэспатам, роўных якому не існавала ні ў старажытным, ні ў новым свеце.

Еўропа ведала маскоўскага самадзержца не толькі па ягоных войнах, але й па адмысловай дыпламатыі. Англійскую каралеву Елізавету ён назваў «пошлой девицей», польскага караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста — «паче худейша худейших рабов суща», а шведскаму каралю кінуў не менш абразлівае: «ты мужичий род, а не государьской». Нічога дзіўнага, цар лічыў сябе непараўнальна вышэйшым ад усіх еўрапейскіх манархаў, бо толькі ён у дзяржаве «вольны добрых жаловати, а лихих казнити», а яму — «никто не может указу учинити». Без пагарды Іван Грозны паглядаў хіба што на турэцкага султана, на Еўропу ж раўняцца зусім не мерыўся.

ЦЯПЕР АДНОСІНЫ да Івана Грознага і ягоных спраў—праблема не толькі маральная. Стаўленне да яго — лакмусавая паперка, якая вызначае як грамадска-палітычныя пазіцыі асобы, так і сведчыць пра дух грамадства. Вельмі паказальна, што лепшая руская інтэлігенцыя XIX стагоддзя (у прыватнасці, гісторыкі М. Кармазін, Зм. Ілавайскі, В. Ключэўскі, С. Платонаў ды шмат хто іншы) лічыла сваім доўгам адмоўна ацэньваць гэтага каранаванага разбойніка. Сярод людзей, што крытыкавалі Івана IV, былі нават шчырыя манархісты. С. Салаўёў увогуле пісаў, што гісторык ніколі «не прамовіць словы апраўдання такому чалавеку».

Дзіўным чынам пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў савецкай гістарычнай літаратуры з'явіліся не толькі словы, — сапраўдныя оды «во славу царя Ивана Грозного». Першым за гэта ўзяўся гісторык Р. Віпер. У шматлікіх выданнях ягонай кнігі «Иван Грозный» (1922, 1942, 1944 гг.) манарх паказаны «повелителем народов и великим патриотом», «одним из величайших дипломатов истории всех времен». Аўтар адмятае любую крытыку цара, знаходзіць гістарычнае апраўданне апрычніне.

Спрычыніўся да ўсхвалення грознаўскага царавання і С. Бахрушын, які ў 1942 і 1945 гадах выдаваў манаграфію «Иван Грозный» (затым уключыў яе ў збор твораў) ды пісаў адпаведныя часткі падручнікаў па гісторыі. І ён быў перакананы, што дзейнасць гэтага цара сустрэла гарачую падтрымку рускага народа, што народ захаваў «яркую память о грозном царе Иване Васильевиче». Што ж да гісторыка І. Смірнова, дык той наогул даводзіў выключнасць ваяўнічага дзяржаўцы як «мужа чюднаго разсуждения» і героя, «деяния которого воспеваются в песнях»...

Застаецца прыгадаць словы І. Сталіна. Той гэтаксама бачыў свайго куміра Івана Грознага «великим и мудрым правителем, который ограждал страну от проникновения иностранного влияния и стремился объединить Россию». Кола, як кажуць, змыкаецца. Грозны — Пётр І—Сталін...

Было б нядобра змаўчаць пра тое, што супраць ідэалізацыі царавання Івана IV выступалі і выступаюць асобныя савецкія гісторыкі — С. Дуброўскі, В. Кобрын, ды хто-колечы іншы. Рэвізія пачалася ўжо па смерці «правадыра ўсіх народаў». Але хто чуе гэтых асобных...

Ці па інерцыі, ці гэта клопатам пэўных уплывовых колаў атрутная імперская міфалогія прадукуецца з неменшым напорам. Яскравы прыклад таму — вяртанне забытага рамана Костылева.

КАЛІ ВЕЦЕР СЦЯГ РАЗГОРНЕ...

(Пачатак на стар. 13).

...ТАК НЕ ХАПАЕ нам сёння, пад нашым невысокім пахмурным небам, якое ад чарнобыльскіх крылаў стала яшчэ ніжэйшым, святла і чысціні. Шолах квяцістых бел-чырвона-белых сцягоў не падыме небасхіл. Але яго жывыя «краскі» мацуюць веру ў тое, што народ адолее любую навалу. Мы ўжо даўно павыкідвалі абразы, затое ў нас паявіўся сцяг-«талісман». Да яго можна звярнуцца са словамі, адбітымі на крыжыку з распятым Ісусам, які калісьці давалі ў царкве кожнаму дзіцяці пры хрышчэнні:

«ВЫРАТУЙ І ЗАХАВАЙ»

У сцягу — наша надзея на будучыню. Хаця — ні ён сам, ні маленні на яго не зробяць цуд. Абудзіцца інтарэс грамадства да самога сябе, рушыцца яно на справе да новага жыцця — і «двухколер» зробіцца святыняй. Не здарыцца гэтага — сцяг застанецца звычайнай пярэстай анучкай і зноў кане ў забыццё.

Будзем спадзявацца, што гэты лёс мінуе беларусаў і іх сімвал-знаходку.

Як бачым, бел-чырвона-белы сцяг — найбольш удалы, надзейны, дзейсны нацыянальны сімвал. І сапраўды — **вобразны і лаканічны адбітак лёсу беларускага народа.** Гэта — наш сцяг, іменна такім ён і павінен быць, другога не трэба й выдумляць. Вышэйшая воля даруе яго знікаючай з зямлі нацыі, даючы ёй апошні шанц, каб захавацца.

Не здзіўлюся, калі скора «двухколер» атрымае паўсюднае прызнанне і будзе абвешчаны ў якасці дзяржаўнага. Гэта будзе азначаць, што Беларусь, следам за іншымі, пачынае жыць на новы лад.

...Такія вось думкі і пачуцці ахопліваюць мяне, калі бачу знаёмыя колеры. Так я разумею сэнс нашага сімвала, так адчуваю і «чытаю» яго сутнасць, яго «гаворку».

Красуй жа і ўздымайся над Рэспублікай усё вышэй, знак нашай надзеі — бел-чырвона-белы сцяг!

Лявон ПУСКІН,
супрацоўнік Рэспубліканскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў.

Цёркін Прыільменне

Ён нетаропка пераліствае аднатомнік выбраных твораў Аркадзя Куляшова, выдадзены Ленінградскім аддзяленнем выдавецтва «Советский писатель». На нейкі момант перапыняе размову, учытваецца ў той ці іншы радок, як бы нешта прыпамінаючы, а потым зноў працягвае свой расказ. Праўда, на гэты раз Уладзімір Васільевіч Цюрын некалькі адхіліўся ад тэмы, але ўсё роўна гэта датычыць нашага земляка-паэта.

— Добрая памяць пра народнага паэта зямлі беларускай да 70-годдзя з дня яго нараджэння, — кажа, паказваючы на кнігу, дацэнт кафедры літаратуры Ноўгарадскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута У. В. Цюрын. — Пастараўся крытык Варлен Бечык, які напісаў да гэтага найбольш поўнага выдання вершаў і паэм Аркадзя Аляксандравіча на рускай мове артыкул пра жыццёвы і творчы шлях паэта. «Цёркін Прыільменне» — так называлі ў суровыя ваенныя гады Аркадзя Куляшова. І невыпадкова...

У час вайны Аркадзь Куляшоў атрымлівае накіраванне ў ваенна-палітычнае вучылішча пад Ноўгарадам. Але праходзіць азбуку ваенных навук яму доўга не давялося. Немцы ўжо захапілі гарады Вострaў, Вялікія Лукі, Пскоў, дабраліся і да Ноўгарада. У гэтыя дні войскі 11-й арміі з цяжкімі баямі адыходзяць да Старой Русы. У маляўнічым месцы каля вёскі Меднікава размясціўся штаб рэдакцыі газеты «Знамя Советов», куды быў залічаны на пасаду пісьменніка (была такая) Аркадзь Куляшоў. Там і пазнаёміліся беларускі паэт і сённяшні выкладчык літаратуры з Ноўгарада.

Становішча патрабавала аператыўнасці, рознабаковасці жанраў. Хутка адбылася першая нарада супрацоўнікаў рэдакцыі газеты «Знамя Советов», на якой разглядалася пытанне пра франтавы гумар і сатыру на яе старонках. Пасля гарачага абмеркавання была прынята прапанова Аркадзя Куляшова. Так у газеце з'явіўся куток, у якім у вершаванай форме сталі асвятляцца справы аднаго воіна, бывалага і вопытнага. Была падтрымана назва кутка: «Рассказ о том, как бьет врагов на фронте Алексей Петров». Ужо ў пачатку верасня адбылася першая сустрэча-знаёмства воінаў 11-й арміі з Пятровым:

Познакомимся с Петровым —
Где родился он, как звать?
Алексей — душевным словом —
с детства звала его мать.

Становішча на фронце было тады вельмі цяжкае: 11-я армія апынулася ў акружэнні. Але ўсё-такі газета «Знамя Советов» трапляла на ўдарныя пазіцыі, водгукі пра Аляксея Пятрова, якія прывозілі з камандзіроўкі супрацоўнікі рэдакцыі, былі самыя прыхільныя, найлепшыя. Байцы ўбачылі ў літаратурным героі смельчака, майстра сваёй справы, прасілі рэдакцыю хутчэй паведамляць пра яго далейшыя прыгоды.

І вершаваныя расказы аб прыгодах своеасаблівага Васілія Цёркіна сталі з'яўляцца на старонках газеты праз два-чатыры дні. Запомніліся байцам вершаваныя расказы «Как Петров уничтожил диверсантов», «Случай на дороге», «Приманка против фашистского танка», «Групповой огонь», «На ловца и зверь бежит» і іншыя. Адным словам, Пятроў у 11-й арміі з'яўляўся эталонам, узорам паводзін воінаў на фронце; ён стаў папулярным, у рэальнасць яго існавання паверылі. Больш за год са старонак «Знамени Советов» біў ворага Аляксей Пятроў, палавіну вершаваных расказаў пра яго (а іх было некалькі дзесяткаў) стварыў А. Куляшоў, да астатніх прыклаў руку пісьменнік І. Чэкін.

— Так, Аляксей Пятроў заняў належнае месца ў шэрагу літаратурных герояў, пабрацімаў Васілія Цёркіна, — працягвае свой расказ дацэнт У. В. Цюрын. — Баявым гімнам 11-й арміі стала створаная беларускім паэтам «Песня нашего соединения». Кіраўнік армейскага ансамбля М. Смузікаў напісаў музыку. Песня гэта была вельмі папулярная сярод салдат.

Аркадзь Куляшоў шмат пісаў у гады Вялікай Айчыннай. Ноўгарадцы любяць яго паэзію, бо многія творы паэта нарадзіліся на старажытнай зямлі Прыільменя. Думаецца, вельмі дарэчы ўспомніць пра гэта ў слаўныя 45-ыя ўгодкі перамогі над фашысцкай Германіяй.

Сямён ЖАМОЙДА.
г. Ноўгарад.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Змітраку Бяспаламу з прычыны напаткаўшага яго гора—смерці БАЦЬКІ.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніку Міхноўскаму М. У. з прычыны напаткаўшага яго гора—смерці БАЦЬКІ.

«ПІШУ Я ПРА СЯБРОЎ...»

Даволі часта Аляксея Пысіна называюць паэтам-франтавіком. Па форме, знешне — яно праўда. А калі дакладней, па сутнасці, то ён — чалавек-франтавік, як паэт ён — гуманіст, лірыка ягоная антываенная.

А яшчэ крытыкі сцвярджаюць, што тэма вайны ў творчасці А. Пысіна — галоўная. Не спрачаюся з тым, што тэме вайны паэт удзяліў тую ўвагу, якой яна заслугоўвае. Але не галоўную. Галоўнымі тэмамі ягонай творчасці былі: чалавек-працаўнік, жанчына-маці, экалогія, каханне, Радзіма.

І ўсё ж вайна для гвардыі радавога чатырох франтоў А. В. Пысіна не скончылася ў 1945 годзе. Яна яго суправаджала ўсё жыццё. У аўтабіяграфічных радках ёсць і такія: «Падмаскоўныя бярозы і смаленскія дубы, беларускія сосны і балтыйскія клёны, ссечаныя снарадамі, прашытыя кулямі, і сёння стаяць уваччу. Заплюшчыш вочы, і бачыш пры ўспаміне зарывы палаючых вёсак, руіны гарадоў, забітых людзей. Па дарогах баявых паходаў, у шынялі і ў касцы прайшло маё юнацтва».

Але жахі вайны, свой боль паэт трымае пры сабе, маладому пакаленню ён не жадае паўтарэння свайго лёсу:

Бяру з сабой нялёгкія дарогі,
Сляды пакут, што не датлелі там,
Бяру з сабой бяссонныя трывогі,
А юны свет — я юным перадам.

На вайне А. Пысін вершаў не пісаў. «...На вайне, — успамінаў ён пазней, — у мяне была адна зброя: руская трохлінейная вінтоўка».

Але ж і пазней не пісаў пра вайну ажно пятнаццаць год! У першых зборніках вершаў А. Пысіна вайны яшчэ не было. І толькі ў трэцім — «Сонечная паводка» — мы чуем ваенныя матывы і асэнсоўваем горкую памяць паэта:

Ляглі сябры ва ўсім паходным,
Гарматы сціхлі. Цішыня.
Што сніцца ім пад небам родным
На досвітку ў пачатку дня?

А ў чацвёртым зборніку твораў «Мае мерыдыяны» (1965) і пятым — «Твае далоні» (1967) — тэма вайны загучала на ўсю моц. Чаму?

Ды таму, што над планетай навіс цень злавеснай атамнай бомбы, пад пагрозай апынулася ўсё жывое на Зямлі.

Пішу пра смерць, пра кроў,
Пішу я пра сяброў,
А іх жа, родных,
Хавалі не ў труне,
І запаветам мне:
«Пра нас раскажаш...»

А каб расказаць, трэба ўспомніць, яшчэ раз перажыць цяжкае мінулае, прапусціць боль праз сваё сэрца, асэнсаваць перажытае з вышыні дня сённяшняга і з позіркам у будучыню. Сам паэт гаварыў пра гэта так: «Мінулае нам належыць так, як і будучыня. Тое, што я не напісаў раней, мушу напісаць цяпер, у новым асэнсаванні і асвятленні».

Думаецца мне, што А. Пысін за пятнаццаць год здолеў набраць патрэбную вышыню, з якой аднолькава выразна бачна як мінулае, так і будучае.

Помніцца, у канцы сямідзесятых гадоў Аляксей Васільевіч запытаўся ў мяне:

— А ці можа з'явіцца на свет новы Гітлер?

Пытанне мяне застала знянацку. Таму я на хвіліну задумаўся, але адказаў адназначна:

— Можа!

Аляксей Васільевіч, як мне падалося, і чакаў менавіта такога адказу. Ён усміхнуўся, затым дастаў з кніжнай паліцы зборнік вершаў і з яўным задавальненнем прачытаў радкі:

Няма ключа такога хітрага,
Каб адамкнуў ён склеп зямны.
Баюся ўсё ж з'яўлення Гітлера,
Пакуль жыве душа вайны.

І дадаў: — Бачыш, 1967 год. А ніводзін з крытыкаў яшчэ не заўважыў верш.

Антываенная лірыка А. Пысіна бярэ пачатак з уласнага яго вопыту, падзей і фактаў яго біяграфіі. Вось чаму чытач верыць кожнаму слову паэта. Узяць хаця б радкі з верша «Кінаэпапея «Вялікай Айчыннай»:

На кіламетрах здымкаў франтавых
Я, можа, болей чым хто іншы бачу,
Душой я ў кожным з мёртвых і жывых...
Наступны заўтра фільм... Пайду паплачу.

У многіх вершах мы амаль дакументальна ўспрымаем прачытанае. Вось, да прыкладу, радкі з верша «Гвардзейскай дарогай»:

Дарога згубілася ў топкім бяздонні,
У асеннім карыце грязі.
Гарматы загразлі,
І топяцца коні,
Хоць сам у хамут — і вязі.
Загад батальёнам:
«Сюды на плячах
Прынесці з дзялянак дарогу!»
І неслі мы сосен ствалы
Па карчах,
Як зброю для перамогі.

А было гэта на Ленінградскім фронце, калі дывізія выходзіла з акружэння. Аляксей Васільевіч не адзін раз успамінаў пра тую дарогу. Пад колы гармат салдаты клалі свае шынялі, і з лесу на плячах насілі дровы, і грыбы елі сырыя, і спаць клаліся на сырую зямлю. А пад раніцу ўсіх засыпала снегам. Многа салдат тады засталося спаць вечным сном.

Асабліва выразна гучаць антываенныя матывы ў радках «Балады пра начлег». «Граната ў руках. Патрон у ствале. Чаго нам, сябры, яшчэ не стае! Стралковая рота сопку ўзяла... Пад намі зямля, над намі зямля».

— Як разумець апошні радок? — пытаюся ў Аляксея Васільевіча, хоць і ўсведамляў жудасны сэнс слоў, што скаланулі мяне.

— Так і разумей, магіла, — коратка адказаў ён.

І з болем у сэрцы нагадаў, што не вельмі лічыліся ў вайну з жыццём салдат. Выказваў пратэст супраць песні, у якой сцвярджалася, што «Нам нужна на всех одна победа, мы за ценой не постоим...».

Паэт Аляксей Пысін марыў пра свет без войнаў, верыў. у раззбраенне армій:

Хачу без каскі, без пагонаў
Хадзіць з сябрамі па зямлі.
І каб у чашах палігонаў
Жывыя кветкі расцвілі.

Антываенная лірыка А. Пысіна вельмі праўдзівая і гуманная. Даследчыкі творчасці А. Пысіна прыйшлі да высновы, што ён у паэзіі — як Быкаў у прозе.

Так яно і ёсць!

В. АРЦЕМ'ЕЎ,
ветэран працы.
г. Магілёў.

«ЗАСТАЛОСЯ — ТОЛЬКІ ЖЫЦЬ...»

Чым захапляе чытача паэзія Яўгеніі Янішчыц? Магутнай духоўнай энергіяй, нейкай празрыстасцю, смуткам, святлом. Невыпадкова Р. Барадулін у вершы «Яшчэ адно прызнанне Палессю» напісаў: «Зоры, як вершы Жэні Янішчыц, — з суму і са святла».

Любоўю да творчасці нашай зямлячкі было праслянута і першае раённае свята беларускай паэзіі, якое адбылося ў вёсках Велясніца і Рудка Пінскага раёна. Цудоўныя мясціны... Тут нарадзілася Жэня. «Пад сонцам найвышэйшай пробы» прайшло яе дзяцінства, пачаліся пошукі асабістага шляху ў паэзіі.

Шмат зацікаўленых сабралася каля фотавыставы Іллі Вакуліча «Зямля і людзі». Побач — саматканыя ручнікі, рознакаляровыя «вясёлкі», цудоўная вышыўка, вырабы з дрэва. Але самае галоўнае і самае цікавае на свяце — успаміны тых, хто добра ведаў Яўгенію Янішчыц, разам з ёю рос, вучыўся, працаваў.

Былі на свяце і члены СП БССР Казімір Камейша, Уладзімір Дзюба, прадстаўнікі мясцовага літаб'яднання «Арбіта» Алесь Бібіцкі, Валерый Грышкавец, Зіновій Вагер, Леанід Крывіцкі. Гучалі вершы самой паэтэсы, а танцама радкі, прысвечаныя ёй.

З успамінамі выступілі родны брат паэткі Міхаіл Янішчыц, настаўнік А. Грэчка, сяброўка Р. Ганчарык. Людзі мелі магчымасць набыць цікавыя кніжкі, прыняць удзел у літаратурнай віктарыне. Дарэчы, пераможцай яе стала С. Ліпчук.

У паэтэсы ёсць такія радкі: «Апынуся калі сярод чорных варон, — я памру, ды не буду па-іхняму каркаць...» Вельмі цяжка жыць з такім сэрцам сярод мітусні, адчужанасці і недаверу, зайздрасці і абыякавасці, жорсткасці і хамства. Яўгенія Янішчыц сама лічыла сябе непрыручанаю птушкай.

Такі ўжо, напэўна, лёс таленту — выплеснуцца ў адзіным парыве натхнення і адысці без пары, пакінуўшы нашчадкам сваю ўсхваляваную споведзь.

Дзякуй, «палеская ластаўка», за шчырыя вершы. Аднавяскоўцы цябе не забудуць — сведчанне таму Свята паэзіі, якое стане традыцыйным і будзе збіраць на беразе Ясельды кожны год у першую ліпеньскую нядзелю ўсё больш аматараў творчасці дзяўчыны з Палесся.

Таццяна КАЗАК,
студэнтка факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна.

НА БАЛАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

З 23 ПА 29 ЛІПЕНЯ

24 ліпеня. Пасля заканчэння трансляцыі сесіі Вярхоўнага Савета БССР

1374 КІЛАМЕТРЫ — ДЫСТАНЦЫЯ. ФРАНКФУРТ—МІНСК.

Сумесная праграма БТ і тэлебачання зямлі Гесен (ФРГ).

Тэма праграмы — наша агульная трагічная гісторыя: Вялікая Айчынная вайна і наступствы чарнобыльскай катастрофы.

26 ліпеня. 18.00

«МОЯ ДОМ У БЯДЗЕ...»

Прэм'ера дакументальнага кінанарыса БТ.

Стужка расказвае аб мёртвай зоне ў некалі квітнеючых вёсках Нябытаў і Бабчын Хойніцкага раёна.

Аўтар сцэнарыя А. Шлег, рэжысёр А. Сухоцкі, аператар Л. Слобін, гукарэжысёр Т. Сабярайская.

28 ліпеня. 16.30

ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Тэлечасопіс.

Адбудзецца сустрэча з беларускім паэтам са Злучаных Штатаў Амерыкі М. Сяднёвым.

Гледачы танцама сустрэнуцца з маладымі літаратарамі В. Шніпам, Л. Рублеўскай і Л. Дранько-Майсюком.

28 ліпеня. 19.20

СЯМЕЙНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

Гармонія сямейных адносін.

Прымае ўдзел астролаг Тамара Глоба.

29 ліпеня. 11.50

Ю. СЕМЯНЯКА. «ПАЎЛІНКА»

Спектакль Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР.

Рэжысёр-пастаноўшчык С. Штэйн.

У галоўнай ролі—Н. Гайда.

29 ліпеня. 14.25

«БЕЛАРУСЬ, МАЯ ШЫПШЫНА»

Да 90-годдзя У. Дубоўкі.

29 ліпеня. 15.15

ПРЭМ'ЕРА ПЕСНІ

Л. Смялкоўскі, Я. Янішчыц. «Дазвольце мне помніць пра Вас».

Спявае Г. Радзько.

29 ліпеня. 16.30

ПАННА БЕЛАЯ РУСЬ

Фінал І Рэспубліканскага конкурсу прыгажунь.

29 ліпеня. 18.05

ГРАМАДСКАЯ ДУМКА

Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў беларускай архітэктуры.

Бяруць удзел заслужаныя архітэктары БССР А. Воінаў і В. Багласаў.

Аўтар і вядучая праграмы — Л. Бандарэнка.

29 ліпеня. 19.20

А. КРУМЕР, М. МІХАЙЛАЎ. «НОНСЕНС»

Прэм'ера спектакля БТ.

Рэжысёр-пастаноўшчык—У. Забела.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 06337 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА, Уладзімір ЯГОЎДЗІК — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы: Вячаслаў ЛАПЦІК — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62.

Намеснік галоўнага рэдактара Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.